—Людзьмі звацца!
Янка Купала

ЛіМ

ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ПЯТНІЦА
1
СТУДЗЕНЯ
1993 г.
№ 1 (3671)

ВЫХОДЗІЦЬ
з 1932 г.

КОШТ—
па дамоўленасці

З НОВЫМ ГОДАМ!

Шаноўныя чытачы!

Па звычцы апошніх гадоў, якая паспела ўжо стаць модай — пазначаць год жывёльна-птушыным сімвалам, мы таксама не ўтрымаліся і пасадзілі на вокладку штотыднёвіка гэтага стылізаванага пеўніка—сімвал сёлетняга, 1993 года (выцінанка В. Дубінкі). Мо гэта і не надта сур'ёзна, аднак жа... Кажуць, што каб год быў шчаслівы, шэры пеўнік абавязвае чалавека працаваць дысцыплінавана і сістэматычна. А ці ж гэта найперш і вымагаецца ад усіх нас у нашай маладой дзяржаве!! Вось і выходзіць, што пеўнік на сённяшняй лімаўскай вокладцы—зусім не лішні.

Пеўнікам пазначаем мы і вашы калядныя шчыраванні ў нумары. Дзякуй вам, дарагія, што вы гэтак дружна адгукнуліся на наша запрашэнне выказацца пра жыццё, падзяліцца сваімі думкамі пра дзень заўтрашні. Адны з вас адказалі на нашу анкетку па пунктах—спачтку на першае пытанне, «каляднае» (як вы сёлета будзеце святкаваць Новы год, якое свята вам асабіста даражэй: Новы год ці Каляды, ці ўмееце вы калядаваць!), а пасля на другое, «жыццёвае» (што вы думаеце пра свой уласны лёс і лёс рэспублікі, як спадзеяцеся зладзіць яго!); іншыя ж проста згадалі радасці, здабыткі і засмучэнні года ўжо мінулага і падзяліліся спадзяваннямі на год надышоўшы.

Яшчэ раз віншуем усіх, хто трымае гэты нумар «ЛіМа», з Новым годам, зычым вам плёну і поспехаў у працы, здароўя, настойлівасці і рашучасці ў Адраджэнні Беларусі на Беларусі.

Кола Дзён-92

Дзесяць гадоў назад, 30 снежня, гадавіна ўтварэння Саюза ССР, бадай, у апошні раз святкавалася з усім дзяржаўным размахам: з урачыстымі сходамі, з прамовамі аб непарушнай дружбе савецкіх народаў, аб росквіце нацыянальных культур, аб інтэрнацыяналізме (ілюстрацыяй мусіла служыць «братэрская дапамога» Афганістану).

Вельмі многае змянілася за дзесяць гадоў. Але ёсць нямала людзей, якія не тое, каб не заўважылі гэтых змен, але хочуць пераканаць сябе і ўсіх іншых, што народы проста-такі прагнуць вяртання да вялікай імперыі, пад крыло «старэйшага брата». Днямі на экранах тэлевізараў можна было ўбачыць прэзідыум так званага надзвычайнага з'езда народных дэпутатаў СССР. Што гэта — грымасы сучаснай гісторыі?

Дае падставу задумацца і яшчэ адна дата — 60-годдзе савецкага пашпарту і ўвядзення прапіскі. Няма ўжо СССР, але мы, грамадзяне незалежнай Рэспублікі Беларусь, усё яшчэ мусім карыстацца «сярпастым і малаткастым», а штамп аб прапісцы, прыдуманай некалі Сталіным, успрымаем як належнае. Не проста даецца нам развітанне з мінулым — рабскай псіхалогіяй, інерцыяй коснасці.

І ўсё-такі, на парозе новага года, мы спадзяёмся і верым...

2 СТУДЗЕНЯ Год пачаўся з вызвалення цэн. Меркавалася, што іх «лібералізацыя» будзе першым крокам на шляху да рынкавай эканомікі. На жаль, з-за манаполіі дзяржаўных структур, наменклатурнай «прыхватызацыі», гіперінфляцыі і татальнай карупцыі эканамічная рэформа на Беларусі (як і ў іншых краінах СНД) загразла ў шматлікіх цяжкасцях.

14 ЛЮТАГА На сустрэчы кіраўнікоў СНД у Мінску падпісаны Дэкларацыя аб прынцыпах супрацоўніцтва, Заява аб недапушчэнні ўжывання сілы, Пагадненне аб рэгуляванні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і яшчэ каля 20 дакументаў. Аднак большасць з іх засталіся на паперы.

14 САКАВІКА У рэспубліцы заснаваны Антыкрызісны камітэт, з ініцыятывай стварэння якога выступіла Беларускае згуртаванне вайскоўцаў. У камітэт увайшлі прадстаўнікі дзяржаўных структур, грамадскіх арганізацый і партый.

13 КРАСАВІКА Ініцыятыўная група БНФ па правядзенні рэферэндуму аб будучым Вярхоўнага Савета Беларусі прадставіла ў Цэнтральную выбарчую камісію больш як 446 тысяч подпісаў, сабраных у падтрымку гэтай прапановы. Праз некаторы час ЦВК прыняла станоўчае рашэнне.

19 МАЯ У сталіцу Беларусі прыбыла афіцыйная дэлегацыя Савета Еўропы. (Камітэт па сувязях з краінамі СНД).

14 ЧЭРВЕНЯ У Рыа-дэ-Жанейра завяршылася міжнародная канферэнцыя ААН па пытаннях экалогіі планеты. Даклад, прысвечаны наступствам Чарнобыля, з якім выступіў Старшыня ВС Беларусі С. Шушкевіч, выклікаў ва ўдзельнікаў канферэнцыі сапраўдны шок.

10 ЛІПЕНЯ Беларусь афіцыйна ўступіла ў Міжнародны валютны фонд і Сусветны банк.

13 ЖНІЎНЯ З некаторым спазненнем Саўмін Беларусі прыняў пастанову «Аб надзвычайнай пажарнай абстаноўцы на тэрыторыі рэспублікі...» З-за засухі агнём былі ахоплены тысячы гектараў лясоў і тарфянікаў. Пажары прынеслі шматмільённыя страты.

8 ВЕРАСНЯ У Мінску на пляцы Незалежнасці адбылося свята беларускай вайсковай славы, прысвечанай угодкам Аршанскай бітвы 1514 года. Удзельнікі ўрачыстасці прынялі сімвалічную прысягу на вернасць Рэспубліцы Беларусь.

1 КАСТРЫЧНІКА Распараджэннем Мінфіна рэспублікі і Нацыянальнага Банка РБ у сумежных з Літвой і Украінай раёнах зняты з абароту савецкі рубель. Усе плацяжы тут пачалі ажыццяўляцца ў разліковых білетах. Білеты, ці «зайчыкі», зразумела, не маглі і не могуць замяніць нацыянальную валюту. А з «рублёвай зоны» Беларусь таксама яшчэ не выйшла.

14 ЛІСТАПАДА Адбылася канферэнцыя Ініцыятыўнай групы рэферэндуму і Сойма БНФ. На ёй абмяркоўвалася сітуацыя, якая склалася ў сувязі з пастановай Вярхоўнага Савета ад 29 кастрычніка. Адзначалася, што гэтай пастановай парламент фактычна адмовіў выбаршчыкам у законным праве на рэферэндум.

31 СНЕЖНЯ Вайскоўцы — грамадзяне Рэспублікі Беларусь прынялі прысягу на вернасць свайму народу.

Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

АБ ПРЫСУДЖЭННІ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 1992 ГОДА Ў ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ, МАСТАЦТВА І АРХІТЭКТУРЫ

Разгледзеўшы прапановы Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры, Прэзідыум Вярхоўнага Савета і Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь пастанаўляюць:

1. Улічваючы, што значна павялічылася колькасць твораў, прадстаўленых на атрыманне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, якія адрозніваюцца высокімі мастацкімі і навукова-даследчымі якасцямі, лічыць мэтазгодным прысудзіць, у парадку выключэння, 12 прэмій замест 11.

2. Прысудзіць Дзяржаўныя прэміі Рэспублікі Беларусь за 1992 год:

У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ

імя Янкі Купалы

Законнікаву Сяргею Іванавічу — за кнігу паэзіі «Заклінанне»;

Звонаку Алесю (Звонаку Пятру Барысавічу) — за кнігу паэзіі «Святлацені»;

імя Якуба Коласа

Грахоўскаму Сяргею Іванавічу — за кнігу «Споведзь»;

Жуку Аляксандру Аляксандравічу — за кнігу «Праклятая любоў»;

Сёмуху Васілю Сяргеевічу — за пераклад з нямецкай мовы на беларускую рамана Томаса Мана «Доктар Фаўстус»;

імя Кастуся Каліноўскага

Ермаловічу Мікалаю Іванавічу — за гістарычна-публіцыстычную кнігу «Старажытная Беларусь. Полацкі і новагародскі перыяды».

за творы літаратуры і мастацтва для дзяцей і юнацтва

Пархуту Яраславу Сільвестравічу— за кнігу «Зямля бацькоў нашых».

У ГАЛІНЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ

Уліцёнку Аляксандру Леанідавічу — за кнігу публіцыстыкі «Іншадумцы». («Мыслящие иначе»).

У ГАЛІНЕ МУЗЫКІ І КАНЦЭРТНА-ВЫКАНАЛЬНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Гарэлавай Галіне Канстанцінаўне, кампазітару,— за кантату «У год сусветнага пажару».

У ГАЛІНЕ ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА

Кін-Камінскаму Уладзіміру Тадэвушавічу, **Кур'яну** Уладзіміру Мітрафанавічу, **Манаеву** Віктару Сяргеевічу, **Пініг'ну** Мікалаю Мікалаевічу — за г[illegible]таноўку ў Беларускім дз[illegible]жаўным акадэмічным тэ[illegible] імя Янкі Купалы спект[illegible] «Тутэйшыя» па п'есе Янкі К[illegible]палы.

У ГАЛІНЕ АРХІТЭКТУРЫ І ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

Агуновічу Эдуарду Канстанцінавічу, мастаку,— за архітэктурна-мастацкае вырашэнне экспазіцый Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску і Музея партызанскай славы ў г. п. Ушачы Віцебскай вобласці.

Селешчуку Мікалаю Міхайлавічу, мастаку,— за серыю графічных аркушаў «Святы» («Каляды», «Гуканне вясны», «Вербніца»), за цыкл карцін «Мая Беларусь», за ілюстрацыі да кніг «Сымон-музыка» Якуба Коласа і «Сказки белорусских писателей».

3. Устанавіць у 1992 годзе Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры ў памеры 50 мінімальных заработных плат.

С. ШУШКЕВІЧ,
Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

28 снежня 1992 г.
г. Мінск.

В. КЕБІЧ,
Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Важкі ўклад у мастацкую скарбніцу Беларусі

Пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь прысуджаны Дзяржаўныя прэміі 1992 года ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Сёлетняе прысуджэнне гэтых самых аўтарытэтных у Беларусі прэмій мае сваю адметнасць: яна ў тым, што ўпершыню за выдатныя дасягненні ў галіне мастацкай творчасці прысуджаны прэміі незалежнай дзяржавы Рэспублікі Беларусь. Гэта папершае; па-другое, Камітэт па Дзяржаўных прэміях працаваў у новым складзе і паводле абноўленых палажэнняў.

Ёсць усе падставы лічыць, што адзначаныя гэты раз прэміяй творы праўдзіва адлюстроўваюць высокі ўзровень творчага духу, таленавітасці і мастакоўскай самапатрабавальнасці іх аўтараў.

У галіне паэзіі Дзяржаўнай прэміяй імя Янкі Купалы адзначаны кніга Сяргея Законнікава «Заклінанне» і кніга Алеся Звонака «Святлацені». Сяргей Законнікаў сёння ў самым росквіце творчых сіл. Аматарам паэзіі ён даўно вядомы сваёй глыбокапатрыятычнай лірыкай, вельмі чуйнай да пульсу часу. У кнізе «Заклінанне» асабліва вымоўна «прамаўляе» аголены нерв публіцыстычнасці, у ёй шмат болю і горычы, пяшчоты, чалавечага даверу, дабрыні, — той, я сказаў бы, беларускасці характару, што робіць яе лірычнага героя асабліва прывабным. Дадамо да гэтага свежасць і выразнасць паэтычнай мовы, багацце яе інтанацый, майстэрскае абыходжанне са словам. Старэйшына беларускай паэзіі Алесь Звонак працуе ў літаратуры без мала семдзесят гадоў. Праўда, дваццаць з іх былі жорстка вырваны з жыцця паэта: яму давялося ні за што, без віны зведаць жудкую сібірскую катаргу і ссылку. У яго новай кнізе нямала вершаў і пра гэта. Дасканалы майстар класічнай формы, паэт гаворыць пра перажытае і набалелае з пачуццём высокай чалавечай годнасці, без надрыву і экзальтацыі, па-філасофску спакойна і мудра, з верай у добры, светлы пачатак людскога жыцця на зямлі.

Лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа сталі Сяргей Грахоўскі, Алесь Жук і Васіль Сёмуха. Сяргея Грахоўскага чытачы ведаюць і як шчырага, пранікнёнага лірыка, і як аўтара шматлікіх кніг цікавай, так бы мовіць, непрыдуманай прозы. Як і А. Звонак, С. Грахоўскі — былы вязень сталінскіх канцлагераў. Яго кніга «Споведзь» — праўдзівы расказ пра жахі ГУЛАГа, перасыпаны балючымі, горкімі радкамі вершаў. Гэта новы важкі крок паэта і пісьменніка ў шматгадовай напружанай працы над адной з самых трагічных тэм беларускай літаратуры. Кніга Алеся Жука «Праклятая любоў» — яскравае сведчанне высокай творчай сталасці вядомага празаіка, майстра псіхалагічна-праўдзівага, рэалістычнага — без даважкаў публіцыстыкі і лірычнай рыторыкі — пісьма, добрага знаўцы народнага жыцця і побыту, чалавечых лёсаў і характараў, што раскрываюцца не толькі ў дзеяннях і ўчынках, але і ў вобразнай і сакавітай «слуцкай» мове. Прызнаны майстар мастацкага перакладу Васіль Сёмуха адзначаны прэміяй за адну з найбольш перакананаўчых удач свайго нялёгкага рамяства — за пераклад знакамітага філасофскага рамана Томаса Мана «Доктар Фаўстус». Да гэтага ён падарыў беларускім чытачам «Фаўста» Гётэ і творы многіх еўрапейскіх паэтаў. У новай працы Сёмуха засведчыў не толькі асабістыя творчыя магчымасці, але і магчымасці нашай мовы, што вельмі важна для развіцця мастацкага перакладу ў Беларусі.

Лаўрэатам прэміі імя Кастуся Каліноўскага стаў вядомы гісторык і публіцыст Мікола Ермаловіч — за кнігу «Старажытная Беларусь. Полацкі і Наваградскі перыяды». Імя гэтага даследчыка гісторыі Беларусі — не ахопленага ніякім творчым калектывам адзіночкі — сёння адно з самых аўтарытэтных сярод навукоўцаў, з ім звязаны паварот нашай гістарычнай навукі да аб'ектыўнага асвятлення лёсу беларускага народа. Напісаная з добрым палемічным запалам, жывой эмацыянальнай мовай, кніга М. Ермаловіча прынята чытачамі з удзячнасцю і радасцю як доўгачаканы падарунак, якім яна для іх і з'яўляецца.

З вылучаных на Дзяржаўную прэмію твораў для дзяцей і юнацтва гонар дастаўся кнізе пісьменніка Яраслава Пархуты «Зямля бацькоў нашых» — з падзагалоўкам «Падарожжа па родным краі». Гэта цікавая, змястоўная і вельмі патрэбная для патрыятычнага выхавання дзяцей кніга сапраўды ёсць вынік незлічоных і нястомных вандровак аўтара па Беларусі. Зайздросная энергія падарожніка, спалучыўшыся з назіральным «вокам» і тонкім адчуваннем хараства прыроды, чалавека і роднага слова, дала шчаслівы плён.

У галіне журналістыкі Дзяржаўная прэмія прысуджана Аляксандру Уліцёнку за кнігу публіцыстыкі «Іншадумцы» («Мыслящие иначе»). Гэта зборнік яго размоў з добра вядомымі, малавядомымі і амаль невядомымі людзьмі па розных актуальных пытаннях сучаснага грамадска-палітычнага жыцця. У адлюстраванні рознасці поглядаў і думак суразмоўнікаў журналіста, сярод якіх пісьменнікі, навукоўцы, грамадскія дзеячы, палітыкі, — несумненная вартасць кнігі, прафесіянальна задуманай і арганізаванай.

Кампазітару Галіне Гарэлавай Дзяржаўная прэмія прысуджана за кантату «У год сусветнага пажару», напісаную на вершы рускіх і еўрапейскіх паэтаў. Твор гэты — адметная з'ява ў сучаснай беларускай вакальна-інструментальнай музыцы. Спалучэнне трагедыйнага гучання са светлым лірызмам, свежасць музычнай мовы, высокі прафесіяналізм надоўга, трэба думаць, забяспечаць таленавітаму твору поспех.

У галіне тэатральнага мастацтва Дзяржаўнай прэміяй адзначаны спектакль «Тутэйшыя» ў пастаноўцы БДАТ імя Янкі Купалы. Лаўрэатамі сталі рэжысёр-пастаноўшчык Мікалай Пініг'ін, кампазітар Уладзімір Кур'ян, выканаўцы галоўных роляў артысты Уладзімір Кін-Камінскі і Віктар Манаеў. Сучаснае, арыгінальнае сцэнічнае прачытанне знакамітай камедыі Янкі Купалы — несумненны поспех таленавітага творчага калектыву, пацвярджэнне вернасці лепшым традыцыям нацыянальнага акадэмічнага тэатра і падмацаванне надзей, якія на яго ўскладаюць аматары беларускага тэатральнага мастацтва.

Творчасць мастака Эдуарда Агуновіча даўно заваявала прызнанне ў шырокіх колах грамадскасці, і невыпадкова, што яго працы апошніх гадоў — архітэктурна-мастацкае вырашэнне экспазіцыі літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску і музея Партызанскай славы ў Ушачах адзначаны Дзяржаўнай прэміяй. Таленавітая і не будзе перабольшаннем сказаць — самаахвярная работа мастака заслугоўвае гэтай высокай ацэнкі. Прэміяй у галіне мастацтва адзначаны таксама творы Міколы Селешчука — серыя графічных артыкулаў «Святы», цыкл жывапісных палотнаў «Мая Беларусь», ілюстрацыі да кніг «Сымон-музыка» Якуба Коласа і «Сказки белорусских писателей». Творчасць гэтага жывапісца і графіка, вядомая не толькі ў Беларусі, а і далёка ў свеце, вылучаецца яркай самабытнасцю, своеасаблівым — на мяжы фантастычна-казачнага і рэалістычнага — бачаннем свету.

Адзначаныя Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь творы — важкі ўклад у скарбніцу беларускай літаратуры і мастацтва. Прыемна ўсведамляць, што і ў далёка не лепшых сацыяльна-эканамічных і палітычных умовах музы не маўчаць, самааддана працуюць для ўзвелічэння і славы Бацькаўшчыны.

Павіншуем жа новых лаўрэатаў з высокай ацэнкай іх творчых дасягненняў і пажадаем ім натхнення і багатага плёну ў далейшай працы.

Ніл ГІЛЕВІЧ,
старшыня Камітэта па Дзяржаўных прэміях РБ у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

З ПОШТЫ ТЫДНЯ

Нумар не пройдзе

Мне, настаўніку-беларусу, вельмі прыкра было чытаць ліст віцебскіх педагогаў у газету «Правда». Паслухайце толькі, што пішуць людзі радзімы Міхася Лынькова і Васіля Быкава: «Мы, белорусы, исконно имперский народ, лишились Родины — Великой России». Ці яшчэ такое: «Я — белорус, но белорусского не люблю». Напрошваецца само па сабе: едзь, жыві і працуй на карысць Расіі, Ельцына, а не збівай з панталыку нашчадкаў Скарыны, Купалы, Коласа, Багдановіча.

Лічу адкрыты ліст у «Правду» віцебскіх «педагогаў» правакацыйным і зневажальным для нашага сумленнага і самаадданага народа. Патрыётам Беларусі ніколі не зрушыць з месца (як таго патрабуе ісціна) беларускую справу, калі ім будуць перашкаджаць на кожным кроку тутэйшыя манкурты, збіраючыся гайнёю.

Неяк не па сабе становіцца, што «эрудыты» з Віцебшчыны ні словам не абмовіліся аб нацыянальным адраджэнні беларускага народа. Яны не прызнаюць, не прымаюць духоўна вялікую спадчыну Ластоўскага, Ігнатоўскага, Карскага. Што ім, манкуртам, да памяці і болю народнага, да гісторыі і паэзіі, да культуры і звычаяў нашай нацыі?! Ім галоўнае — «имперскость».

У свой час (у 1950 гадах) прыезджыя людзі з Якуціі, Узбекістана, Марыйскай АССР натварылі бед у беларускамоўнай школе-інтэрнаце г. п. Глуска, дзе дзеці цудоўна размаўлялі на мове сваіх бацькоў. Пастаянная бегатня «шукальнікаў шчасця» па райкамах і абкамах прывяла да пераводу беларускамоўнай школы на рускую мову.

Ці не таго ж хочуць віцебскія карэспандэнты «Правды», якія так неабдумана плююць у свой калодзеж?

Думаецца, што нумар іх не пройдзе!

Васіль ЛАУРЫНОВІЧ,
настаўнік.

г. Глуск.

Заява

Віцебскай гарадской рады Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны

Віцебская гарадская рада ТБМ правяла пашыранае пасяджэнне, на якім прысутнічалі прадстаўнікі абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры, выкладчыкі і студэнты ВНУ, настаўнікі, прадстаўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў горада, выхавацелі дзіцячых садоў, прадстаўнікі мясцовага друку.

Было адзначана, што апошнім часам у сродках масавай інфармацыі на Беларусі, у прыватнасці і ў Віцебску, з'явіліся патрабаванні аб наданні расійскай мове статуса другой дзяржаўнай.

Факт адначасовага з'яўлення публікацый, «круглых сталоў», заяў некаторых ветэранскіх арганізацый з прапановамі аб змяненні Закона аб мовах і надання статуса дзяржаўнай расійскай мове насцярожвае і дае падставу меркаваць аб пэўнай спланаванасці гэтай кампаніі.

Што да сутнасці справы, дык мы лічым:

1. Закон аб мовах, хоць і вельмі марудна, з вялікімі цяжкасцямі, але пачаў дзейнічаць.

2. Гэтая акалічнасць выклікае занепакоенасць у людзей нядобразычлівых да ўсяго беларускага, якія лічаць, што Беларусь, калі яна ў поўную моц загаворыць на сваёй мове, будзе немагчыма адлучыць ад самастойнасці і незалежнасці.

3. Перакручваецца сутнасць справы спасылкамі на лакальныя сацыялагічныя апытанні, якія быццам бы патрабуюць так званага двухмоўя. Назіраецца імкненне стварыць уражанне аб адчужанасці беларусаў ад беларускай мовы. Хоць сапраўднае ўсенароднае апытанне, праведзенае ў 1989 г. пры перапісе насельніцтва, сцвярджае: 80,2% беларусаў сваёй роднай мовай назвалі беларускую.

4. Наданне расійскай мове, якая ні юрыдычна, ні фактычна не дыскрымінуецца, статуса дзяржаўнай — абраза для суверэннай Беларусі і прыніжэнне годнасці яе народа.

5. Падобны акт, калі б ён адбыўся, прывёў бы да страты міжнароднага аўтарытэту і павагі да рэспублікі і яе народа.

6. Наданне расійскай мове дэ-юрэ статуса дзяржаўнай непазбежна паставіць крыж не толькі на пашырэнні сферы ўжывання беларускай мовы, а і на развіцці ўсёй беларускай культуры, адраджэнні і развіцці як беларусаў, так і прадстаўнікоў іншых народаў, што жывуць тут ад веку.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Не спытаўшы згоды...

З вялікім шкадаваннем павінен паведаміць, што адзін з кіраўнікоў Асацыяцыі пісьменнікаў баталістаў і марыністаў Беларусі, не спытаўшы згоды ні ў праўлення Асацыяцыі, ні ў агульнага сходу яе членаў, падпісаў заяву аб уступленні Асацыяцыі ў Каардынацыйны савет, які аб'ядноўвае палітычныя партыі і рухі. На пашыраным пасяджэнні праўлення мы разгледзелі гэту заяву. Большасць членаў Асацыяцыі з ліку тых, хто прысутнічаў, заяву аб уступленні Асацыяцыі ў Каардынацыйны савет прызнала несапраўднай і якая не мае юрыдычнай сілы.

А. СУЛЬЯНАЎ,
прэзідэнт Асацыяцыі пісьменнікаў баталістаў і марыністаў.

Алесь ЗВОНАК,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі

Я беларус

Цяжкія хмары цьмянай плашчаніцай
Укрылі спахмурнелы небакрай.
Зямля спякотнай смагаю дыміцца
І перуны здалёк грымяць: пара!

Пара! Зямля набракла прадчуваннем
Грымот шалёных, гулу навальніц,
І прагай да братэрства і яднання,
І ўваскрашэннем храмаў і капліц.

Каб тлумны свет хлусні і ачмурэння
Абноўлены, атрос нарэшце тлен
Дагматыкі, знявагі, прыніжэння,
На поўны рост узняўшыся з кален.

Каб, скінуўшы ланцуг дактрын іржавых
Тандэтных ісцін спарахнелы друз,
Я мог сказаць без боязі расправы:
Я—вольны сын свабоднае дзяржавы,
Я—беларус!

Жагнанне

Напоўні мне лёгкія чыстым паветрам,
Пушчанскіх лясоў лёгкакрылая вея!
Яшчэ лебядзіная песня не спета,
Яшчэ дух бадзяжы ў знямозе
не млее!

Зарой камунізму надыхаўся ўдосталь,
Ад бляску яго папсаваў сабе вочы.
Нахабная, ў госці прыходзіла проста
Кабета з касою і двойчы, і тройчы.

Надыхаўся тхлінай астрожнай
да зморы
У чэраве цёмным панурай махіны,
У карцары мокрым, бы ў скрыні
Пандоры,
Што сыпала шчодра і здзекі, і кпіны.

Надыхаўся чадам атрутным адчаю
На зыбістых хвалях Ахоцкага мора,
Надыхаўся крыкам стрывожаных чаек,
Надыхаўся бляскам астуджаных
зорак...

Кідаў мяне ў пекла праліў Лаперуза
Пад лёкам задраеным цяжкім
удушшам,
Не стаў я канвойнікам лішняй абузай,
Выпадкам не трапіў ў мёртвыя душы.

Надыхаўся водарам даўкім прыбою
Крыху гаркаватым і саланаватым,
Надыхаўся цемрай і пылам забою,
Блакітам нябёсаў праз частыя краты.

Надыхаўся ветрам калымскае сцюжы,
Блатным брыдкаслоўем і матам
ад пуза.
Варнацкую долю ўсцілалі не ружы,
Не вельмі ласкава ўсміхалася муза.

Была яна найміткай клікі прыдворнай,
Была утрыманкай у сытай эліты,
Служыла душою і целам пакорна...
Пакінем. З гісторыяй мы йшчэ не квіты.

Яшчэ наш «любімец» пад тоўшчай
бетону
Ляжыць каля самай пачэснай грабніцы,
Да лямпачкі кату мільёнаў праклёны,
Гул воплескаў кату усё яшчэ сніцца...

Напоўні мне лёгкія чыстым паветрам
Маёй незалежнай зямліцы, сталіца,
Я чую ўсім сэрцам твой голас
прыветны,
Прымаю жагнанне бацькоўскай
дзясніцы!

Дышаль

Было й такое. Чорны след няславы,
Які здалёк па почырку відзён,
Засведчыў час крывавае расправы
Над лепшымі сынамі нашых дзён.

Было й такое: драму Курапатаў
Спісаць хацелі на чужынскі рэйх,
Каб на чужых віну ускласці катаў
І тым прыкрыць свой сатанінскі грэх.

Цяпер, калі ўсе поскудзі раскрыты,
Калі вяршыць гісторыя свой суд,
Відаць, як рэшткі зрынутай эліты
Ссякаюць пад сабой ратунку сук...

І смех, і грэх, якім няма паўтору:
Хачу іду на суд, хачу—не йду!
Мяне ж сілком запхнулі ў «чорны
воран»
І не спытаў ніхто «хаў ду ю ду!»

Затое так давалі ў хвост і грыву,
Што ў адзіночку мехам валаклі...
[Пракляты лёс грымасы строіць крыва,
Хоць ты ганьбуй яго, хоць ты хвалі!]

Відаць, закон што дышаль, і павінен
Яго трымацца кожны, ды не я...
А зрэшты, гэта ўсё ў чужой краіне
І хата з краю, хоць і не мая!

Думы

Думи мої, думи мої,
Лихо мені з вами!
Тарас ШАЎЧЭНКА.

1

Канец стагоддзя твар скрывіў
пачварны
І скрыжаваў нянавісці мячы.
А людзі прагнуць паратунку марна,
Ад родных хат губляючы ключы.

Зышла ў нябыт імперыя пакуты,
Мільгнуў між чорных хмар прамень
надзей,
А ўжо грыміць зямля жалезам кутым
І неба растрывожана гудзе;

І страты, страты жыццяў
чалавечых,
І пыл, і друз, і чадны пах руін,
І немы крык жанчын, і енк малечы...
Няўжо бязглузды свет сышоў на клін!!

Дзе ён, пачатак той злавеснай квадры,
Што насылае дым, агонь і кроў!
І гарам пахне з райскіх кушчаў Гагры,
І тленам вее з лаўравых гаёў...

2

Братэрству — крах. Дзярэ дыякан горла
Па убіенным, хто касцьмі палёг.
Гудуць званы пад гул гарматных
жорлаў,
Не йдзе на помач усявышні бог.

Ізноў руку ўзнімае брат на брата,
Дарма Мерані шпорыць Эдуард,
Чым больш у рост ідуць акселераты,
Тым глупства больш, мацней яго азарт.

Хто не бываў у Гаграх ці ў Сухумі,
Хто цынандалі смак не паспытаў!!
Дзе наш хаўрус! Растаў у чадзе
й тлуме,
Папраўшы веру ў бога і Хрыста!

Я часта з жалем згадваю сустрэчы
З нашчадкамі вялікага Шата́,
Дзе валатовых эўкаліптаў вечам
Нам вечар казкі Грузіі шаптаў,

Сустрэчы з Гамсахурдзія старэйшым
І поўны рог з бурштынавым віном,
Студэнт Звіяд, сын Канстанцінаў
першы...
Ах, гэта ўсё было даўно, даўно!..

3

Хто скажа, чорт які людзей
паблытаў,
Братазабойству даўшы чорны ход,
Каб след крыві на старажытных
плітах
Змываў слязьмі падмануты народ!!

Яна ж была чысцей, празрысцей, ява,
І свет надзей быў значна маладзей.
Адкуль жа злосць ўсёзнішчальнай
лавай
Сумленне ў дым развеяла ў людзей!!

Няўжо ж вам, людзі, мала Карабаха,
Агню Цхінвалі і ахвяр Днястра!!
Няўжо свабоды сімвал—гэта плаха,
Якая прагне ласкі тапара!!

4

Жыве ж і ў нас амаль што ад калыскі
Боль раны, што й дасюль не зажыла.
Жыў-быў паэт Алесь Дудар калісьці,
Пісаў: «Пасеклі край наш папалам»...

За што і быў аплёваны й сасланы,
Замёў крывавы час яго сляды.
Не зажылі ж на целе нашым раны,
Нанёс якія мудры правадыр.

А сапраўды ж, пасеклі... у лік
аплаты
Пайшлі і душы нашы, і зямля.
Наш горкі лёс ахвярамі багаты:
Каму улада й трон, каму—пятля!

Мы ж не крычым: Аддайце нашу
Вільню!
Мы ж не галосім: Дзе наш Беласток!
Народ наш хоць і пільны ды
цывільны—
Да плуга больш ці да камбайна схільны
І дабрынёй сваёй грашыць чуток!

5

Заўжды пасрэднасць прагне славы.
Мала
Ёй быць Іванам Грозным ці Пятром
Вялікім. Нават бедны наш Купала
Іх услаўляў пакутлівым пяром.

Не, ён ніяк не быў раўня Дзямяну,
Прыдворным блазнам ка́та не смяшыў,
Свайго народа сын вернападданы,
Ён супастатам не прадаў душы.

Хоць схібіў трохі, быў жа чысты
сэрцам,
Сумленна жыў, загадкава памёр:
Падцікаваны быў майстрамі смерці,
Не ўратавалі мы, нам і дакор!

6

О, смутны час напрыканцы стагоддзя,
Спыні гульні смяротнае кругі,
Пакуль стыхія мсцівага разводдзя
Не паразмыла гневам берагі!

Цень Вавілонскае вежы

Хорошо языком иностранным
немножко владеть,
И владея чуть-чуть, до чего хорошо
помолчать,
Помолчать, повертеть запотевшую
рюмку в руке,
Потому что молчим мы как раз
на одном языке.
А. КУШНЕР.

Добра вырасціць сад, назіраць,
як зялёныя лапы
Гнуцца долу, сагрэтыя сонечным
восеньскім днём,
Ад даспелых антонавак, райкі,
каштэлі, сінапа...
Добра госця сустрэць маладым
запацістым віном!

Быў з Амерыкі госць — аднакашнік
калымскі калішні,
Быў з Бруселя юнак-практыкант,
адным словам, студэнт.
Госць у нас, беларусаў, як кажуць,
ніколі не лішні,
Хоць не водзіцца ў нас ні той фунт,
ні той франк, ні той цэнт.

Шчабятала дачка па-англійску
з Масеем Сяднёвым,
Я ж на мове сваёй беларускай
як рыба маўчаў,
А тым больш, што сядзеў за сталом
трэці госць ганаровы,
Пракурор у мінулым, што ўсіх
як шкалят павучаў...

У Нью-Йоркскай глушы не згубіў
госць мой матчыну мову;
Там — шматмоўе, кангрэс жа гаворыць
на мове адной,
Толькі ў нашым кангрэсе, між іншым,
з усіх адмысловым,

На чужой мы гаворым, маўчым
жа на мове сваёй!

А студэнцік, каб лепш размаўляць
навучыўся па-руску,
Быў запрошаны ў Мінск—рускамоўны
раён-рэгіён!
[Што спадар, значыць я, меў за мову
дзесятку кутузкі,
Ні бум-лазара ведаць не мог
недасведчаны ён!]

Як гаворыць біблейскі сюжэт,
вавілонскую вежу
Брат старэйшы ляпіў, каб гучала
гаворка адна.
Ён старанна заворваў этнічныя
моўныя межы,
Скуль чароўная здань камунізму
найлепей відна.

Што ж дзівіцца з таго, што не ў часе
біблейскім, а сёння
На народ мой упаў вежы той
праславутае цень;
Што ж здзіўляцца, калі адшчапенцу
ў чужацкіх далонях
Некаторыя рэчы здаюцца намнога
таўсцей!!

Вось таму і сінкліт наш вядзецца
на мове не роднай.
Нігілізм!—так гавораць вучоныя нашы
мужы.
Чый жа хлеб на стале ў абраннікаў
нашых народных,
Што за мову чужую сапуць,
паднапяўшы гужы!!

Сёе-тое паклаў бы на тых
нігілістаў ці здрайцаў,
Што ваду так старанна, да поту,
у ступе таўкуць,
Што ад матчынай мовы паспелі даўно
адцурацца,
Што двухмоўны гібрыд у парламент
сілком валакуць.

Пераконваць іх сэнсу не бачу, не варта
й старацца,
Лепш пацісну я рукі Шушкевічу
і Пазняку!

Каляднае шчыраванне

Пімен ПАНЧАНКА,

народны паэт Беларусі:

— Год 1992-гі... Якім быў ён? Ды, бадай, незвычайным. Незвычайным ужо тым, што ўсё лета стаяла страшэнная спякота. Такая, якой, кажуць, не бачылі гадоў пяцьдзесят. Але разам з тым ураджай атрыманы як быццам і не благі. Асабліва на Палессі. Прывезлі мне адтуль бульбы, дык — буйная, смачная. З маленства, здаецца, такой не еў. І народ, па ўсім, галадаць не будзе. Адведалі мяне нядаўна Старшыня Савета Міністраў Кебіч, міністры Вайтовіч і Краўчанка. Пагаварылі, паразважалі—здаецца, не ўсё так і кепска.

Ну, а што літаратура? Праўда, скажу толькі пра паэзію, пра тое, што бліжэй мне. За паэзіяй, нягледзячы на цяжкую хваробу, стараюся сачыць рэгулярна. Радуе, вельмі радуе мяне Сяргей Законнікаў, а яго паэма «Чорная быль» — рэч надзвычайная, па-сапраўднаму высокамастацкая. Падобныя творы не часта з'яўляюцца. З чытанага апошнім часам запомніліся творы Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, Васіля Макарэвіча. Хаця, калі гаварыць пра паэзію ў цэлым, дык, на маю думку, аўтары і сёння пазбаўлены смеласці. Гои самаи адчайнаи смеласці, якои доўгі час нам не хапала. Цяпер, здавалася б, усе умовы створаны, гавары прама пра набалелае, пішы. Ды чамусьці не заўсёды тое, што хацелася б, страчаем у друку.

Наконт года наступнага. Усе нас страшаць, што год 1993-ці будзе вельмі цяжкі. І для людзей, і для літаратуры. Па-мойму, многія цяжкасці (найперш эканамічныя) ад таго, што ўлады не даюць сялянам зямлю. Нават першыя захады, якія наконт гэтага прымаліся, зведзены, як кажуць, ні на што. Фермерства ж, па сутнасці, распалася. А ўзяць урадавыя праграмы па адукацыі? Яны слабыя, не заўсёды ўлічваецца тое асноўнае, на што неабходна арыентавацца. Рабіць жа трэба вельмі шмат. А мы з адных крайнасцяў пачынаем кідацца ў новыя. Спашлюся на нядаўні прыклад. Слухаю адну з перадач па радыё. Настаўніца пытаецца ў малых, што важней, што лепш — камбайн ці траўка? Разважыўшы, дык гэта ж супастаўленне немагчымага! Але на поўным сур'ёзе даводзіцца, што галоўнае — траўка, бо гэта божае стварэнне, а камбайн толькі вынік розуму людзей. Ды гэтак усю справу сапсаваць можна. Так ніколі не рабілася. Звярталася ўвага на вечныя, агульначалавечыя каштоўнасці.

Трывожыць мяне і тое, што не хапае падручнікаў — і для малодшых, і для старэйшых класаў. Тыя ж новыя, што напісаны ўжо (пра гэта мне казаў Ніл Гілевіч), своечасова не друкуюцца, бо пастаянныя спасылкі на адсутнасць паперы. А падзенне тыражу газет, часопісаў? А становішча з выданнем беларускамоўных кніг? З аднаго боку — суверэнная дзяржава, нацыянальнае Адраджэнне, а з другога? Закрываюцца бібліятэкі, не папаўняюцца іх фонды. «Глухне» і нацыянальны тэатр. Я — не песіміст і таму будзем спадзявацца, што ў новым годзе наша жыццё палепшыцца.

Дзмітрый БУЛАХАЎ,

народны дэпутат Рэспублікі Беларусь,
старшыня камісіі Вярхоўнага Савета па заканадаўстве:

— Так здарылася, што мы з жонкай пазнаёміліся пад Новы год. 1 дзве нашы дачушкі нарадзіліся блізка каля Новага года. Так што гэтае свята для мяне — сапраўды сямейнае. Сустракаем мы яго дома, іншым разам аб'яднаўшыся з суседзямі.

Мінулы год быў цяжкі. Адчуваю, што цяжар праблем, якія трэба было рашаць, не толькі не зменшыўся, а ўзрос. Праўда, пачуццё незадаволенасці зробленым дапамагае ў рабоце. Калі адчуваеш сябе ў камфорце, працаздольнасць зніжаецца. Работы было вельмі шмат, але зроблена не так многа.

Асабіста для мяне вельмі важна, што Вярхоўны Савет прыняў канцэпцыю прававой рэформы. Хаця вынікі яе прыняцця сёння, магчыма, незаўважныя, яны будуць адчувальныя ў наступным.

Канечне, галоўнае — прыняцце новай Канстытуцыі рэспублікі. Усе астатнія пытанні побач з гэтым другасныя. Яе прыняцце — найпершая задача на будучае.

Сваю будучыню я не аддзяляю ад будучыні нашай рэспублікі. Ды як жа інакш? Я — грамадзянін гэтай краіны, маім дзецям тут жыць. Іншае пытанне: як разумець гэтую будучыню?

Я вельмі хачу, каб мы перасталі шукаць ворагаў унутры свайго грамадства і пачалі працаваць. Як бы нас ні дзялілі на «нашых» і «нянашых», на харошых і благіх, усім нам трэба зразумець, што Беларусь — гэта маленькі карабель. Калі ў шторм каманда замест аўралу пачынае біцца між сабой, таму што капітан не падабаецца памочніку, памочніку не падабаецца рулявы, а рулявому — матрос-матарыст, такі карабель у шторм перакуліцца. Давайце помніць пра гэта.

Алесь КРАЎЦЭВІЧ,

гісторык, археолаг:

— 1992 г. запомніўся як апошні год творчай свабоды. На пасадзе галоўнага спецыяліста па археалогіі ў творчай майстэрні С. Багласава меў магчымасць зарабляць на жыццё і свабодна займацца навукай. За адзін месяц зарабляў жыццёвы мінімум на чатыры. На службу хадзіць не трэба, працу рабі дзе хочаш, толькі здавай у тэрмін. Не верылася нават такому шчасцю. І плён быў — зрабіў дзве кніжкі.

Цяпер жа трэба ісці на нейкую іншую службу, каб карміць сям'ю, і волі прыйшоў капец.

А маю зараз 34 гады і адчуваю прагу да навукі і ведаю, што атрымліваецца.

Запомнілася яшчэ лета, археалагічныя экспедыцыі, сустрэчы з сябрамі, паездкі на Чорную Ганьчу, свята ў Наваградку.

Запомнілася забарона рэферэндуму аб роспуску парламента. Вестка аб забароне заспела ў позняй экспедыцыі, калі я сядзеў у заснежаным раскопе і ляскаў зубамі ад холаду. Да дыскамфорту фізічнага дадаўся псіхічны, доўга не мог супакоіцца ад абурэння, хацелася ісці і біць кулаком па шырокіх дэпутацкіх мор... прабачце, тварах.

Ад 1993 года чакаю далейшага пагаршэння жыцця. Спадзяюся, што беларусы нарэшце вырашаць турнуць ад карміла ўлады паўнашчокіх апаратных малойцаў, якія, здаецца, ужо канчаюць будаваць уласныя персанальныя катэджы і таму лягчэй паддадуцца. Спадзяюся пасунуць уперад адну цікавую працу (аж рукі чэшуцца да яе дарвацца).

Валянцін АКУДОВІЧ

Літаратура ў краіне Сакрэту

ЭСЭ

1. СІТУАЦЫЯ

Беларусь... Што вымаўляем, мовячы гэтае рафінаванае, не тутэйшым досведам народжанае слова? Пытанне не выпадковае, бо этнаграфічна, геаграфічна, гістарычна, палітычна... Беларусь — гэта розныя суб'екты, якія мы даволі ўмоўна паядноўваем адным этнонімам. Да таго ж сэнсы гэтых суб'ектаў цьмяныя, рысы няўстойлівыя, логіка іхняга быцця заблытаная і невыразная. Хіба толькі з гледзішча эканомікі і сучаснай палітычнай геаграфіі мы набылі ў нейкай ступені завершаны аб'ём.

Яшчэ складаней што-кольвек пэўнае засведчыць пра Беларусь, як пра нешта цэласнае ў духоўным сэнсе, і ўжо зусім немагчыма вызначыць для яе агульнае эстэтычнае поле.

суперак усім «гістарычным» абставінам, як бязмозглая трава праз асфальт, яны прасякаюць задуху нетраў, каб пакласці галаву пад абцас. Прозвішчы большасці з іх так і застаюцца нявымаўленымі, але сам феномен выразна прачытваецца з біяграфіі тых, хто апынуўся навідавоку: Чачот, Багрым, Багушэвіч, Багдановіч і, можа, найперш, граф Альгерд Якаў Абуховіч-Бандынэлі. Выхаванец Жэневы і Парыжа, знаўца англійскай, французскай, нямецкай, італьянскай, іспанскай моў, на бацькаўшчыне далучыўся не да магутных расейскай ці польскай культур, а заахвяраваў сваім жыццём і творчасцю дзеля таго прывіднага, што Шапенгаўэр называў «геніем роду»...

Але тут я, згодна задуме, вымушаны перавесці плынь ге-

менняў, звернемся да мінуўшчыны. Зрэшты так яно будзе і больш паглядна і, магчыма, больш пераканаўча, бо, акрамя іншага, падкрэсліць старажытнасць паходжання гэтай драмы беларускага літаратара.

Пачнем з Міколы Гусоўскага. Напэўна, большасць пагодзіцца, што яго знакамітая паэма аніяк не магла быць напісана такой, якой яна была напісана, у рэчышчы старажытнабеларускай мовы і той, уласна «беларускай», культуралагічнай сітуацыі, што склалася ў першай чвэрці шаснаццатага стагоддзя на абшарах нашае бацькаўшчыны... Яшчэ больш кантрастна ілюструе згаданую тэзу творчасць Фёдара Дастаеўскага. Уявім сабе, што ў тую ж пару ён нарадзіўся і вырас на Беларусі, атрымаў тут адукацыю і стаў працаваць на бела-

раізаванай дэкламацыі ў больш плыткае рэчышча цяперашніх літаратурных дачыненняў.

2. КАНТЭКСТ

Сучасны беларускі літаратар жывіцца ідэямі, канцэпцыямі, вобразамі еўрапейскай і сусветнай культур, звычайна запазычанымі праз літаратуру-пасрэдніка (найчасцей расейскую), ці напрасткі — расейскай, а працуе, творыць у літаратуры даволі далёкай ад гэтых канцэпцый, ідэй, вобразаў.

Сам па сабе факт прылучэння да іншых культур яшчэ ні аб чым не гаворыць. Якой багатай ні была б літаратура таго ці іншага народа, яна ніколі не задаволіць цалкам патрэбы творцы. Зрэшты, немагчымасць самааблогі закладзена ў прыроду цывілізацыі. Выбух духоўнасці ў той ці іншай частцы свету нават міжволі вымушае азірнуцца туды, дзе грымоты. Пранізлівы бляск інтэлектуальных маланак слепіць і моцна заплюшчаныя вочы. Гэта ў крайнім выпадку культуралагічнага этнацэнтрызму. Звычайна прылучэнне да эстэтычна не-родных знакаў адбываецца самахоць, у сілу натуральнага памкнення да тых праяў творчасці, якія выяўляюць невядомую дагэтуль прыгажосць.

Але выпадак з беларускім літаратарам асобны, і было б памылкай разглядаць яго ў агульнай сістэме культуралагічных дачыненняў. Наш літаратар з роднай яму культуры чэрпае жменькай, а з другіх п'е нагбом, і чым буйнейшы ягоны творчы патэнцыял, тым большае гэтая дыспрапорцыя не на карысць роднай літаратуры. Прычына згаданай анамаліі, пэўна, вынікае з таго, што родная літаратура не тоесная духоўнаму стану беларускага літаратара, сфармаванага на іншых, не з роднай літаратуры, эстэтычных рэаліях...

Здавалася б, у сваёй творчасці ён і павінен выяўляць гэты з сусвету назапашаны вопыт (мы помнім Бюфона: стыль — гэта чалавек), але чамусьці не выяўляе.

Парадаксальнасць сітуацыі якраз і бачыцца ў тым, што, ствараючы нешта на беларускай мове, у кантэксце беларускай літаратуры, літаратар стварае на ўзроўні літаратуры, а не на ўзроўні сваіх ведаў, свайго разумення чалавека і людства. Аказваецца, сам кантэкст літаратуры вымагае быць роўным яму, аказваецца, ён не трывае нікога паперадзе сябе. Літаратурны кантэкст — гэта тая сцяна, да якой прыкуты мастак, і самае большае, што ён можа — адбегчыся на даўжыню ланцуга.

Згаданую сітуацыю можна было б праілюстраваць на прыкладах сучаснага пісьменства, але каб пазбегнуць непаразу-

рускай літаратурнай ніве. Бясспрэчна, мы займелі б класіка беларускай літаратуры, але гэтак жа бясспрэчна, што свет згубіў бы аднаго з найвялікшых пісьменнікаў за ўсю гісторыю чалавецтва... Калі будуць знойдзены беларускія вершы Адама Міцкевіча, яны нам таксама прадэманструюць тую розніцу паэтычнай культуры (у гэтым можна не сумнявацца), якую дыктуе творцу культуралагічны кантэкст.

Не станем множыць прыклады, іх на Беларусі — як мала ў каго. Зазначым толькі, што мастак заўсёды імкнуўся пераадолець інерцыю кантэксту, і ў сяго-таго гэта амаль атрымлівалася (Багдановіч, Разанаў).

З усяго папярэдняга вынікае, што беларускі літаратар працуе і не для сябе, паколькі сам мацуецца іншымі эстэтычнымі сэнсамі, і не для чытача, бо той гэтаксама круціць носам над абрыдлай поліўкай і цягнецца да замежных ласункаў, а дзеля кантэксту, дзеля доўжання, непарыўнасці літаратурнага працэсу з магчыма неўсвядомленым жаданнем выцягнуць, выраўняць гэты кантэкст, каб некалі зажыць нармалёвым, тоесным самому сабе літаратурным жыццём.

3. НАЦЫЯНАЛІЗМ

Пад нацыяналізмам звычайна разумеюць не экзістэнцыяльнай бясконцасці духоўную ідэю, а нацыянал-патрыятычныя эмоцыі. Як быццам — дарэмна, але ўнікнем супрацьпастаўлення. У нацыяналізму і нацыянал-патрыятычных эмоцый агульны корань, а розніць іх між сабой, разводзіць у адваротныя станы — асоба. Яе кшталт вызначае гуманістычную вартасць нацыяналізму. Каб праілюстраваць гэтую выснову, згадаю побач з Васілём Розанавым маскоўскага рамізніка, які пагатоў сваёй рукой выдзерці пейсы ўсім жыдам, колькі іх ёсць на белым свеце...

Тое, што нацыяналізм трэба як мага хутчэй выводзіць за межы нацыянал-патрыятычных эмоцый і адначасна ўзвышаць над плоскасцю палітычна самаахоўнае ідэі, сталася відавочным пасля года-другога шчырых дэкламацый і палкай рыторыкі на вызваленую з-пад прыгнёту тэму. Сярод іншых спроб у гэтым накірунку найбольш плённай, здаецца, аказалася тэндэнцыя да інтэлектуалізацыі нацыяналізму, што азначала рацыяналізаваць яго (Сяргей Дубавец, «ЛіМ», № 40, 1990 г.), з аднаго боку, і выявіць у ім змест усеахопнага духоўнага значэння — з другога. А ў прамежку — на падставе нацыяналізму актуалізаваць увесь суплёт сучасных інтэлектуальных і эстэтычных ідэй.

(Працяг на стар. 15).

«ПРАЗ ЭКАНОМІКУ — ДА КУЛЬТУРЫ» — дэвіз акцыянернага таварыства «Кросны», некалькі месяцаў таму створанага ў Менску. Сярод яго заснавальнікаў — суполка мастакоў «Пагоня», Нацыянальная мастацкая галерэя. «Кросны» актыўна ўлучыліся ў наладжанне новай эканомікі. Па якіх прынцыпах яна ствараецца! Дзеля чаго! У імя чаго! Аб гэтым наш карэспандэнт гутарыць з генеральным дырэктарам таварыства сп. Янам ГРЫБАМ.

У НОВАЙ ЭКАНОМІЦЫ — НОВЫЯ ЛЮДЗІ

Ян ГРЫБ:

«Хачу, каб былі заможнымі і свабоднымі мае дзеці»

— Спадар Грыб, амаль у кожнага свайго суразмоўніка — пісьменніка, навукоўца, палітыка — я цікавіўся думкамі наконт магчымасці ўзнікнення г. зв. сярэдняга класа ў Беларусі, пытаючыся, між іншым, ці не хвалюе іх, хто патрапіць у гэты клас. Мае дагэтуляшнія суразмоўнікі па большасці выказвалі ўпэўненасць, што прадпрымальнікі Беларусі, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці, падтрымаюць адраджэнне і ўсталяванне самастойнай дзяржаўнасці; акрамя таго, беларусы, вызваленыя ад клопату пра эканоміку, атрымаюць магчымасць тым часам займацца гуманістыкай, культурай... А на ваш погляд, спадар Грыб, ці абгрунтаваныя такія спадзяванні?

— Сэнс вашага пытання добра зразумеў, бо сам вельмі доўга над ім думаў і думаю цяпер. Маё глыбокае перакананне: на сёння ў Беларусі складваецца сітуацыя, якая ўжо мела прэцэдэнт. Светлай памяці Міхась Ткачоў, выступаючы на ўстаноўчай канферэнцыі нашага таварыства, пацвердзіў мае ўласныя думкі і сумненні. Перад кастрычніцкім перавротам 1917-га года на Беларусі на дзяржаўных пасадах — ад самай ніжэйшай да самай высокай — былі пасаджаны толькі расейцы. Такой была палітыка Расейскай імперыі на ўскраінах. У прадпрымальніцтве стан выглядаў прыблізна так: габрэяў — да 45%, расіян — да 15%, палякаў — каля 8%, літоўцаў — каля 5%, татары, грузіны... і г. д. А беларусаў — гаспадароў краю — ажно 1-1,5%! Уяўляеце сітуацыю: з дзесяцімільённага народа, аснову якога складаюць беларусы, — каля 8 млн., — у бізнесе толькі 1,5%! Астатні народ хадзіў за сахою...

Дык вось: праўдападобна, што такое ж становішча ў эканоміцы - прадпрымальніцтве складваецца і цяпер.

— Можа, маеце дадзеныя статыстыкі на гэты конт?

— На жаль, такой статыстыкі ў мяне няма, бо, здаецца, ніводзін інстытут ці сацыялагічны цэнтр ёю не займаецца — прынамсі, мне невядома пра такую працу. А дарэмна, бо такія падлікі былі б каштоўнымі для зразумення агульнай сітуацыі ў грамадстве.

Але мая пазіцыя грунтуецца на асабістым вопыце, дзелавых кантактах і да т. п. Сітуацыя, так бы мовіць, на паверхні.

Той жа М. Ткачоў сцвярджаў, што ці не з-за адсутнасці дастаткова моцнага і ўплывовага класа **беларускай** буржуазіі (у сэнсе — сярэдняга класа спаміж карэннай нацыі) не перамагла і не магла перамагчы ў 1918-м годзе Беларуская Народная Рэспубліка. Яна не была як след падтрымана нацыянальнай буржуазіяй — замоўцам незалежнай дзяржавы. Хоць, вядома, ёсць і іншыя, гістарычныя фактары таго паражэння...

Сярэдні клас складае аснову нацыі, падтрымоўвае сацыяльна-палітычныя памкненні інтэлігенцыі, нацыянальна-культурнае ўладкаванне жыцця таго ці іншага народа.

Тыя навукоўцы, пісьменнікі, а тым больш палітычныя дзеячы, якіх вы ўзгадалі напачатку, — трагічна памыляюцца. Такая перакананасць інтэлігенцыі шкодная для цяперашняга беларускага адраджэння.

— Вы лічыце, што прадпрымальнік-«бізнесмен» — «інародзец» — не пахінецца да адраджэння?

— Сёння гэта відавочна. Я ніводнага разу яшчэ не чуў, каб тутэйшыя прадпрымальнікі падтрымалі якія-небудзь культурна-гуманітарныя праграмы. Хто з прадпрымальнікаў падтрымаў прыняцце вайсковай прысягі 8 верасня 1992 года? Там былі патрэбны невялікія ўвогуле выдаткі, але ніхто іх не з'ахвяраваў, акрамя вядомай ужо фірмы «Дайнова» (дай Бог здароўя і шчасця яе прэзідэнту сп. Адаму Палюховічу). Акрамя «Дайновы» няма каго назваць.

— Ёсць такі закід: маўляў, нясхільнасць да прадпрымальніцтва закладзена ў менталітэце беларусаў...

— У нечым, можа, вы маеце рацыю, таму што, на маё перакананне, менталітэт беларускі спрыяе працы вельмі канкрэтнай, уседлівай, вытворчай. А прадпрымальніцтва — гэта бізнес, выробленне грошай. Беларусам у пэўнай ступені чужды гэты занятак. Але няўжо ў нас не хопіць розуму з'арганізаваць уласны бізнес?

Я паважаю ў гэтым сэнсе розум і настойлівасць габрэйскага народа, які спрадвеку жыве разам з беларусамі і, я лічу, паказвае ўзоры прадпрымальніцтва... У іх нам патрэбна вучыцца бізнесу, ды не толькі яму: яшчэ й захаванню нацыянальнай годнасці, аблічча, традыцый — не зважаючы на жудасныя знешнія ўмовы дзеля габрэйскага нацыянальнага жыцця.

— У каго вучыліся вы, спадар Грыб, акрамя габрэйстваў; ці існуе гістарычная традыцыя ўласна-беларускага прадпрымальніцтва?

— Магчыма, такія прыклады ёсць, але яны нам невядомы: мы ж не ведаем гісторыі агульнай, не кажучы ўжо пра такія дэтальныя звесткі. Перад вачыма ў мяне, як і ў іншых беларускіх прадпрымальнікаў, нічога з гісторыі не было. Мы звычайныя «свядомыя беларусы», хто душой хварэе за наша нацыянальнае станаўленне, адраджэнне пачуцця гаспадара на свае зямлі. Мы часта збіраліся і разважалі: «Хлопцы, давайце штось будзем на сваёй зямлі рабіць — самі». Тут наша пазіцыя пераклікаецца з пазіцыяй Сакрата Яновіча: «Беларусы, пра свае справы мусіце гаварыць самі».

На такой аснове і ўзнікла акцыянернае таварыства «Кросны».

— Колькі слоў пра станаўленне таварыства.

— Калі прадпрымальніцтвам у краіне займаюцца па большасці прышлыя камерсанты — не важна, скуль, — дык у іх адно памкненне — паболей хапнуць, набіць кішэні. Пра рэспубліку і дабрабыт народа рэспублікі, а балазе пра культурнае мецэнацтва гэтыя дзялкі дбаць ніколі не будуць. У такіх жорсткіх варунках беларусам трэба гуртавацца паўсюль, у тым ліку і ў бізнесе, — каб самім вызначаць і ўдасканальваць лад жыцця ў сябе дома, ставіць яго на нацыянальную — у сэнсе ўласна-беларускую — аснову.

Менавіта нацыянальна-свядомыя прадпрымальнікі, патрыёты будуць клапаціцца пра заўтрашні дзень не толькі саміх сябе, але і свайго народа, суграмадзян. Толькі яны — больш ніхто. Натуральна, бізнес межаў не ведае, і мы не збіраемся замыкацца ў сваім коле. Мы будзем супрацоўнічаць з любымі структурамі — але толькі пад тым варункам, калі гэта будзе на карысць нашай Бацькаўшчыны.

— А што вы, спадар Грыб, маеце на ўвазе пад паняццем «інтарэсы народа»?

— Калі мы не зладзім беларускага сярэдняга класа, уся гэтая «дэмакратыя», абвешчаная посткамуністычным Вярхоўным Саветам, — рассыплецца на вачах. Таму што няма тае сацыяльна-эканамічнае сілы, якая падтрымае ўладкаванне сапраўднай дэмакратыі на Беларусі. А калі не ўладкуецца дэмакратыя, тады мы зноў скоцімся ў таталітарызм, з якога драматычна выкарасквaліся і выкараскваемся. Акрамя гэтага, беларусы так і не пераадолеюць сваю «краёвасць» — паўночна-заходнюю.

— Значыцца, вы падзяляеце вызначэнне «кампрадорская буржуазія»?

— Безумоўна, да нейкага ўзроўню такая з'ява мае месца.

Буржуазія — пры дэмакратычнай сістэме — рухавік эканомікі і культуры любой краіны, гэта зразумела...

— А якога адцення кампрадорская буржуазія ў Беларусі — заходняга ці ўсходняга?

— Мне здаецца, нам не трэба хінуцца ані да Захаду, ані да Усходу, — нам трэба ствараць сваё.

— Што ж замінае станаўленню ўласнай бізнесавай структуры?

— Замінае толькі адно — няпэўнасць палітычнай сітуацыі, якую стварылі сучасны ўрад і парламент. Гэтая няпэўнасць і так званыя «законы», спароджаныя ў ёй, — не даюць магчымасці паўстаць новай эканоміцы. У дэмакратычных краінах, калі ўтвараецца новае прадпрыемства, ягоныя стваральнікі на пэўны тэрмін вызваляюцца ад падаткаў. Урад жа В. Кебіча пры дапамозе наменклатурнай часткі Вярхоўнага Савета з прадпрымальнікаў выграбае такія падаткі, што на карані душацца новыя структуры.

Асноўная задача акцыянернага таварыства — падтрымка існуючых малых прадпрыемстваў на Беларусі і ўтварэнне новых. Але з-за падаткавай палітыкі ўрада гэтая праца сёння становіцца вельмі няўдзячнай. МП зараз выплачваюць у падаткі ад 60-ці да 70-ці і больш працэнтаў з прыбытку. Які прадпрымальнік дасць рады ўтрымаць сваю справу, калі ён не можа забяспечыць людзям-работнікам нават заработную плату, не кажучы ўжо пра развіццё прадпрыемства? Але без развіцця прадпрыемства загіне...

Таму, каб зарабіць нейкую капейку — а стварэнне новых прадпрыемстваў патрабуе капіталаўкладаў, — наша акцыянернае таварыства, апроч іншага, займаецца і бізнесам. Але і тут — «дзякуючы» створанай урадам сітуацыі — вельмі цяжка нешта зарабіць. Забаронены бартэр, забаронены прамыя разлікі паміж рэспублікамі, прыдуманы зерневы фонд, у які патрапілі тэлевізары, халадзільнікі, газавыя пліты... Цяпер мы не можам паставіць газавыя пліты ў Казахстан, каб купіць там хлеб больш танна, чым гэта робіць урад, і да т. п.

Манаполіі на гандаль тытунёвымі вырабамі, гарэлкай... Цяпер гэтыя тавары цыркулююць у ценявой эканоміцы, прадаюцца падпольна і ўвесь гэты бізнес пайшоў нячэсным шляхам, не можа быць абкладзены падаткамі ўвогуле. Парадокс: пры такой жорсткай падаткавай палітыцы ў бюджэт патрапляе менш сродкаў, чым магло быць.

— Па вашых словах выходзіць, што прадпрымальнікі і урад знаходзяцца ў адносінах процістаяння, а не супрацоўніцтва. Няўжо нельга пайсці на ўзаемныя кампрамісы? І, дарэчы, чаму ў такім разе прадпрымальнікі Беларусі не падтрымалі ідэю рэферэндуму?

— Мой асабісты погляд. Яшчэ на першай асамблеі дзелавых колаў Беларусі В. Кебіч абяцаў перагледзець падаткавую палітыку і такім чынам падтрымаць прадпрымальніцкія структуры. Як заўсёды Старшыня Савета Міністраў нас абманыў: практычна не было зроблена нічога, але ён дабіўся таго, што прадпрымальнікі яму паверылі, — тыя, хто вагаўся, пранікнуліся даверам, тыя, хто і раней верыў, паверылі яшчэ мацней, а такіх перакананых «няверникаў», як я, засталося няшмат. Я больш чым упэўнены, што Уладзімір Іванавіч Карагін, да якога я стаўлюся з вялікай павагай, — таксама паверыў В. Кебічу. Здаецца, цяпер ён расчараваўся...

— Ваша стаўленне да Саюза прадпрымальнікаў?

— Стаўленне ўвогуле станоўчае, таму што, каб прадпрымальніцтву выжыць з такім урадам і Вярхоўным Саветам — яму трэба гуртавацца.

— З якой палітычнай сілай вы звязваеце надзеі на будучае?

— Калі мы ствараліся, дык шмат разоў збіралі арганізацыйны камітэт, і да гонару ўсіх нашых дэмакратычных рухаў і структур рэспублікі не было ніводнага, якое б не падтрымала стварэнне такога акцыянернага таварыства, як наша. Гэта і Нацыянальна-дэмакратычная партыя, і БСДГ, але найперш Беларускі народны фронт. Вось на гэтыя сілы, хоць яны пакуль што слабыя і разрозненыя, ускладаем надзеі — кажу гэта і ад імя сваіх паплечнікаў і аднадумцаў. Мы спадзяемся, што нацыянальна-дэмакратычныя сілы з цягам часу ўзмоцняцца і ўрэшце калі не прыйдуць да ўлады непасрэдна, дык абавязкова паўплываюць на палітычную сітуацыю такім чынам, што яна на Беларусі пачне выпраўляцца і вельмі хутка.

Мы не дамагліся рэферэндуму, што, на жаль, моўчкі праглынула сусветнае супольніцтва. Але я спадзяюся, што мы дажывем да новых выбараў і што да таго часу ў значнай часткі народа адкрыюцца вочы на нашу рэчаіснасць.

— Дзе ў эканамічным сэнсе, на ваш погляд, знаходзіцца наша пасляперабудовачнае грамадства?

— Тут няма абсалютна ніякай работы з народам. Нашы людзі як былі выхаваны ў такім люмпенізаваным напрамку, так і застаюцца гэткімі. На люмпенаў абапіраліся бальшавікі. Стагоддзе бальшавізму не мінулася бясследна: паглядзіце, як г. зв. «простыя людзі» ставяцца да тых суграмадзян, хто захацеў стаць фермерам, працаваць ад цямна да цямна, каб разбагацець, каб жылося заможна дзецям ягоным, каб заможнела краіна наша...

— ...Каб фундавалася культура і мастацтва...

— ...Да такіх людзей яны адносяцца як да ворагаў. Псіхалогія гэтая з народа аніяк не выпетрыцца. І тутэйшыя посткамуністычныя структуры робяць усё, каб псіхалогія гэткая заставалася.

— ?

— Таму што гэткая грамадская псіхалогія, гэткі стан грамадства даюць ім магчымасць займацца ўласным бізнесам — і па большасці антынароднымі шляхамі.

Структурам, якія створаны пры ўрадавых ці былых пар-

(Працяг на стар. 12).

Іван ШАМЯКІН,

народны пісьменнік Беларусі:

— Чым знамянальны год мінулы — 1992-гі? Пытанне нашай маладосці, застою, калі шмат якія падзеі, агульнаграмадскія і асабістыя, можна было аднесці да рангу знамянальных. Аб якой знамянальнасці можна гаварыць цяпер, калі паглыбляецца развал эканомікі, культуры, ідзе збядненне народа? А мы, пісьменнікі, стаім убаку, назіраем і пляскаем у далоні: ах, дажылі да найшчаслівейшага часу росквіту дэмакратыі! Здорава нас навучылі пляскаць і крычаць «ура» і дрэнна вучылі аналізаваць сацыяльныя з'явы. А вучыцца было ў каго — у Купалы, Коласа, Гарэцкага. Маладыя, без вышэйшай адукацыі, яны выдатна гэта рабілі. А ў нас столькі пісьменнікаў — дактароў навук. І што? Дзе сацыяльны аналіз сённяшняга жыцця?

У асабістым плане: хварэў доўга, але нешта рабіў, не пісаць не мог. Здаў дзве аповесці ў «Маладосць». У «Полымя» здаў працяг кнігі «Карэнні і галіны» — успамінаў аб тым часе, які цяпер клянём. Чаадаеў некалі сказаў: «Адмовіцца ад свайго мінулага — значыцца пазбавіць сябе будучыні». Думаю і надалей выконваць гэты запавет — працягваць працу над успамінамі.

Што хачу ад года 93-га?

Аднаго: каб стабілізавалася жыццё, каб Вярхоўны Савет і родны ўрад, якім мы даваяраем, спыніў нарэшце галоп цэн. Такі галоп можа загнаць людзей да смерці, як дрэнны гаспадар заганяў шчырых коней, калі не даваў ім пярэдыху.

Уладзімір АСТАПЕНКА,

намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь:

— Кожнаму чалавеку, якога б веку ён ні быў, якой бы справай ні займаўся, уласціва напярэдадні новага года падсумоўваць пражытае.

Чым для мяне быў год 1992? Дарэчы, высакосны... У агульным плане ён быў, як ніколі, насычаны важнейшымі падзеямі, звязанымі са станаўленнем якасна новай дыпламатыі, якую пачала праводзіць са дня абвяшчэння незалежнасці суверэнная Рэспубліка Беларусь. У асабістым — менавіта ў мінулым годзе я быў прызначаны намеснікам міністра замежных спраў. Займаюся консульскімі пытаннямі, пытаннямі дагаворна-прававымі, дзяржаўнага пратаколу, двухбаковых сувязей. Змест гэтай працы, мабыць, мала пра што гаворыць чалавеку недасведчанаму, але магу запэўніць — яна вельмі аб'ёмная, складаная і цікавая.

Летась мне давялося быць удзельнікам гістарычных падзей, такіх, як сустрэчы кіраўнікоў краін садружнасці (СНД), удзельнічаць у працы беларускіх дэлегацый у шэрагу замежных краін, у прыватнасці, у Празе, дзе Рэспубліка Беларусь была прынята ў якасці паўнапраўнага члена Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.

Вось, пункцірна, асноўныя вехі ў маім жыцці, якія я звязваю з 1992 годам.

У нашай прэсе, калі пішуць пра дыпламатаў, абавязкова пад крэсліваюць, якімі замежнымі мовамі яны валодаюць. Калі ёсць патрэба, магу задаволіць такую цікаўнасць — добра ведаю англійскую, іспанскую і польскую мовы.

Што яшчэ пра сябе? Жанаты, маю сямігадовую дачушку і двухгадовага сынка. Што чытаю? Для гэтага занятку выпадае, на жаль, вельмі мала часу. Апошнім часам захапіўся літаратурай па гісторыі Беларусі. Тут ёсць шмат чаго, што вартае глыбокага асэнсавання.

Як заўсёды, і Новы год, і Каляды буду сустракаць у цесным сямейным коле.

Віктар УЛАСЕНКА,

народны дэпутат Рэспублікі Беларусь, рабочы, член камісіі Вярхоўнага Савета па працы і сацыяльнай ахове:

— Новы год буду сустракаць дома, у Маладэчне, разам з сям'ёй і блізкімі сябрамі.

Што можна сказаць пра мінулы год? Запомніўся ён нейкай безнадзейнасцю, калі можна так сказаць. Хаця я па натуры не песіміст. Я ведаю, што гэты перыяд трэба перажыць, што жыццё самацэннае і пры любых умовах трэба перш за ўсё заставацца чалавекам. І гэта не мае словы. Яшчэ сто гадоў таму папа Леў XIII у сваёй энцыкліцы пісаў, што чалавек з'явіўся раней за дзяржаву.

Я ўсё-такі вельмі спадзяюся, што ўсе пастараюцца помніць — усе мы людзі, і ставіцца адзін да аднаго трэба так, каб мы адчувалі сябе людзьмі.

Ці магу я аддзяліць сябе і сваё будучае ад будучага нашай дзяржавы? Зразумела, не. Наогул, я лічу, што мне ў нейкай меры пашчасціла — не сакрэт, што людзей майго сацыяльнага становішча вельмі мала патрапіла ў гэты Вярхоўны Савет. А ў будучы, як мне здаецца, не зможа патрапіць ужо ніхто з рабочых. І што мяне вельмі трывожыць — нават і ў цяперашнім Вярхоўным Савеце надта лёгка праходзяць папраўкі да законаў (у Кодэкс законаў аб працы, напрыклад), якія абмяжоўваюць правы працоўных. І не толькі рабочых. Прытым, што лідэры розных партый, парламентарыі ўвесь час гавораць, што яны павінны абараняць інтарэсы жыхароў рэспублікі, на практыцы гэта чамусьці не вельмі атрымліваецца. Магчыма, спрацоўваюць нейкія карпаратыўныя інтарэсы?

Я не належаў і не належу ні да адной з партый ці фракцый. Некалі, праўда, хадзіў на пасяджэнні дэмакратычнага клуба. А сёння мяне асабіста засмучаюць як праект закона аб выбарах, распрацаваны апазіцыяй БНФ, так і законапраект Партыі народнай згоды.

Вось такія, мабыць, не вельмі святочныя ў мяне думкі...

Ігар САВІЦКІ,

інспектар ДАІ Заводскага р-на г. Мінска:

— Святкаваць Новы год збіраюся на працы, мне якраз выпадае дзяжурства. Але чамусьці бліжэй да душы Каляды, таму што яшчэ з дзяцінства памятаю, як упрыгожаныя, з зоркаю хадзілі па нашай вёсцы калядніки, заходзілі ў хаты, віншавалі, спявалі калядныя беларускія песні. Самому калядаваць не давялося, бо пазней, калі я ўжо вучыўся ў школе, нам гэтае забаранялася — тым больш, што бацька мой быў партыйны, да таго ж — настаўнік. А навучыцца хацелася б, ды ў гарадскіх умовах, мяркую, выглядаць гэта будзе, мякка кажучы, па-бутафорску...

Сваю рэспубліку я хацеў бы бачыць незалежнаю, як шмат вякоў назад, моцнай дзяржаваю, перад якой схілялі галовы Еўропа, Масква і іншыя. Лёс свой, вядома, бачу неадлучным ад лёсу сваёй радзімы. Яшчэ хацелася б, каб беларусы вярнуліся да сваёй мовы, на якой размаўлялі нашы продкі і ад якой мы чамусьці адвярнуліся. Як прыемна бывае, калі на сваёй працы, размаўляючы з людзьмі на роднай мове, чуць у адказ гэтую ж мову! Наколькі мне вядома, з новага года міліцыя збіраецца перайсці на беларускую мову. Хацелася б верыць, што так яно і будзе...

Асабіста хацелася б, каб у новым годзе трохі больш шэнціла, але гэта ўжо між іншым. А «ЛіМу» жадаю быць і надалей «ЛіМам».

ЗГАДКІ Канстанцыі БУЙЛО

Да 100-годдзя з дня нараджэння

100 гадоў з дня нараджэння Канстанцыі Буйло... Здаецца, яшчэ зусім нядаўна ўсе мы адчувалі яе прысутнасць у літаратуры, а даследчыкі з задавальненнем звярталіся да Канстанцыі Антонаўны, калі неабходна было ўдакладніць звесткі аб пэўных падзеях — як на пачатку нацыянальнага Адраджэння, так і ў дваццатыя-трыццатыя гады. Хаця — чаму адчувалі? Яна ў гісторыі нацыянальнай культуры засталася назаўсёды. Пра гэта сведчаць і публікацыі, якія мы прапануем чытачу.

Больш як дзесяць гадоў я ліставаўся са старэйшай беларускай паэткай. Разы два наведваў яе ў Маскве. Цікаўнасць да аўтаркі «Курганнай кветкі» была зразумелая: Канстанцыя Буйло — сучасніца Купалы, Коласа, Багдановіча, Цёткі, Максіма Гарэцкага, Язэпа Драздовіча, Старога Уласа, Ядвігіна Ш. На яе вачах пачынала адраджацца нацыянальная культура, тварылася наша гісторыя. Таму хацелася як мага больш даведацца ад яе пра мінулае дый удакладніць з летапісу самой пясняркі. У кожным лісце — і пры сустрэчы — я пытаўся пра штось канкрэтнае, што магло прыдацца нашай гісторыі, літаратуразнаўству. Паэтка заўсёды (праўда, часам з крыўдаю, што яе абцяжарваю пытаннямі, а ёй нездаровіцца, няможацца і нялёгка ўспамінаць тое, што было шмат гадоў) нешта згадвала.

Вось, прыкладам, што пісала Канстанцыя Антонаўна 12 красавіка 1976 года:

«Дарагі Уладзімір Ільіч! Вельмі дзякую за кніжку пра Багдановіча, якая мне прыпомніла людзей, якіх я блізка знала і з якімі дружыла: Змітрок Бядуля, Бурбіс і іншыя. З Максімам Багдановічам у мяне не было ні дружбы, ні знаёмства. Мы толькі раз сустрэліся на якойсьці вечарынцы ў карысць чагосьці ці кагосьці, дзе была і Цётка. З гэтага вечара я памятаю адно, што там было шмат студэнтаў і я цешылася вялікім поспехам, мяне вёў рукавод танцаў і за мною спяшаліся пары з крыкам: «Мы за паэтэсай; мы за паэтэсай!» Вось і ўсё, што я помню аб гэтай сустрэчы.

Драздовіча я ніколі не бачыла. Ён пісаў мне аткрыткі і пісьмы і ў кожным прысылаў цудоўныя віньеткі пяром з ізвілістых рысак. Гэта было вельмі прыгожа зроблена. Зместу пісьмаў, вядома, не помню. Ён мне прыслаў скульптуру — бюст Скарыны з гліны, памаляваную фарбамі, і краціну, напісаную алеем: шырокая дарога, адвіваючая шар зямны, зялёны, змешчаны злева карціны, а далей радужныя сферы, перасякаючыя спачатку вельмі шырокую звілістую дарогу, — а потым, да далягляду, усё вужэйшую і на апошняй сферы — белы з прозеленню горад, узнікаючы на фоне цёмна-зялёным — як мара, як прывід. Усё гэта захоўвалася ў мяне. Калі была першая ВДНГ, я занесла гэтыя рэчы ў беларускі павільён, дзе яны і засталіся, ужо не маючы першапачатковай прыгажосці; гліна патрэскалася, краскі на карціне выцвілі.

Вершы мы пісалі ўсе: і я, і Эдзя, і Стася. Стася пісала па-польску, я і Эдзік па-беларуску. Адзін верш Эдзіка «Ой ты, лес зялёны» я дарабіла, і ён паслаў яго ў «Нашу Ніву» — ён быў там надрукаваны. «Хвоя» напісана з натуры, на нашым полі расла высокая хвоя, у жыце яна здавалася без ног. Гэтая бездапаможнасць адзінокай хвоі дала тэму для верша. Болей Эдзік чамусьці вершаў не пісаў.

Мама і тата ганарыліся маімі поспехамі, асабліва, калі прыслалі «Нашу Ніву» з надрукаваным вершам. А потым сталі рэгулярна прысылаць нам «Н. Ніву». Мне куплялі тоўстыя сшыткі для вершаў, далі скрынку з замком, дзе я складвала мае сшыткі і зачыняла на замок, каб быць упэўненай, што ніхто не ўлезе туды і не знішчыць маіх рукапісаў. Калі я пісала, ніхто, і мама ў тым ліку, не падыходзіла да мяне і не пытала, што ты пішаш. Бо інакш я скардзілася, што ў мяне перабілі думку і я больш не магу дапісваць пачатае. Мама вельмі любіла, калі я заканчвала верш, я чытала ёй першай, што ў мяне напісалася.

«Сягонняшнія і даўнейшыя», як і «Кветка папараці», ставіліся ў Мінску, мне аб гэтым гаварыў акцёр Мацарэвіч (?). Калі — не пыталася. Гэта, можа, помніць Станюта. Я ніколі не бачыла іх у пастаноўцы. «Сягонняшнія і даўнейшыя» маюць прататыпамі Юрку Скробаўскага, памешчыка, у якога я гатавала ў гімназію сына, Толю Дзеўчапольскага, ён забараняў мне падаваць руку швачцы і эканому і вельмі ганарыўся маім выбухам: «Luduwkolestem» і буду вітацца з народам — так як гэта адпавядае маім поглядам.

«Кветка-папараць аснавана на легендзе аб кветцы шчасця...»

Найкаштоўны ліст! Найкаштоўныя ў ім звесткі! Больш нідзе мы не можам вычытаць такіх шчырых сардэчных радкоў пра першыя, трапяткія крокі К. Буйло ў літаратуру, як у гэтым лісце. Гэта было адно з самых шчырых, з самых сардэчных паэтычных пасланняў. Звычайна ж на мае пытанні яна адказвала коратка, лаканічна, але вельмі агніста, ёмка, нібы словы красала крэсівам.

Вось так, як у гэтым лісце — пра свае літаратурныя шляхі і шлях яе літаратурнага апекуна Янкі Купалы:

«Масква. 19.1.74.

У мяне свой шлях — у Купалы свой, у творчасці яны не супадаюць. Вызначыць Купалу адным маім вучыцелем не адпавядае сапраўднасці. Вучыцелямі маімі былі, ёсць і будуць: Адам Міцкевіч, Славацкі, Пушкін, Лермантаў, Шаўчэнка, Канапніцкая і шмат-шмат іншых паэтаў. Паміж іх, вядома, Купала і Колас. Нас больш як праца яднала жыццёвая дружба, якая вязала мяне з Уладкай і Янкам. Уладка была для мяне сястрой, маці, падругай, адданым таварышам. Яна лічыла мяне зусім сваёй, роднай і блізкай сабе сяброўкай. У мяне ёсць пісьмо, дзе яна піша: «Ты самы блізкі мне чалавек на свеце». А купаць мяне ў бляску славы Купалы — не трэба!

Каметы трацяць астаткі свайго святла, калі набліжаюцца к сонцу. Не хачу быць такой каметай. Пры жыцці кананізаваць мяне не трэба — а ну саграшу... Пасля маёй смерці пішыце, што захочаце, тады мне будзе ўсё роўна».

Гаворку пра Купалу мы пачыналі не адзін раз. Якраз той парой я збіраў звесткі пра творчы лёс Купалавага шэдэўра «А хто там ідзе?» У К. Буйло пра гэты твор былі свае меркаванні.

«15.1. 75.

Паважаны Уладзімір Ільіч!

Прачытала Ваш артыкул пра верш Купалы: «А хто там ідзе?» Артыкул добры, але мяне, як заўсёды, ударыла па сэрцы «праўка» якогасьці рэдактара радка верша. У Купалы было ў песенна былінным стылі, так гарманічна гучаўшым у гэтым славутым вершы: «На ў крыві руках, на ў лапцях нагах», а нейкі рэдактар «паправіў» — «На руках у крыві, на нагах у лапцях», што выпала з гармоніі верша, што стала для маіх вушэй, чутых верш ад Купалы, — празаізмам недапушчальным. Як выясніць, хто дапусціў такую праўку, якая гранічыць з вандалізмам?»

Канстанцыя Антонаўна не любіла, каб пра яе пісалі, гаварылі, была вельмі раўнівая да розных даследніцкіх прац пра паэзію. «Паэзія, — казала яна, — гэта ўзлётная мара. На ёй будаваць даследчы матэрыял — гэта будаваць гмах на пяску. Засцерагаю, не рабіце гэтага, будзе не сур'ёзна». І ўсё ж пра пэўныя канкрэтныя рэчы яна расказвала, распавядала. Прынамсі, пра беларускую кнігарню ў Полацку. Я пачуў вось што:

«Найперш за ўсё вы павінны добра ведаць, што нам, тагачасным пісьменнікам, даводзілася займацца не толькі творчасцю. Мы рабілі ўсё, што вымагалі ад нас час, эпоха. Стваралі харавыя і драматычныя гуртки, бібліятэкі, кнігарні... Вось так я і патрапіла ў Полацак. Кнігарня ў Полацку была даволі ладная і бадай ці не першая такая на Беларусі. Памятаю, калі я пагадзілася ехаць у Полацак, Цётка схапіла парывіста маю руку, пацалавала яе, нібыта я што гераічнае зрабіла. Знаходзілася кнігарня ў цэнтры горада, недалёка ад сабора. Як называлася вуліца — не памятаю. Кнігарня праіснавала толькі адно лета і сышла вайною 1914 года. У вайну ў ёй размяшчаўся шпіталь. Кніжні ж былі спакаваныя і адпраўле-

«БЕЛАРУСЬ Я ЛЮБЛЮ САРДЭЧНА, ГЛЫБОКА, ЗАЎСЁДЫ...»

Я не ўпершыню сустракаюся з Сымонам Яўхімавічам Шпіленем і заўсёды здзіўляюся, колькі ў яго, ужо далёка не маладога, захавалася энергіі і цеплыні, колькі любві да роднага краю, да айчыннай культуры, літаратуры. Асабліва любіць Сымон Яўхімавіч Янку Купалу. Прыязджаючы ў Мінск, ніколі не абмінае ён музея паэта. Музею падараваў ён самую дарагую рэліквію — аднатомнік «Выбраныя творы» Янкі Купалы, выдадзены ў Маскве ў 1943 годзе на рускай мове, які Сымон Яўхімавіч набыў у блакадным Ленінградзе і з якім ён прайшоў усе дарогі вайны. Напісаў успаміны пра дзве незабыўныя сустрэчы з паэтам.

Жыве Сымон Яўхімавіч у Санкт-Пецярбурзе, працуе ў С.-Пецярбургскім педыятрычным інстытуце. Прафесар, доктар біялагічных навук.

Неяк мы сустрэліся зноў. Сымон Яўхімавіч ехаў наведаць сваю родную вёску Языль Старадарожскага раёна, а затым збіраўся на Свіцязь — любімае месца адпачынку. На гэты раз размова была пра Канстанцыю Буйло. Ён расказаў, як, пачуўшы пра святкаванне 75-годдзя з дня нараджэння паэтэсы, захацеў павіншаваць яе з юбілеем. Напісаў ён такое вось шчырае і адкрытае пісьмо:

«Дазвольце прасіць Вас, дарагая Канстанцыя Антонаўна, да тых шматлікіх віншаванняў, якія Вы атрымалі ў дзень Вашага слаўнага юбілею, далучыць і маё.

Прайшло больш за сорак год, калі нам, дзецям палешукоў, школьны настаўнік прачытаў верш «Люблю», а потым «Ці помніш ты?» З той пары матывы «Курганнай кветкі» суправаджаюць мяне па ўсіх дарогах жыцця, яна побач з «Курганам» Я. Купалы, «Новай зямлёй» і «Сымонам-музыкам» Я. Коласа. Я пранёс іх у сваім сэрцы праз гады вайны, блакаду Ленінграда, не забываю і цяпер.

Я нарадзіўся і правёў юнацтва на берагах Арэсы, якую з такой любоўю апеў Янка Купала. Мне падабаюцца Вашы артыкулы і вершы, дзе Вы з пяшчотай і цеплынёй гаворыце пра вялікага беларускага песняра. Няхай доўга гучыць Ваш звонкі і задушэўны голас пяснярки роднай прыроды, выразніцы думак

ны ў Вільню. Паклапаціўся пра гэта Ластоўскі. Гэта была нашаніўская кнігарня. Чым я там займалася? А ўсім. Прадавала кніжкі. Памятаю, было шмат беларускіх календароў... Пасля 1905 года людзі праглі друкаванага слова... А я ж прадавала не толькі беларускія кніжкі. Былі там кніжкі і іншых аўтараў пра Беларусь, па-польску і па-руску. Заходзіла ў кнігарню пераважна моладзь: семінарысты, гімназісты, курсісткі. Заходзілі і салдаты. У Полацку ў тую пару шмат было салдатаў. Сярод іх былі і беларусы. Іх таксама брала цікавасць, што гэта за беларуская кнігарня і што ў ёй прадаецца. Упершыню ж такая кнігарня з'явілася на свет. І заходзілі. Мяне там вельмі паважалі... Я ж была не проста прадавец... На мяне ўсе глядзелі як на літаратара... На паліцах стаяла і мая «Курганная кветка»...

Шмат пра што хацелася распытаць паэтку, але яна амаль у кожным лісце напрамілы Бог прасіла «не варушыць попел»: «Навошта калупацца ў маім жыцці? Каму гэта патрэбна, з кім страчалася, з кім кахалася, што абедала? Пішыце лепей пра маю творчасць, пра мае творы, калі яны чаго вартыя. Там уся мая душа, там усе мае парыванні...»

І ніякія довады не пераконвалі яе. Я далучыў да гэтага клопату Зоську Верас, якая лічыла, што абавязак старэйшых — падзяліцца ўсім з малодшымі, каб не згінула наша гісторыя. Але і ў лістах да Зоські Верас Канстанцыя Антонаўна пісала тое ж самае:

«Москва. 20.1.81.

Дорогая, родная моя Людвика Антоновна! Чем дальше я с Вами переписываюсь, тем больше проникаюсь симпатией и уважением к Вам и за Ваше отношение со мной и с людьми, с которыми Вы ведете переписку. Я люблю писать письма, но только тем, кто близок мне по духу, кого я признаю достойным почитания за его правоту, чистоту и благородство. Лицам, уронившим в моих глазах ложью, изворотливостью деляческой, неблагородством — я не умею прощать и моя неприязнь к ним органично непреодолима. Есть у меня такие «корреспонденты», на чьи письма я не отвечаю и не буду отвечать, как бы они меня ни обхаживали сворой своей — как оленя на охоте — олень уйдет, он силен, благороден и правдив.

Это предисловие ни к чему, просто сорвалось с языка. Простите, написала сегодня уже несколько писем по-русски, потому автоматически пишется так. А теперь обнаружила это и продолжаю по-белорусски.

У маім двухтомніку ёсць карэспандэнцыя, паэма, прысвечаная Уладцы і Купалу. Маю надзею, што кнігі выйдуць к юбілею. Новых успамінаў пісаць не буду. Усё, што памятала, напісала, а новых стрэч, на вялікі жаль, не было. Іх не стала, Цяпер Дыяна Чаркасава піша кнігу пра мяне вялікую... Столькі ёй не падняць, тым больш, што я арганічна не магу расказваць пра сябе. Я лічу, што ўсё — на што мае права чытач — гэта вершы, якія я напісала. А мой быт, маё асабістае хай чытае ў вершах, тым больш, што яны аўтабіяграфічныя ў сваёй большасці. Хоча яна пісаць аба мне, хай піша аб маёй працы. А заглядваць у маё асабістае «я» нікому не магу пазволіць. Бывала, Уладка часта ў кампаніі звярталася да мяне: «А помніш, як мы..?» І я заўсёды гаварыла ёй: «nie ruszaj popilów». Гэта мне здавалася, як быццам мяне раздзявалі публічна. Яна ведала гэта і зараз жа кідала гэтую тэму. Так гэта засталося і да сягонняшняга дня. Можа, гэта мая асаблівасць, але лічыцца з ёй трэба, раз яна ёсць. Усякая цікавасць да майго асабістага жыцця прыносіць мне сардэчны боль. У вершах я больш адкрытая. Там лёгка пішацца тое, што было і што ёсць, бо пішу сама і перада мною не сядзіць журналіст і не ацэньвае тут жа, на маіх вачах, аб чым я гавару. А я перажыла шмат непераносна цяжкага ў жыцці. Не гаворачы ўжо аб тым, што па нашаму пакаленню праехалі цяжкія калёсы трох войнаў і... ненавісны культ. Гэта трэба перажыць, каб зразумець, што гэта такое. А мы перажылі. А новае пакаленне пасвойму разумее перажытае намі і ніколі не ўспрымае так, як гэта было сапраўды. Нас прывучылі цярпець і маўчаць — так мы і змоўклі навек...

Ну вось і напісала цэлы ліст — хоць і мала змястоўны. Але ўражанняў няшмат. Шмат радасці дае літаратура, якую заўсёды прывозіць сын, і цвятны тэлевізар, які дае агляд свету, прыроды, любімага мною мора... Гэта вялікае акно ў свет...»

У маім архіве каля пятнаццаці лістоў і паштовак ад аўтаркі «Курганнай кветкі». У іх віншаванні са святамі, водгукі на розныя кніжкі, публікацыі і вельмі мала асабістага, свайго. І ўсё ж і яшчэ ў адным з лістоў можна вылушчыць колькі грамадска значных радкоў, фактаў. Неяк я пацікавіўся, ці запомніўся і як Канстанцыі Антонаўне дзень абвяшчэння БССР (пра Беларускую Народную Рэспубліку я тады мала чаго ведаў і чуў). У тым жа лісце было і такое пытанне: «Вы не заканчвалі аніякіх беларускіх школ, не было ў тую пару, калі пачыналі творчы шлях, і беларускіх граматык. Тым не менш, калі чытаеш «Курганную кветку», адчуванне такое, што Вы скончылі класічную беларускую гімназію, такое ў ёй моўнае суладдзе. Як гэта вам удавалася без граматыкі і школы?»

Адказ на гэтую маю трошкі наўмысную наіўнасць быў такі:

«18.III.1976.

Дарагі Уладзімір Ільіч!

Ізноў пытанні! Ну які ж Вы не ўтаймаваны! Як пісалася? А так, як гаварылася. Ніякіх цяжкасцяў не было. Народ гаварыў аб усім, што яму даводзілася перажываць, не адчуваючы недахопу слоў. Мы таксама пісалі, ведалі граматыку рускую, я і польскую, гэта давала агульнае паняцце, — а далей чыстая фанетыка.

1919 год я спаткала пад Масквой. Абвяшчэнню Беларусі была вельмі рада. Пра гутаркі і дэталі, вядома, нічога не помню. гэта было так даўно.

Вельмі дзякуючы, што не забываеце мяне і часам штосьці маё гучыць па тэлевізіі.

Аб Цётцы я пісала ўспаміны па просьбе т. Арабей і выслала ёй. Копіі сабе не пакінула. Калі Вам гэта зручна, звярніцеся, калі ласка, да яе — і Вы атрымаеце тое, што я змагла напісаць аб ёй. Я сустракалася з ёй мала і тады не прыдавала ніякага значэння гэтым сустрэчам. Яны былі звычайнай з'явай. Я Цётку лічыла агітатарам, рэвалюцыянерам, але не паэтэсай. Вершы яе гучалі для мяне ў ключы рэвалюцыйным, а не паэтычным. Тады гэта так лічылася. Жанчына яна была прыгожая, мілая і зусім звычайная. На мой погляд, тады яна нічым не вылучалася ад іншых. Можа таму што я навогул мала яе знала.

Лучанку я пасылала сваю кніжку, па просьбе Уладкі. Але ён нічога мне не адказаў і нічога не знайшоў здатнага пакласці на музыку. Рада, што Вы пішаце пра Талаша. Гэта цікава навогул — бо ж там і партызанскі рух Беларусі. Даруйце, што на пытанні адказваю коратка і лаканічна. Мне трудна пісаць аб беларусах і Беларусі, калі я там не была з 1916 (толькі наездамі). Усё тольні ў настроях і пачуццях, а гэтага мала, каб пісаць. Паслала успаміны аб Лынькову — Софіі Захараўне, — і вельмі баюся, што дзе-небудзь укралася памылка. Трэба факты, даты, абставіны. А ў мяне нічога гэтага няма...»

І ўсё ж я — дый, пэўна, не адзін толькі я — заахвочвалі паэтку пісаць кнігу сваіх успамінаў. На гэтую прапанову яна казала: «Яно і трэба было зрабіць. Але я, пэўна, не змагу. Для гэтага патрэбны факты, архівы. А ў мяне няма ні аднаго, ні другога. Толькі пачуцці. А з гэтага кніжку не напішаш».

Гэтая гаворка змусіла мяне нічога не прапускаць з таго, што мела ў старым друку хоць якое дачыненне да аўтаркі «Курганнай кветкі». У «Нашай Ніве» за 1910 год напаткаў колькі яе невядомых і малавядомых твораў. Знайшоў цікавы допіс з Вішнева пра наведванне мястэчка кітайскімі знахарамі-шарлатанамі. Допіс падпісаны вельмі проста і міла — Кастуся Буйло. Друкавала свае вершы паэтэса і ў Жылуновічавай «Дзянніцы» (№ 4, 1916 г.). Там жа апублікаваны і яе цікавы ліст:

«Паважаная Рэдакцыя! Не ведаю, кім прысланыя з'явіліся да мяне два першыя нумары «Дзянніцы» і «Swietacy». Знайшлі яны аж у сяродку Маскоўшчыны і ўскалыхнулі так міла душу, што не магу стрымацца — каб разам з творамі, каторыя пасылаю да друку, — не напісаць некалькі слоў шчырага прывету Працаўнікам і Арганізатарам новых газет.

Жадаць Вам хочацца многа... Няхай жа «Дзянніца» і «Swietac» асвечваюць мрокі стогнучай пад цяжарам крывавых дзён — Старонкі Роднай, — хай мрок асвеціцца надзеяй, што лепшыя часы недалёка, а на небе, як знак гэтага, хай залунае «Дзянніца», асвятляючы ўвесь, што ні ёсць, шырокі прастор Краю Беларускага. Хай газеты гэтыя будуць жывым адбіткам душы й думак — і ўсяго перажытага Народам, — хай усё, што жывога ў нас і балючага адсвеціцца ў іх праменнях, хай пакажацца на свет — і супольнымі сіламі пастараемся лячыць свае раны — свае балючкі.

Як аглушаная цяжкім няшчасцем — калі на яе разлогах палілася гарачая кроў, калі сыны Яе, разагнаныя па ўсім шырокім свеце навальніцай вайны — пагубляліся між суседзямі і чужынцамі — і грамады працаўнікоў, прызваных у рады ваякаў, пайшлі бараніць гасударства ад напаснікаў — змоўкла Беларусь...

Здавалася час нейкі, што патоп крывавы, заліўшы Яе разлогі, затапіў сілу і думы — і душу народную, — заліў рады сяўноў на родных нівах — знічтожыў усё...

Але... Адзін ляжыць — сто ідзе.

Бо хто ж роўны грамадзе...

І вот загаварыла Яна зноў... Хай жа голас Яе дойдзе ва ўсе кутні найдалейшыя — хай зварухне ўсе сэрцы, зграмаздзіць усе думы ў сабе — хай стане поўным голасам Краю і Народа!

Дык хай жа адгукнуцца Таварышы — мастакі слова і душы, хай адклікнецца дзе хто ёсць: ці то ў радах ваякаў, ці там у Краю, ці дзе на чужыне. Бо мрок яшчэ густы, страшны, — распаліць жа трэ на ўсю моц светачы нашы — каб ясней зрабілася наўкола.

Шчыра жадаючы вытрываласці і еднасці ў працы вялікай — астаюся.

Канстанцыя БУЙЛО.

ст. Шахаўская

Маскоўскай губерні».

Вось такая была ў маладыя гады аўтарка «Курганнай кветкі» — палітычна няўрымслівая, турботная за лёс Роднай Старонкі, за яе расцярушаныя творчыя сілы. Асоба яе — гэта бясспрэчна — найперш мае для нас цікавасць з часоў нашаніўскіх. Там яе ўзлёт душы, там яе ўсе грамадскія парыванні. Далейшае яе жыццё паза Беларуссю было драматычным. Мне цяжка ўявіць сябе на яе месцы. Беларуская паэтка, а жыве далёка ад Беларусі. Піша беларускія вершы і не чуе, як яны шырацца ў родным народзе. Напісала драматычныя абразкі, іх ставіў мінскі драматычны калектыў, а яна ніколі не бачыла іх на сцэне. Цяжка, немагчыма жыць, не ўяўляючы будучыні краю. А яна жыла. Пра жыццё Беларусі мела ўяўленне праз ліставанне і кароткія сустрэчы з землякамі. Яны яе жывілі, давалі ёй толькі пэўнае ўяўленне пра трывогі і клопаты нашага краю. Але ўсіх трывог, здаецца, яна ўжо не адчувала. Да многіх, хто завітваў да яе ўпершыню, мела насцярожанасць. На шчасце, ніхто гэтай насцярожанасці не адчуваў. Паэтка заўсюды з усімі была ветлівая, гасцінная. Але пасля такіх сустрэч яна насіла ў сэрцы пакутлівы цяжар: «Хто быў? Дзеля чаго? Хто лез у душу, у мой свет?»

У трыццатых гадах быў рэпрэсаваны яе муж. Меч рэпрэсій вісеў і над ёй, і яна мусіла была надоўга прытаіцца з усёй сваёй беларушчынай. Паэтэса становіцца мантажніцай, абмотчыцай цэха лабараторнага абсталявання аднаго маскоўскага завода. Іншага месца для таленту ў «вольнай» краіне, у «златоглавой» Маскве не знайшлося...

У 1915 годзе К. Буйло, паводле паведамлення беластоцкай «Нівы» (1.IV.1990 г.), уваходзіла ў канспіратыўны Беларускі нацыянальны камітэт. Гэты камітэт ставіў за мэту стварэнне беларуска-літоўскай незалежнай дзяржавы, праект якой распрацаваў Антон Луцкевіч. Пра гэты факт пісьменніца ніколі не згадвала. Але ён значыўся ў дакументах, прынамсі ў «Кароткім абрысе беларускага пытання» (Варшава, 1928 г.). Членамі згаданага камітэта былі браты Антон і Іван Луцкевічы, Буйло, Гарэцкі, Родзевічы, браты Станкевічы, Павел Аляксюк, Сянкевіч... Адзін толькі пералік імёнаў, суседства іх з прозвішчам Буйло шмат чаго значыла на той час.

Ці не трагедыя — напісаць, сказаць «Люблю мой край, старонку гэту»... і не жыць у гэтай старонцы, баяцца расказаць пра сваіх блізкіх паплечнікаў? Ды што там расказаць — проста згадаць іхнія імёны — і то быў страх.

У такой рэчаіснасці жылі нашаніўскія беларускія адраджэнцы.

Многія з іх гэтак і пайшлі з жыцця ў нямым здзіўленні: «Што ж адбылося? Чаму гэта так: той, хто мае права на вечную памяць, кінуты на забыццё?»

Уладзімір СОДАЛЬ.

і спадзяванняў свайго народа. Дзякуй Вам.

Палкоўнік медыцынскай службы, прафесар Сямён ШПІЛЕНЯ.
15.2.74 года».

Вядома ж, ніякага адказу на пісьмо Сымон Яўхімавіч не чакаў. І якое ж было яго здзіўленне і радасць, калі неўзабаве ў паштовай скрынцы знайшоў пісьмо ад самой Канстанцыі Буйло. Не, гэта была не нейкая адпіска на віншаванне незнаёмага чалавека, а шчырае, сардэчнае, поўнае ўдзячнасці слова паэтэсы, якую ўсхвалявалі прызнанні былога франтавіка. Пісала яна як блізкаму па духу чалавеку, з усёй паўнатой пачуццяў. Сэрца адгукалася сэрцу. Добрае слова не забываецца. У дзень Перамогі паэтэса прысылае Сымону Яўхімавічу віншавальную паштоўку, таксама нестандартную, поўную чалавечага цяпла і дабрыні.

І пісьмо і паштоўку Канстанцыі Буйло Сымон Яўхімавіч Шпіленя бераж як дарагія рэліквіі. Падаю іх з яго дазволу ў сваім перакладзе з рускай мовы.

«Масква, 25/II-74

Дарагі Сымон Яўхімавіч!

Мяне глыбока кранула Ваша шчырае, ласкавае і цёплае віншаванне. Я вельмі не люблю юбілеяў. Вельмі не люблю іх напышлівай велічнасці і ўсіх звязаных з гэтым хваляванняў. Маё 60-годдзе я сустрэла ў Мінску, на з'ездзе пісьменнікаў. Памятаю, я ўсё старалася ператварыць у жарт, адмахнуцца ад прамоў, падарункаў, кветак і інш. Гэта мне больш ці менш удавалася. Сямідзесяцігоддзе было значна больш шумнае і ўрачыстае. Праўда, у СП, у Маскве ў Канферэнц-зале на ўрачыстым пасяджэнні — прысутнічаў мой партрэт і мой... муж. Якраз у гэты дзень я ляжала на аперацыйным стале — мне рабілі цяжкую аперацыю, якая працягвалася каля 6-ці гадзін. Пасля аперацыі мяне літаральна завальвалі тэлеграмамі, пісьмамі, адрасамі, і гэта ўжо не смешыла і не раздражняла, а кранала і хвалявала. Нейкая ласкавая цёплая хваля любві і ласкі мякка ахутвала мяне, аслабелую і спакутаваную — і мне здавалася, што гэта Радзіма схіляецца да майго ўзгалоўя і ўлівае ў мяне сілы сваёй вялікай мацярынскай любоўю. Маё 75-годдзе застала мяне ў год капітальнага рамонту нашага дома. І зноў днём і ноччу пошта насіла мне шмат цёплых і сардэчных слоў. Былі адрасы ад многіх арганізацый, Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета. Але асабліва ўсхвалявалі школьнікі, якія прысылалі віншавальны ліст — а ў канцы, як уздых: «Дарагая Канстанцыя Антонаўна, мы вельмі любім Вашы вершы...» Гэта вельмі шчыра, нязмушана, без усялякага пафасу. Ваш ліст крануў мяне той жа сардэчнай шчырасцю. Дзякуй Вам за добрыя цёплыя словы. Пісьмо Ваша прыслалі мне з Мінска. Я з 1923 года жыву ў Маскве. Так склаліся абставіны. Беларусь я люблю сардэчна, глыбока, заўсёды. Але і Масква стала мне блізкая і родная. Тут уся мая сям'я, якая пераехала ўслед за мною ў Маскву, брат, сястра, сын, пляменнік, пляменніца. Тут пахаваны бацька і маці.

Моцна, па-сяброўску цісну Вашу руку.

Кан. БУЙЛО».

«Дарагі Сымон Яўхімавіч!

Сардэчна дзякуй за віншаванне з самым светлым, самым шчаслівым святам на зямлі — днём Перамогі. Памятаю, ноччу я прачнулася і здзівілася, уся Масква засвяцілася агнямі, забегалі людзі ў нашым доме па лесвіцах і загучала самае жаданае, самае патрэбнае слова — Перамога! Я стаяла каля адчыненага акна ададраўшы зацямненне і плакала наўзрыд, хоць выціснуць у мяне слёзы наогул нялёгка. Нібы ўзятае ў ціскі сэрца — вызвалілася ад гора і вылівалася слязьмі за тых, хто не вернецца, каб падзяліць з намі радасць здабытай народам Перамогі. Потым мы ўсе хадзілі па вуліцах Масквы, урачыста вітаючы адзін аднаго, знаёмыя і незнаёмыя адчулі глыбокую чалавечую сувязь паміж людзьмі планеты. Горача віншую Вас — воіна Савецкай Арміі, выказваю Вам глыбокую павагу і сардэчнае прывітанне. У нас капітальны рамонт дома. Дом фактычна разбураны ўсярэдзіне. Натуральна — сустрэча ў такіх умовах цяжкая. Але ж скончыцца гэта, і мы сустрэнемся абавязкова.

З прывітаннем яшчэ раз.

Кан. БУЙЛО.
Май 1974 г.»

Думаю, гэтыя два лісты дадуць нейкія новыя штрышкі да «біяграфіі душы» аўтаркі «Курганнай кветкі», той «кветкі», што ўзрасла некалі на ўдзячнай глебе «Нашай Нівы»!

Ніна ЦВІРКА.

Віншуем!

Яфіму САДОЎСКАМУ—85

Пісьменніку Яфіму Садоўскаму 4 студзеня спаўняецца 85 гадоў. Зычым Яфіму Ільічу здароўя, бадзёрасці, поспехаў!

Алесю ШАШКОВУ—70

Сваё 70-годдзе Алесь Шашкоў сустракае 3 студзеня. Жадаем Алесю Андрэевічу і надалей плённа працаваць у галіне прозы і нарыса.

Міколу ВАДАНОСАВУ—70

70 гадоў спаўняецца 4 студзеня празаіку Міколу Ваданосаву. З днём нараджэння, Мікола Міхайлавіч, далейшых поспехаў Вам!

НАШ КАЛЯНДАР

2 студзеня — 475 гадоў з дня выдання Ф. Скарынам у Празе кнігі «Еклесиастес или Сборник премудрого царя Соломона».

●

13 студзеня — 400 гадоў з дня смерці гуманіста і асветніка, філосафа, гісторыка, паэта Сымона Будната. У Нясвіжскай друкарні, створанай ім, у 1562 годзе выйшаў «Катэхізіс» — першая на Беларусі кніга на беларускай мове.

●

21 студзеня — 175 гадоў з дня нараджэння Адама Кіркора (памёр у 1886 годзе) — выдаўца, публіцыста, этнографа, літаратуразнаўцы.

●

26 студзеня спаўняецца 80 гадоў з дня выхаду першага нумара штотыднёвай грамадска-палітычнай і літаратурнай газеты «Беларус». Выдавалася ў Вільні лацінкай да 30 ліпеня (12 жніўня) 1915 года. Друкаваліся творы А. Гаруна, А. Паўловіча, К. Сваяка і іншых пісьменнікаў.

●

29 студзеня — 115 гадоў з дня нараджэння (памёр у 1941 годзе) — публіцыста, літаратурнага крытыка Уладзіміра Самойлы. Быў настаўнікам і сябрам Янкі Купалы. Першым усебакова разгледзеў творчасць Казіміра Сваяка.

Уладзімір ВАСІЛЕВІЧ,

фалькларыст:

—Я—прадстаўнік сціплай, непрыкметнай прафесіі. Да нас рэдка звяртаюцца: калі некаму трэба правесці ці адзначыць нейкае свята. Вось і думаю: каму тваё слова можа аказацца цікавым, асабліва цяпер, калі столькі прэтэндэнтаў у лідэры, а з другога боку — адзіны ва ўсіх клопат: выжыць. Цешыць, што сярод гэтых «усіх» нямала набярэцца і такіх, якім важна не проста выжыць, а застацца чалавекам, захаваць у сабе духоўнасць. З якіх жа крыніц трэба чэрпаць нам, каб узбагачацца душой? Невераемна, але прайшоўшы сёння па ўсіх сталічных кнігарнях, мы не знойдзем ніводнае кнігі па фальклоры, ніводнага альбома па беларускім мастацтве, ніводнае беларускае пласцінкі. І гэта ў час, калі хваля нацыянальнага адраджэння ўзнімаецца як ніколі высока, калі сучаснік літаральна прагне ведаў па нацыянальнай культуры.

Апошнім часам я, не саромеюся прызнацца, не сядзеў склаўшы рукі. Вынік—у розных выдавецтвах у чаканні спрыяльных магчымасцяў ляжаць 6 маіх рукапісаў (некаторыя ўжо і з афармленнем і нават у карэктуры).

Збіраюся несці і 7-ы рукапіс—1-ы том вялізнага трохтомніка «Прыкметы і павер'і». Але разам з томам, каб ён быў узяты ў вытворчасць, я павінен прынесці ў выдавецтва... паўмільёна. Так яны ў мяне і былі!

Дык патрэбны мы і тое, што мы робім, камусьці ці не? Менавіта пачуццё ўласнай незапатрабаванасці прымусіла мяне сёлета адважыцца на змену працы. Акадэмія навук, дзе я адпрацаваў амаль 20 год, перастала ўспрымацца мною і многімі калегамі родным домам (і тым больш «храмам навукі»). Не хацеў бы выглядаць няўдзячным, дабро памятаю, але і не сказаць праўды не магу. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, як уяўляецца не аднаму мне, перажыў сваю лепшую пару. Адзіная мэта сённяшняга састарэлага кіраўніцтва—гэта ўтрымацца самім і, як падкрэсліў дырэктар, вядомы ўсім С. Марцалеў, «захаваць касцяк». Касцяк-то касцяком, аднак калі не нарошчваюцца на ім мышцы, калі не абнаўляецца кроў—які толк з яго? Вось і атрымалася, што кіраўнікі розных рангаў, трымаючыся з усіх сіл за крэслы і пасады (і немалыя аклады), нібыта бядуюць: «Няма каму перадаць эстафету!» Прабачце, але ж ці не яны самі ледзь не ўсё сваё працоўнае жыццё набіралі аспірантаў, выпускалі кандыдатаў (куды толькі яны падзеліся?), нарэшце, атрымлівалі за іх падрыхтоўку дзяржаўныя грошы і званні прафесараў? Мала хто са старэйшых можа пахваліцца сваімі вучнямі, сваёй школай. З абыякавасцю адміністратараў інстытута сутыкнуўся кожны, хто яго пакідаў. Ідзеш і ідзі, абыдземся. Не спадзяваўся, што такое ж пытанне паўстане і перада мною. Ну дзеля чаго пісаць гэтыя вымучаныя «планавыя тэмы»—каб пакласці ў шуфляду?

І вось я на іншай працы. Выкладаю фальклор у педагагічным інстытуце. Не мне меркаваць, што і як цяпер у мяне атрымліваецца, аднак калі я бачу нейкую ўвагу, зацікаўленасць маёй юнай аўдыторыі (ці хаця б асобных твараў)—я ўсцешаны. Значыць, некаму патрэбны. Патрэбны не я адзін. Нас, калег-фалькларыстаў, ужо не першы раз клічуць на навуковыя сесіі і канферэнцыі ў Польшчу; да нас звяртаюцца з Новасібірска і Уладзівастока з просьбаю супрацоўнічаць у складанні тома фальклору беларусаў-перасяленцаў Сібіры і Далёкага Усходу (дзе, дарэчы, мы таксама два леты папахадзілі-папаездзілі ў экспедыцыях).

Такі быў мой працоўны год—з трывогамі, клопатамі, радасцямі і расчараваннямі. Цяпер збіраю на фальклорную практыку сваіх студэнтаў-выхаванцаў. Пажадайце ім добрай дарогі!

Аляксандр КУЛЕШ,

падпалкоўнік, кандыдат гістарычных навук:

— Мінулы, 1992 год, для мяне, афіцэра, прафесійнага вайскоўца, чалавека, які нарадзіўся і вырас на Беларусі, памятны тым, што мая краіна, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, месяц ад месяца мацавала сваю дзяржаўнасць. Рэспубліка Беларусь як суверэнная дзяржава ўвайшла ў сусветную супольнасць.

Адзін з асноўных кампанентаў нацыянальнай незалежнасці — уласнае войска. Таму і праблемы, што ўзнікаюць у працэсе стварэння Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, так ці інакш датычаць усіх грамадзян рэспублікі. Зразумела, што праблемы гэтыя не могуць не турбаваць мяне і маіх аднадумцаў — сяброў Беларускага згуртавання вайскоўцаў.

Нашы намаганні, безумоўна, паўплывалі на ходу леташніх падзей. 18 сакавіка была прынята пастанова Вярхоўнага Савета аб стварэнні Узброеных Сіл Беларусі. Беларускае войска стваралася шляхам рэарганізацыі і перапарадкавання былой Беларускай ваеннай акругі, але вайскоўцы былой Савецкай Арміі не прымалі прысягі на вернасць беларускаму народу і ягонай дзяржаве. Складвалася парадаксальная і досыць небяспечная сітуацыя: заставалася ў сіле прысяга на вернасць СССР, а праваперaемнікам СССР абвясціла сябе Расія... Прысяга асабовага складу Узброеных Сіл РБ на вернасць Беларусі стала надзённай патрэбай. Сябры БЗВ звярнуліся з адпаведнай заявай да Вярхоўнага Савета, урада і грамадскасці Беларусі, распачалі растлумачальную працу ў сродках масавай інфармацыі. Прымаў ўдзел у гэтай справе і я. Нагадаю свой артыкул у «Звяздзе» за 14 сакавіка.

Асабіста для мяне самым памятным днём года было 8 верасня — Дзень беларускай вайсковай славы, прыняцце Вайсковай прысягі, тэкст якой быў зацверджаны Вярхоўным Саветам 11 студзеня 1992 года. У гэтым сімвалічным акце бралі ўдзел афіцэры БЗВ і вайскоўцы запасу.

І вось напярэдадні новага, 1993 года, 31 снежня з 10.00 увесь асабовы склад Узброеных Сіл РБ на чале з міністрам абароны будзе адначасова прыведзены да прысягі на вернасць Беларусі. Такім чынам будзе зроблены яшчэ адзін крок да стварэння сапраўднага беларускага войска.

Лічу выдатнай падзеяй мінулага года з'яўленне ў друку нарысаследавання «Забытая слава». Калі браць да ўвагі, што з самага пачатку 1993 года ў войску ў службовы час будуць праводзіцца заняткі па вывучэнні гісторыі Беларусі, а таксама беларускай мовы, дык гэты нарыс, у якасці метадычнага матэрыялу, вельмі дарэчы.

Ну, і ў новым годзе войска апранецца ў новую форму з нацыянальнай сімволікай, загучаць у шыхтах каманды па-беларуску. Але галоўнае — войска будзе ўмацавана за кошт карэнных грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Віктар ЧАРОПКА,

рэдактар часопіса «Хрысціянская думка», г. Мінск:

— Заўсёды, калі сустракаю Новы год, адчуваю гаркоту, шкадаванне ад таго, што, аказваецца, тое, пра што марыў, на што спадзяваўся, не спраўдзілася ў многім ці часткова. Шкада страчанага часу.

Іншая справа — Каляды — свята набыцця, бо мы ў гэты дзень віншуем Хрыста — збавіцеля чалавецтва, які ўсё ж прыдаў сэнс нашаму жыццю.

Ці ўмею я калядаваць, шчадраваць? Калісьці, у маленстве, здаецца, умеў. Цяпер, мабыць, забыўся. Шкада, што традыцыі згубіліся. Але нездарма кажуць, што паўтарэнне — маці вучэння. Таму вучыцца будзем ізноў.

На ваша другое пытанне адкажу так: я знаходжуся ў духоўнай апазіцыі з Рэспублікай Беларусь. Мой лёс ад лёсу рэспублікі не залежыць. Калі ён і залежыць ад кагосьці, дык ад Бога, які дае мне магчымасць, і ад мяне самога, які павінен гэту магчымасць выкарыстаць.

Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

Душы трывожная аповесць



●

Я прыеду, я вярнуся,
Я прыйду да плыткай рэчкі,
Дзе самотны белы бусел
Думу думае аб вечным.

Як і год, і два, і дзесяць,
Мо яшчэ з сярэднявечча,
Ён вартуе рэчку Бесядзь,
Думу думае аб вечным.

Я вярнуся, пакланюся
І яму, і нашай рэчцы,
Я з ім ціха пажуруся
І падумаю аб вечным.

Пакланюся, пажуруся
І ў тумане знікну заўтра...
Белы бусел, белы бусел —
Мой задумлівы сааўтар.

ТАМ

Відаць, і я старэю, брат,
Усё часцей гляджу назад.
Ты мне даруй за збіты штамп:
Усё часцей бываю ТАМ.

Там ходзяць вернікі у храм,
Так ходзяць грэшнікі на
споведзь,
Душы трывожную аповесць
Так давяраюць святарам.

Я ўсё часцей бываю ТАМ.

●

Пасля вуліц ды завулкаў,
Лабірынтаў гарадскіх,
Сніцца рэчанька, рачулка,
Кладкі, кладачкі, масткі.

Разам з ластаўкай ды каняй
Я на золаку ўстаю,
Як калісьці Янка з Маняй,
Свайго коніка паю.

І на беразе зялёным
Пазіраю з-пад рукі,
Ці не мые дзе Алёна
Пад вярбою ручнікі.

Так бы й плыў на аблачыне,
Каб не голас нечы: «Злазь!
Брат твой косіць канюшыну...»

Выбачай мне, братка Ясь.

ВАРЭНІКІ З ВІШНЯМІ

Апавяданне

Валянціна КУКСА

Валянціна Кукса жыве ў Брэсце. Працуе выхавацелькай у дзіцячым садзе. Друкавалася ў часопісе «Маладосць» і ў абласной газеце «Заря».

У прадмове да апавядання, якое сёння змяшчае штотыднёвік, яна прызнаецца: «Калі пісала апавяданне, не было намеру паказаць негатыўныя бакі нашага ладу, жыцця. Я ўспамінала рэаліі свайго дзяцінства, і цяпер, ужо ў сталым узросце, усё так і засталося мараю пра светлую будучыню, бы тыя варэнікі з вішнямі для маленькай Мілі. А чалавек? Што перашкаджае яму, чалавеку, па-чалавечы вырашаць жыццёвыя пытанні? Так і застаецца пытаннем».

1

ХАТА ДЗЕДА РЫГОРА ляпілася за раўчуком, на пагорку. Вялізны стары сад абнесены агароджаю з калючага дроту. Дрот у чатыры ніткі мацаваўся на старых хваёвых слупах. Слупы патрэскаліся ад дажджу і ветру, параслі шызаватым мохам. Але моцныя, бо са спелых смалістых хвояў.

Пасярод двара — калодзеж. Вада ў калодзежы заўсёды халодная і смачная. Стары Рыгор казаў, што выкапаў у добрым месцы, натрапіў на «жылу». Каля калодзежа процьма бочак і цэбраў, напоўненых вадою, каб не парассыхаліся. Тут жа стаіць доўгае карыта з цэльнага камля. З яго п'юць ваду і каровы, і авечкі, і гусі. Для гусей выгода. Паўсюдна вады колькі хочаш: і канава, і рэчка, і возера. Бывала, як прыйдуць на падворак, дык ён станавіўся белы.

— Аг-га! Каб на вас! — выходзіць заспаная Рыгорава дачка Гэля. Яна бярэ вядро і прастуе ў летнюю кухню. Набірае поўнае вядро варанай бульбы, абмешанай мякінай, і нясе ў гусятню, а тыя белым воблакам сцелюцца за ёю. Вядра мала. Гэля прыносіць яшчэ і яшчэ. Пакуль гусі ядуць, маладая гаспадыня пазірае на вялізную клуню. Там загарадкі для скаціны. Пад паветкаю, між пуняю і гусятняй, — залітыя бетонам ток. Тут малоцяць жыта. Далей на лужку стаіць пазалеташні стажок.

— Дзе ты там валэндаешся! — гукае Рыгор. Ён выходзіць на падворак. Гэля ўздыхае і моўчкі знікае ў дзвярах. Стары апіраецца на вароты і азірае сваю гаспадарку. У вачах сум.

Не так даўно ў калгас адрэзалі тое поле, што па-за клуняю і агароджаю. Па-за клуняю, аж да Мядзведжых хутароў была яго зямля. З таго боку Рыгор не гарадзіў. Для сябе лічыў, што гэта яго поле. Праўда, пасярод белага дня не асмельваўся, а ноччу ўжо гаспадарыў. Раслі там калгасныя буракі — буракамі завальваў усё, што можна было заваліць. Бульба — бульбаю. Лён — хапала тады лёну. Сляпая яго Тэкля напрадзе і натчэ

Міжволі Рыгорава вуха ўлавіла: «Цок-цок-цок, та-та. Цок-цок-цок, та-та...» Даносілася з суседавай кузні. Стары паглядзеў туды. «Зубяць сярпы. З жонкаю. Хіба для жанчыны работа ў кузні! Але спраўляецца. — Падумаў Рыгор пра Алесю, Пятрову жонку. — Не тое, што Тамаш з Віцем». Стары ўсміхнуўся ў пракураныя вусы, калі ўспомніў сваякоў. Тамаш неяк сам спрабаваў назубіць серп, а пасля расказваў Рыгору:

— І як гэто Алеся налаўчылася: цок-цок-цок і — гатова. Я ж кажу Віцю: Бі! — Б'е. Бачу: мелко. Кажу, бі яшчэ. Ляснe — прабівае палатно. І вот, спорчана. У Алесі такія зубочкі роўныя...

Каля кузні зашыпела: Пятро кінуў каваную нарыхтоўку ў вялізную каструлю, напоўненую вадой. Гартуе дэталь. З дзіркі пад дахам пыхнула сівым дымам, некалькі чырвоных іскрынак вылецела праз дзверы: патушыў горан. Ляснулі абцугі. З кузні выйшла Алеся. Сцягнула з галавы хустку, выцерла на ходу твар. Засунула хустку ў кішэню куфайкі, спрытна падхапіла пасмачкі валасоў і зноў закруціла іх у гульку. Заспяшалася ў хату. Трэба завідна ўправіцца. На асветленай сонцам сцежцы корпаецца малое. Гэта Міля. У Рыгора цяплее на душы, калі ён бачыць гэтае малое разважлівае дзяўчо. Міля падбягае да маці, працягвае рукі, зазірае ў вочы і нешта шчабеча. Алеся ўсміхаецца, і яны знікаюць за дзвярыма.

— Бог з імі, няхай жывуць, — думае Рыгор і паволі падаецца ў хату.

2

Маці ўвішна пачала рабіць прывычную работу. Дапамагалі

●

Я усё яшчэ пачую,
Я праз смех прайду і плач.
Мне зязюля пакукуе
І пакрумкае крумкач.

Я не раз прыйду у госці
Да бярозы і сасны.
Папрашу, каб на пагосце
Не журыліся яны.

Вось і зноў душу расчуліў...
А мне б лепей памаўчаць.
Мне б наслухацца зязюлі,
Мне б забыць пра крумкача.

АМАЛЬ ЖАРТ

Пакуль ламае крытык дзіды
І дзеліць нас на роды-віды,
На гарадскіх ды на вясковых,
Я да сваёй прыйшоў высновы.
Ты не шукай у ёй хулы,
Бо мой намер быў самы чысты:

Адных прывозілі таксісты,
Другіх прыносілі буслы.

УТОМА

Янку СІПАКОВУ

А дома казалі:
«Утома».
Я разам
з утомаю
рос:
Бацька
утому
прыносіў дадому,
Утому
дарыў сенакос.
Утомаю
пахлі суніцы
І жніўны
пагодны дзянёк...
З утомы
напіцца з крыніцы,
З утомы
прылегчы ў цянёк.
«З утомай!» —
кажу я малому
І ў памяці
дом паўстае...
Салодкае слова
«Утома»,
Шчаслівы —
хто зведаў яе!

●

Маленькія Напалеоны
На высокіх абцасах...
Учора — паклоны,
А сёння — праклёны.
Аж вусцішна часам.
Учора — куміры,
А сёння — ахвяры.
І ганьбяць іх шчыра
Прадажная ліра
І верны таварыш.
Гісторыі дзверы
Давай прыадчынім:
Якія намеры,
Якія прычыны!
Ці прагнасці верад,
Ці боль за Айчыну!

●

Замак. Возера. Лілеі.
Не шкадуй,
мастак,
алею
На альтанку збоч алеі
І на томік Апулея,
Недачытаны Ядвігай
І зачытаны Барбарай...
Пастаяць
дазволь
мне ціха,
Дай мне крышачку памарыць
Пра алеі,
пра лілеі...
Не шкадуй, мастак, алею.

ЯШЧЭ...

Яшчэ
гуляюць маразы.
Яшчэ
спяваюць палазы.
Яшчэ
вясёлая сініца
звініць
на сініх аканіцах.
Яшчэ
з гаючае крыніцы
бяруць
вадзіцу маладзіцы.
Яшчэ
агонь трапеча ў печы.
Яшчэ,
паверце мне,
не вечар.

●

Па яблыку
выспелі
зоры
І падаюць
з неба,
як з дрэў.
Здаецца,
што толькі учора
Я чыстым
каханнем гарэў.
Здаецца,
што толькі учора
Наноў
акрыліў
мяне лёс,
І я,
перасіліўшы змору,
Кружыў
каля самых нябёс.
Здаецца,
што толькі учора
І я
немагчымае
мог...
Па яблыку выспелі
зоры
І ўпалі
ў халодны
мурог.

ПРАЧЫСТАЯ

Зялёны прываблівы свет.
Салодкая лексіка лета.
Прасвечаны сонцам ранеты
І вымыты ліўнем як след.

Гудзе старажытна пчала,
І мёд залаціцца у місе.
Частуйся ды ціха маліся,
Каб рупнасць заўсёды жыла

У полі,
у садзе,
у хаце,

У бацьку,
у маці,
ў дзіцяці...

дзеці. Арынка, старэйшая, накладала ў чыгуны бульбу. Міля парадкавала каля печы дровы, а Міколка граў на гармоніку. У хату ўвайшоў бацька. Запатрабаваў цёплай вады, каб памыцца. Маці вымае з печы вялізны чыгун з цёплай вадой, налівае яе ў начоўкі, падае бацьку кавал гаспадарчага мыла. Ён намыльвае рукі, абабітыя ды апечаныя ў кузні, націрае болькі, затым змывае брудную пену. Робіць гэтак некалькі разоў, пакуль пена не будзе на руках белай. Міля глядзіць на бацькавы рукі, на тыя болькі, і ёй балюча становіцца самой. Маці падае ручнік. Ён насуха выцірае рукі і націрае болькі адэкалонам. Ад яго Мілю пачынае нудзіць. Яна хаваецца ад гэтага паху ў спальню за дзверы, дзе стаіць куфар на кароткіх ножках. Увесь ён размаляваны: хвалістыя жоўтыя лініі, ромбы, чырвоныя макі і яшчэ нейкія невядомыя Мілі кветкі. Яна ведае, што ў куфры ляжаць скручаныя ў трубачку тканыя ручнікі і шэрыя сувоі палатна. Міля падымае вечка куфра і дакранаецца да яго рукой. Дзяўчо памятае, як маці і бабуля ткалі гэтае палатно, пасля мачылі яго ў крыніцы, слалі на траву, і яно белымі сцежкамі вілося аж да алешніку. Яна крадком бегала па гэтых палатняных сцежках, а маці злавала. Увечары палатно зноў скручвалі ў сувоі, а яно, халоднае, пабранае расой, пахла нечым такім, чаму нельга прыдумаць назвы...

— Мо б не ехаў сёння... Пабыў бы дома...

Міля зачыніла куфар і падышла да дзвярэй.

— Не тваё дзела!

Стукнулі ў сенях дзверы. То Міколка і Ярынка выбеглі з хаты. Яны заўжды хаваліся ад бацькі, баяліся яго. А Міля — не. Яна выйшла з-за дзвярэй і села на парозе. Зірнула на бацьку. Ён надзяваў чыстую, але палатаную кашулю. «Вось, калі я вырасту вялікая, буду..., — пачала развязваць шнуркі вялікіх братавых чаравікаў на сваіх нагах. — Буду я памагаць тату ў кузні... Я ніколі не буду ўцякаць з хаты...»

Сёння абышлося без бойкі. Бацька пайшоў з хаты, але маці ўсё роўна плакала. Міля глядзела ў мокрыя матчыны вочы і прасіла: «Не плач, мама. Я хутка вырасту, пайду працаваць з татам у кузню...»

Мінулася восень. На халодную чорную зямлю апаў снег. Дзіўныя месячныя вечары радавалі дзяцей сваёй казачнасцю. Дні стаялі кароткія, марозныя, з чырвоным нізкім сонцам і такім чыстым ды рыпучым снегам. Сёння адліжыла. Неба паднялося, рака туманіцца лёгкаю параю. Ужо не пакоўзаешся ў ночвах з берага-гары. Міля глядзіць у акно, слухае, як разбіваюцца кроплі вады, што падаюць са страхі. Снег нагадвае Мілі вялізныя грудкі цукру, і ёй так хочацца яго паесці.

Дзяўчо прыціскаецца носам да шыбы і узіраецца ўглыбіню двара, дзе стаіць кузня. Там працуе бацька. Міля бачыць у прачыненых дзвярах яго сагнутую постаць. Ён не разгінаецца нават тады, калі ідзе да горна.

З-за вугла на падворак заехаў чорны огер, запрэжаны ў брычку.

— Тпррр! — пачулася. Дзядзька Стась саскочыў з брычкі. Огер спыніўся, але не кінуў пераступаць з нагі на нагу. З-пад капытоў разляталіся ў розныя бакі дробныя пырскі зледзянелага снегу. Жарабец паказваў вялізныя жоўтыя зубы, жаваў імі цуглі.

— Пятро! Выходзь. Прывёз табе работу, — гукнуў дзядзька Стась.

Выйшаў бацька.

— Трэба, каб ты паддоны скляпаў для сушылкі.

— Плаціць будзеш так, як за плугі!

— Грашыма. А... за плугі табе хіба не заплацілі!

— А то ты не ведаеш!...

— Разбяруся. Калгас не абмануў яшчэ нікога. Куды табе згрузіць!

— У хату.

Калі ў куток паставілі апошні ліст бляхі, дзядзька Стась сказаў:

— Зараз прыеду.

...Неўзабаве вярнуўся дзядзька Стась. Ён увайшоў у хату, паставіў на стол торбу.

— Мука тут... Дзесяць кілаграмаў... За плугі...

Дзядзька Стась хаваў ад маці вочы, а тая — забылася на даўнюю крыўду, разбагацела ў адначассе! — засвяцілася з вачэй.

— Дзякуй табе, Стасю.

Той моўчкі выслізнуў з хаты. Нават не падняў на маці вачэй.

— Мамка, звары блінцоў.

— Блінцы пякуць, дачушка. Тлушчу ў мяне мала. Я лепей зацірачкі навару.

...Міля прачнулася ад холаду. Грубка, натопленая з вечара, даўно ўжо схаладнела. Праз шчыліну ў дзвярах прабіваецца чырвоны праменьчык святла. Пахне дымам. То маці ўпрыцемку паліць у печы. Відна ад полымя. Шкада лішне выпальваць газу. Раз-пораз у вядро булькне абабраная бульбіна. На вокнах узоры — сівыя, бы сам дзед мароз. Аж на падвойныя шыбы павылазілі. За акном чуваць, як вые ў месячным зялёным сяйве завіруха. На залечку спіць Міколка, а за дзвярыма на ложку Ярынка. Міля выбіраецца з-пад тонкай коўдрачкі і босая, у кароткай сарочачцы, бялюткая і сінявокая ідзе на цёплы чырвоны праменьчык у дзвярах.

— Божачкі мае! Халадзіна такая! — ускрыквае маці, падхоплівае малое на рукі і садзіць на печ. — На, закруцісь ў хустку, — падае ёй вялізную клятчастую хустку. Па краях — кутасікі. Міля спачатку ўздрыгвае ад холаду, пасля ёй становіцца цяплей ад чарэні. Маці дае ёй акрайчык хлеба. Па мякішу пасыпаны драбінкі цукру. Міля разглядае малюсенькія беленькія зорачкі на чорнай лусце хлеба. Пасля дакранаецца языком да салодкай крупінкі. Сілкуецца і пачынае забаўляцца кутасікамі. Пляце коскі. Летась Ярынка навучыла плесці з сітнягу паясочкі ды шапкі-вадзянкі.

У кухню заходзіць бацька. Ставіць пасярод яе вялікую калоду і прыкручвае да яе пераносную накавальню. Побач на падлогу кладзе драўляны малаток і нажніцы. Садзіцца на ўслончык, бярэ ліст бляхі і пачынае нешта вылічваць. Затым падразае з усіх бакоў нажніцамі, адным махам малатка загінае надрэзаную пласціну. Міля пакінула плесці коскі, падперла галаву кулачкамі і сочыць, як працуе бацька. У рот ён набірае самаробныя заклёпкі. Бацьку нязручна ўтрымліваць вялікую бляшыну, але ён неяк злаўчыўся, прытрымлівае яе рукой і каленам, нават жыватом упіраецца. Ад напругі выступае пот на лобе, кропелькі яго збягаюць на дзюбку носа і падаюць на рукі. Другой рукой бярэ заклёпку з рота, і тады ў хаце стаіць такі металічны ляскат, што Міля затыкае вушы і хаваецца за комін. Але не знаходзіць там ратунку.

— Дзінь-цок-цок-та-та! Дзінь цок-цок-та-та!

Толькі на чацвёрты дзень сціх ляскат у хаце. Найбольш за ўсіх чакала дзядзьку Стася Міля. Яна ведала, што дзядзька павінен прынесці грошы за бацькаву работу. Тады напэўна ім, дзецям, купяць цукерак. Бацьку — кашулю, бо гэтая зусім падралася, нават праз палатанае вылезлі локці, і мама сабе нешта купіць...

Дзядзька Стась прыехаў надвячоркам. Працягнуў бацьку нейкую паперку.

— Што гэта!

— Доўг твой. Ты павінен заплаціць у калгас.

— За што!! За тое, што жонка кожнае лета табе дзялку апрацуе! Што коней кую! Што плугі рамонтую! Я зрабіў табе трыццаць паддонаў і я яшчэ вінен!! — Вочы ў бацькі сталі чырвоныя, рукі збялелі ў пальцах, якімі ён трымаў паперку.

— Не мне, не мне ты рабіў. У калгас... Карову ты дзе пасеш! Хата на чыёй зямлі стаіць! На калгаснай. Вось і лічы.

Бацька стаяў нерухома, а дзядзька Стась спакойна выносіў з хаты бляшанкі.

Як толькі сціх за акном тупат каня, бацька накінуўся на маці.

— Я табе пакажу дзялку! Я табе дам Стася! Я табе пакажу... калгас!

Маці літасціва трывала бацькавы здзекі. Маленькай Мілі стала шкада нават не маці, як было заўсёды, а бацьку. Яна падбегла да яго, не забаялася яго злоснага крыку, ухапілася за руку:

— Тату, тату! Ты што! — і зазірнула ў вочы. Бацька сумеўся, апусціў рукі, здалося — згорбіўся, і выйшаў з хаты. Нават не грукнуў дзвярыма. І маці чамусьці не плакала.

3

Пятро працаваў у кузні. Алеся выпраўляла Міколку і Мілю пасвіць кароў, а Ярынка палола бульбу. Каля агароджы стаяў дзед Рыгор. Ён выпусціў сваю скаціну, прыпасваў на мяжы, пакуль займуць пастушкі. Сонца падсушвала расу на зямлі і дрэвах. На вішні чырванелі ягады. Міля сарвала некалькі. Смачныя.

— Мамо, давай наварым варэнікаў з вішнямі. Ужо спелыя, — папрасіла Міля.

Алеся ўсміхнулася:

— Ненадта паспелі, але сёння пастушкам навару на вячэру. Будзеце ўжо ласавацца.

Міля заняла дзедаву карову з бычком, прыпынілася каля жыта, прыслухалася да яго шамацення. Сінімі зоркамі ўспыхвалі валошкі. Дзяўчынка вырвала адну жыцінку, выцягнула камялёк і ён тут жа звільготнеў ад соку. Зрабіла жытнёвую дудачку.

— Пфі-і, пфі-і! — засвістала Міля.

— Гэй! Не адставай! — гукнуў Міколка.

Статак пацягнуўся цераз дарогу ў зараснік. За ім пайшлі дзеці. Алеся пайшла да Ярынкі, каб выносіць зелле.

— Дзеўко! На картоплі троха. — Гукнуў дзед Рыгор. Паміж калючымі ніткамі дроту ён працягнуў кош з бульбай. — Мо як памірымось.

— Дзякуй, дзядзьку. Я вам адраблю. Увосень капаць дапамагу.

— А мо жаць паможаш. Гэля да мужа збіраецца.

— Харошае жыто. Колас пускае. Дый многа.

Зарыпелі вароты.

— Што гэто за людзі да вас! — здзівілася Алеся. — З косамі...

Цераз картоплю праставалі да жыта трое мужчын.

— Куды гэта вы! — запытаў Рыгор.

Ніхто не прывітаўся. А людзі свае, вясковыя. Толькі Савель прыезджы.

— Жыто касіць. Адзіналічнікам не паложана гэтулькі, — растлумачыў Янак.

— А ты ідзі сваё выкасі! Што, табе майго захацелася!

— Сказана — здзелана. Загадалі — робім. Адыдзі!

— У-у! Гіцаль васточны...

— Няўжо касіць будзеце! Толькі ж у цвет пайшло, — адазвалася Алеся. Ярынка стаяла поруч з маці. Дзядзькі абышлі старога Рыгора і сталі ў канцы поля ў адзін рад. Сівавата-блакітнае жыта на завідкі красавала. Людзі нібыта не адважваліся пачынаць работу.

— Ай, такое ядраное і—пад касу, — узрушана сказаў Аркадзь.

— Давай, пачынай, — злосна кінуў Савель. І першы ўзмахнуў касою.

— Шшах-дзінь! Шшах-дзінь! — зазвінелі косы. Стоена ўспыхвала раса ў глыбіні сіняватай зеляніны. Каласы, падсохлыя ад ветру, з ціхім шамаценнем падалі долу.

З кузні выйшаў Пятро.

— Нелюдзі! Такое жыто! Ну і свалата...

На гоман выйшла Рыгорава Тэкля. Яна пачула шамаценне жыта, звон кос і галасіла на ўвесь падворак:

— Няма на вас Бога! Праклятыя! Што вы робіце, азвярэлыя!!

Касцы падбіраліся да палавіны. Горача. Янак спыніў работу і выцер змакрэўшую галаву. Спіны ва ўсіх касцоў сталі мокрыя ад поту. Упрэлі.

— Гэй, дзяўчынко! Прынясі папіць! — гукнуў Аркадзь. Алеся не паспела нічога ўсвядоміць, а Ярынка ўжо паднесла да дроту гляк з вадою.

— А, каб цябе халодную абмылі! Зараза ты пляшывая! — заходзілася ад плачу і злосці Тэкля.

Алеся нібыта апрытомнела.

— Ярынка, вярніся! Чуеш!

— Іра! — крыкнуў Пятро.

Дзіця непаразумела азірнулася на маці, нерашуча пачала адступаць ад агароджы, ды было позна. Валасатая спацелая рука пацягнулася да гляка.

— Вот, сапраўдная піянерка. Малайчына, — пахваліў Савель.

Ярынка не чакала, пакуль нап'юцца вады, рушыла назад. На сцежцы яе сустрэў бацька.

— Ты што гэто робіш! У суседстве пакасціш!! — прагаварыў ён праз сціснутыя зубы. З усяго маху выцяў дзіця.— Ты ведаеш, каму занесла напіцца!

Ярынка хіснулася і ўпала на радок. Алеся кінулася да дзіцяці.

— Пятро! Ай, Пятро! Заб'еш дзіця!

Пятро наводмашак ударыў Алесю. Яна ўпала, але тут жа паднялася і на каленях папаўзла ад раз'юшанага мужа.

— Не калеч дзіця! Злітуйся, ірад!

(Працяг на стар. 10).

Уладзімір ЗАБЕЛА,

загадчык кафедры рэжысуры Беларускай акадэміі мастацтваў, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі:

— А я і не чакаў, што Новы год насунецца так хутка... Увесь імпэт, усе высілкі на працягу года адбірала педагогіка, — ад набору на новыя спецыяльнасці ў акадэміі да абароны дыпломаў. Сёлета, дарэчы, мая кафедра ўпершыню ажыццявіла наборы на рэдкія й дэфіцытныя спецыяльнасці (дадам, што раней Беларусь падобныя кадры не рыхтавала): рэжысёраў-мультыплікатараў, кінааператараў, мастакоў кіно, а завочна—тэлеаператараў. Гэта — акрамя традыцыйных спецыяльнасцяў кафедры! А мне, як старшыні прыёмнай камісіі, хапіла вышэй вушэй... У тым ліку і адчування «пакладання падмуркаў» на будучыню, бо праграмы навучання перадусім не проста распрацоўваюцца на пяць гадоў наперад, але і прадугледжваюць (у ідэале) будучую занятасць выпускніка, так бы мовіць, падставу ягонай прафесійнасці.

Працягваю гадаваць курс тэлерэжысёраў. Асаблівасць курса —практыка з першага ж года навучання, хоць «асаблівасцю» гэта лічыцца толькі ў нас. Студэнты асвойталіся ўжо і з рэжысёрскім пультам, і з камерамі, здымаюць свае матэрыялы, якія ў хуткім часе пойдуць па БТ. Найбольш шчыльна стараемся супрацоўнічаць з кабельным тэлебачаннем, якое толькі-толькі распачынае сваю практыку ў Менску. Натуральна, у ідэале я б чакаў ад наступнага года цуду — утварэння ў акадэміі свайго навучальнага тэлецэнтра, тым больш, што прафесійная камера на курс аператараў ужо ёсць.

Мы супрацоўнічаем з факультэтам журналістыкі БДУ: у нас выкладае крытык Ніна Фральцова—гісторыю тэлевізійнай рэжысуры ды практыку дакументальнага кіно, але трывалых сувязяў са студэнтамі пакуль не адбылося... Затое надарылася вельмі плённае супрацоўніцтва з Рэспубліканскім цэнтрам эстэтычнага выхавання дзяцей, дзе мы ўтварылі студыю «Парасткі» і яе мэтаю вызначылі, так бы мовіць, злучэнне эстэтычнай адукацыі з магчымай прафесійнай арыентацыяй. Нашы дзеткі ўжо паўдзельнічалі ў фестывалі, займаюцца ў групах акцёраў і дыктараў, рэжысёраў і вядучых.

Праўда, маю дзейнасць на наступны год вызначыць яшчэ і тэатр. Ёсць прынцыповая згода з БТ на пастаноўку «Следчай справы Вашчылы» І. Чыгрынава, з драматургам У. Граўцовым будзем супрацоўнічаць на тэатральнай пляцоўцы, а самы найпрыемны клопат—тэатр-студыя «Абзац», дзе працуюць мае вучні, — і гэтая праца, асабліва сведчыць пра гэта апошні спектакль «Раскіданае гняздо» Янкі Купалы, абрала іх для сябе беспамылкова...

Віталь РАДЗІЁНАЎ,

выкладчык Лідскага музычнага вучылішча:

— На фоне сацыяльна-эканамічных клопатаў, у якіх літаральна захлынулася жыццё на зыходзе года, падзея, вартая, на мой погляд, увагі, падаецца светлай і сімвалічнай. У яе і назва такая: «Надзея-92». Гэта першы на Беларусі конкурс юных кампазітараў, прысвечаны Максіму Багдановічу і праведзены ў дзень яго нараджэння ў Гародні. Вылучаю гэтую някідкую быццам бы падзею не таму, што самому давялося выступаць тут у чатырох амплуа: ініцыятара, аднаго з арганізатараў, члена журы ды выкладчыка, чые вучні занялі прызавыя месцы. У наш час, калі ўсё любяць улічваць-падлічваць ды ўпадаць у роспач, аптымістычна гучаць такія лічбы. Конкурс «Надзея-92» сабраў каля 40 ўдзельнікаў ад 7 да 18 гадоў, малодшых аказалася ўдвая болей, чым навучэнцаў сярэдніх класаў. Было выканана больш як 120 твораў, у тым ліку складаная формы (варыяцыі, сюіты, фантазіі). Гучала музыка для фартэпіяна, скрыпкі, віяланчэлі, трубы, флейты, баяна, песні ды рамансы на вершы Багдановіча, сучасных беларускіх паэтаў. Сума кожнай з дзесяці прэмій складала ад 1 да 3 тыс. рублёў, падарункі спонсараў каштавалі ў межах 10 тыс. Агульная сума выдаткаў (за выключэннем камандзіровачных)—каля 250 тыс. рублёў. А за лічбамі, вядома ж, людзі: конкурс спраўдзіўся дзякуючы многім установам, камерцыйным структурам, канкрэтным асобам. Самых добрых слоў заслугоўвае намеснік старшыні абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры Н. Трухановіч, без чыёй энергічнай працы конкурс проста не адбыўся б. Адчулі мы і падтрымку народнага дэпутата А. Трусава, і Міністэрства культуры, Саюза кампазітараў Беларусі, абласнога аддзялення Саюза музычных дзеячаў, культурна-асветніцкага фонду «Бацькаўшчына», упраўлення культуры аблвыканкама, кіраўніцтва Лідскага музвучылішча... А два нашы спонсары? Ваўкавыскае малое прадпрыемства «Прако» (дырэктар Я. Касенка) зрабіла каштоўныя падарункі канкурсантам-землякам, Лідская фірма «Захад-Бест» (заходняе прадстаўніцтва незалежнай сістэмы «Аліса») уручыла дзевяці пераможцам японскія фотаапараты коштам па 9 тыс. рублёў. Гэта цудоўна, калі прэзідэнт фірмы М. Давыдоўскі ды віцэ-прэзідэнт І. Івашкевіч перакананы, што эфектыўная камерцыйная дзейнасць магчыма толькі пры высокім узроўні культуры, а значыць культуру ды мастацтва трэба падтрымліваць. Шырокі жэст «Захад-Беста» паспрыяў кансалідацыі грамадскіх сіл у высакароднай справе! «Надзея-92» атрымала добры розгалас у музычным асяроддзі. Аргкамітэт мае намер зрабіць конкурс традыцыйным, мабыць, пашырыўшы яго геаграфічныя межы, надаўшы статус міжнароднага. Тым болей, што паэзія Багдановіча ёсць у перакладах на мовы розных народаў, і абавязковае напісанне твора на тэкст беларускага паэта можа зрабіцца тым рэальным стымулам, што заахвоціць дух сяброўства і творчасці юных музыкантаў з блізкага і далёкага замежжа.

Сяргей ХАРЭЎСКІ,

мастацкі рэдактар віленскай газеты «Наша Ніва» [ад імя ўсяе рэдакцыі, як ён запэўніў]:

— Каляды будзем святкаваць у Вільні, усе разам, у рэдакцыі газеты па Жыгімонта, 12, не зважаючы, што свята гэта сямейнае. Але мы і ёсць адна сям'я. А Новы год мецьмеся сустракаць таксама ўсе разам, толькі па хатах у бацькоў—у Менску.

— А дзе лепш калядуецца—у Менску ці ў Вільні?

— Вядома ж у Вільні.

— Чаму?

— У Вільні дамы ніжэйшыя, лацвей дакрычацца да гаспадароў...

— А чаго вам у Вільні бракуе?

— Метрапалітэна, трамваяў і вялікіх, прыгожых кінатэатраў, якія ёсць у Менску...

Тут да гутаркі далучаецца жонка сп. Харэўскага Кацярына Жыліна, рэжысёр беларускай тэлеперадачы «Раніца тыдня» на тэлебачанні Усходняй Летувы (ёсць і такое):

— Наша беларуская тэлепраграма ў Летуве рыхтуецца не толькі да Новага года, але й да Каляд. Мы робім цікавыя такія тэлесюжэты, як святкуюцца Каляды беларускай супольнасцю Віленшчыны. Яны, дарэчы, будуць трансляваца і на Менск па тэлемосце Вільня—Менск. А калядавалі беларусы ў Вільні заўша...

— Мо ходзіце з зоркаю?

— Не, ёсць такая традыцыя хадзіць талакою, з намі й дзеткі—Дубаўцовы, Шупавы... Але ходзім мы не з зоркаю, а з ліхтарыкамі, па віленскай традыцыі. Мы штогод далучаемся да агульнагарадскога святкавання-гуляння, у часе якога распальваюцца вогнішчы, гараць ліхтары, правіцца святочная імша (па абодвух абрадах).

— А ці будзе залежаць, на вашу думку, цяперашняе святкаванне ад палітычных зменаў у Летуве?

— Анікольки...

ТЭАТР

КЛАСІЧНЫМ ШЛЯХАМ БУЙНІЦКАГА

Пасляслоўе да «Агляду драматычнага мастацтва Беларусі-92»

Гомельскі агляд, насуперак даўным даўняй традыцыі (яна складалася стагоддзямі, ажно з 1585 года) задзіночання беларуска - расійска - польскага (прынцыповая для нашай культуры трыяда!), быў прысвечаны толькі спектаклям беларускамоўным. Яны былі надта розныя па ўзроўні — як намаганняў стваральнікаў, так і налаўчонасці выканаўцаў. Напрыклад, з Віцебска прывезлі «Залёты» В. Дуніна-Марцінкевіча, падаючы іх як класіку беларускай драматургіі, але ж «Залёты» — далёка не класіка. Гэта правінцыйны абразок, які адно дзякуючы рэжысуры можа й цяпер прагучаць як твоо, варты сённяшняга часу. На маю думку, якраз у рэжысёрскім вырашэнні Ю. Лізянгевіча твор прагучаў, бо быў вырашаны гэткім вадэвілем-капуснікам: супрацьстаянне ды ўзаемаўплыў старога з новым падаваліся там на фоне велізарных кроснаў (рух часу й дзеяння), а музыка, зборная з усіх часоў ды народаў, мусіла адпрацаваць на сцэнічную ілюстрацыю менавіта капуснага кшталту. Што ж да магілёўскага спектакля «Смешныя і грэшныя людцы мае», дык яго склалі «Прымакі» Янкі Купалы ды «Збянтэжаны Саўка» Л. Родзевіча, а гэта творы настолькі рознапалярныя па ўзроўні, па мове, нарэшце, па прыналежнасці да пластоў культуры, што быць ім разам... ну ніяк не наканавана. Рэжысура спектакля трымалася на адносна тэатральным узроўні (М. Гавядзінаў), але бясконцыя чарачкі, скокі пад іх, сцэнічны бруд выканання, нарэшце, мова Купалы, якая ну ніяк не стасуецца з рэжысёрскім вырашэннем сваіх носьбітаў (ды на фоне правінцыйнасці Родзевіча), звялі спектакль на нішто.

Я быў ўпадабаў спектакль Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Звон — не малітва» І. Чыгрынава ў пастаноўцы Г. Давыдзькі (мастацкі кіраўнік В. Раеўскі), але ўражанні пасля прагляду надта ўжо супярэчлівыя. З аднаго боку, глабальная сама праблема сутыку паганства ды хрысціянства, і першы акт літаральна ўражавае архаічнай сілай, нечаканасцю буйных характараў, накрэслівае кола буйнамаштабных дзеянняў, маўляў, людзі аддадзены сваім традыцыям, сваім багам, а іх прымушаюць прымаць новага адзінага Бога, — рэжысёравы ды мастаковы знаходкі спрылі замацаванню маштабнасці, чаканню падзеі... А ўвесь другі акт, менавіта вяртанне хрышчанага Ізяслава на Беларусь, — суцэльнае рэзанёрства. Неапраўдана і статыка мізансцэн, — напрыклад маці Рагнеда перамаўляецца з сынам праз усю пляцоўку. Згодны, што гэта, паводле рэжысёра, магло б значыць тое альбо іншае, але я, як глядач, прачытаць гэтага не здолеў. Самае ж прыкрае — расцярушаны, нейкі размыты фінал. Але ж фінал у падобным творы, ды яшчэ пры відавочнай важкасці першага акту, мусіць быць вырашаны не па-за гістарычным кантэкстам нашай краіны, — у нас жа адбыўся дзівосны зліў паганства з хрысціянствам, як і да гэтага часу не-не, ды абвесціць пра сябе самым нечаканым чынам! Хіба гэта — не беларускі менталітэт, не традыцыя?..

На фоне маштабнасці «Звону...» «Галава» І. Сідарука здалася і цяжкой, і неразумнай. У запрашэнні такога твора на паказ менавіта ў Гомель была свая недалікатнасць — у хаце шыбеніка не балабоняць пра вяроўку. Хваля, узнятая спектаклямі «Тры мяхі засмечанай пшаніцы» альбо «Маскоўскім хорам», захлынаецца, змагае сама сябе ў «Галаве», — задумаемся! Тэатр сёння вымагае іншапароднай драматургіі, перадусім звязанай з кампенсаваннем маральных каштоўнасцей для гледача. Памятаю, як два гады таму людзі плакалі на спектаклі «Хам» Э. Ажэшкі ў Акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа (рэжысёр Барыс Эрын)! Катарсіс можа падарыць і спектакль Мікалая Пінігіна «Дзіця з Віфлеема» — той самы, які на сцэне Мінскага тэатра-студыі кінаакцёра зазвычай ідзе не дужа ўдала. Пачну з таго, што Пінігін увогуле намацвае новы шлях беларускага тэатра, шлях вельмі своечасовы — на памежжы культур, веравызнанняў і да т. п. Хрысціянства з паганствам у сваім спектаклі ён аб'ядноў на прынцыпова новай падставе — на тым, што агульначалавечае на беларускіх землях так моцна прарасло праз нацыянальнае, што зрабілася пераважнай, адметнай рысаю нацыі! Пінігін робіць адкрыццё за адкрыццём — «куды ісці ды што казаць». Лёс кабеты ў спектаклі перагукаецца і нават тоесніцца з лёсам Бацькаўшчыны, пэўна праглядаючыся ў этнаграфічным пласце дзякуючы рабоце Таццяны Мархель, а ў Гомелі яна спрацавала выбітна. Батлейка, паралельна з якасцю ішло дзеянне, з'явілася для яе своеасаблівай канвою (а мо і фонам), на якой «вышываецца» ўся гісторыя Хрыста ў народных уяўленнях. Праўда, пласты евангелічны ды фальклорны не паўсюдна дасканала стасаваліся адзін з адным (спектаклю наогул бракуе драматургічнай дыхтоўнасці), але праца Мархель ды інтымнасць паказу (а спектакль, падкрэслю, разлічаны на вельмі абмежаванае кола гледачоў, інакш ён разбураецца, не пачаўшыся) моцна прыўзнялі спектакль над узроўнем ягонага існавання.

Фестывальны кантраст — якраз паміж ролямі Таццяны Мархель у рэжысёра М. Пінігіна і рэжысёра В. Мазынскага. У першым выпадку — сама натуральнасць, густоўнасць, на першым плане — яна, актрыса; у другім выпадку (спектакль «Галава») — Мархель надзвычай не падтрымана рэжысураю, запрыгоненая, нават вульгарная. Што за метамарфозы? Ёсць падстава для роздуму, асабліва на фоне шчырасці й адкрыццяў спектакля Пінігіна...

Напэўна такі нацыянальнае тады дастаткова моцнае й дыхтоўнае, калі выяўляецца праз агульначалавечае, а не праз падкрэсліванне этнаграфічных асаблівасцей. Пінігіну, які ідзе самым нацыянальным і самым цікавым шляхам, моцна бракуе добрай драматургіі, можа, і свайго драматурга. І вынікае праблема, якая, дарэчы, падымалася на канферэнцыі ў Гомелі. Нельга забывацца на тое, што Янка Купала... не напіша больш ніводнае п'есы. І каб тэатр не ліпеў, трэба сілкаваць яго вартай драматургіяй. А калі не стае свайго? Шлях прапанаваў Ігнат Буйніцкі яшчэ калі: звяртацца да сусветнай класікі. Класічным шляхам Буйніцкага...

Гуры БАРЫШАЎ.

«ЗВОН — НЕ МАЛІТВА» І. Чыгрынава. Сцэна са спектакля Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы.

Фота У. ПАНАДЫ

«ГАЛАВА» І. Сідарука. Сцэна са спектакля. Тэатр-лабараторыя нацыянальнай драматургіі «Вольная сцэна».

ВАРЭНІКІ З ВІШНЯМІ

(Пачатак на стар. 8—9).

—Пятро біў дзіця па чым папала. Ярынка лётала ў яго руках як матылёк.

— Эй, брось! — крыкнуў Савель!

— Ты што робіш, Пятро! — дзед Рыгор пралез паміж дротам. — Сціхні, вар'ят! — адштурхнуў Пятра ад малое.

Алеся схапіла Ярынку на рукі і панесла да калодзежа. Паклала яе на мурог, намачыла ручнік і пачала прыкладаць да пабітага тварыка, мачыла галоўку ў рыжых кучаравачках.

— Звер, звер, што ты нарабіў, — плакала Алеся.

Касцы нібыта зноў зашвакалі косамі. Янак спыніўся.

— Ану вас! Касіце самі. Знайшлі дурня... — і пайшоў з поля. За ім рушыў Аркадзь. Праз якую хвіліну паплёўся і Савель.

...Вечарэла. Моцна пахла зямлёю і цяплом скошанага жыта.

На мяжы пад вішнямі спынілася карова з бычком. Дзед Рыгор ішоў запыняць іх у свой двор, а Міля спяшалася ў хату. Ёй уяўляліся на стале ў макотры варэнікі з вішнямі. Але каля кузні, у двары і ў хаце было незвычайна ціха. Міля здзівілася, нясмела гукнула:

— Мам. Го, мамо!

Убегла ў хату. Угледзела на запечку Ярынку. Каля яе маці.

— Мам, варэнікаў наварыла!

МУЗЫКА

ЗРОБІМ ВЫСНОВЫ?

ДОБРА, што Міністэрства культуры Беларусі ды Акадэмія музыкі знайшлі магчымасць арганізаваць новае спаборніцтва для маладых выканаўцаў. І Міжнародны конкурс віяланчэлістаў прайшоў у зычлівай творчай атмасферы, паспрыяў цікавым музычным знаёмствам, а праца журы на чале з Наталляй Шахаўской згуртавала вучняў ды паслядоўнікаў слыннага Мсціслава Растраповіча. Ва ўсім гэтым ёсць логіка: Мінск можна лічыць горадам віяланчэльным, калі згадаць, што яшчэ ў 60-х тут працаваў славуты А. Стагорскі і яго педагагічныя традыцыі не згасаюць. Знаныя ўжо на ўвесь свет юныя віяланчэлісты Мікаэл Самсонаў ды Коля Гімалетдзінаў — вучні заслужанага артыста Беларусі У. Перліна, які сам прайшоў выдатную школу Стагорскага. Можна было б назваць шэраг прозвішчаў іншых беларускіх музыкантаў, чый прафесіяналізм высока ацэнены знаўцамі віяланчэльнага мастацтва, у тым ліку заходнімі.

На жаль, з гэтым не стасуюцца вынікі конкурсу: для беларускай «каманды» яны не надта радасныя, мо і зусім наадварот, калі іх параўнаць з відавочнымі дасягненнямі беларускай віяланчэльнай школы. Усё, здавалася б, зразумела: конкурс — гэта ў нейкім сэнсе саперніцтва суб'ектыўных густаў у аб'ектыўным журы, у нейкім сэнсе латарэя, ці проста гульня самых розных выпадковасцей. Але ж, гледзячы на вынікі першага міжнароднага, дзе нашаму віяланчэлісту А. Афанасьеву дасталося ганаровае 5 месца, а ягонаму сябру па «камандзе» А. Значонку — прыз за лепшае выкананне твора беларускага кампазітара, трэба рабіць высновы. Якія?.. Сваімі меркаваннямі мы папрасілі падзяліцца вядомага віяланчэліста, прафесара Беларускай акадэміі музыкі Мікалая **Шчарбакова** — спецыяліста аб'ектыўнага, які не меў дачынення ні да арганізацыі конкурсу, ні да працы журы, але быў зацікаўленым і кампетэнтным «балельшчыкам».

— Мікалай Сымонавіч, ваша думка наконт вынікаў конкурсу?

— Галоўным вынікам я назваў бы тое, што музычнае жыццё рэспублікі ўзбагаціла сапраўдная падзея, і гэта, трэба думаць, зробіцца традыцыяй. Але для нас музычнае свята азмрочана, бо шырокі свет уже ведае, якое месца заняла ў гэтым конкурсе Беларусь. Нельга лічыць вялікім здабыткам 5-е месца. Можа, на такім выніку адбіліся нейкія арганізацыйныя ды педагагічныя ўпушчэнні з беларускага боку? Так гэта ці не, а чалавек памяркоўны зрабіў бы з нашага сціплага поспеху высновы на будучае.

У першую чаргу, напэўна, трэ было пільна прадумаць кандыдатуры выканаўцаў для ўдзелу ў конкурсе, вылучыўшы тых, хто мог сапраўды стабільна выступіць і заняць вартаснае месца. Можна было зрабіць больш прадстаўнічай і нашу квоту ў журы, адкінуўшы зусім лішнюю ў гэтай справе традыцыйную беларускую сціпласць. Кожная краіна, якая арганізуе такія мерапрыемствы, абавязана прадставіць у склад журы найбольш аўтарытэтных музыкантаў-выканаўцаў, чый голас меў бы бясспрэчную важкасць пры абмеркаванні конкурсных выступленняў. Пра тое, што гэта вельмі істотна, сведчыць гісторыя, практыка ўсіх музыканцкіх спаборніцтваў. Дый мне асабіста надаралася назіраць, як адстойвалі годнасць сваіх землякоў гаспадары конкурсаў у прыбалтыйскіх рэспубліках, у Італіі, у Маскве...

А як выглядалі гаспадары-беларусы ў журы віяланчэльнага конкурсу? Яўген Ксавер'еў, загадчык кафедры віяланчэлі Беларускай акадэміі музыкі, —канечне ж, дастойны чалавек, дасведчаны, аўтарытэтны музыкант. А побач быў ягоны калега, які нядаўна пераехаў на працу да нас з Кішынёва, а ў журы па не зусім зразумелых меркаваннях фігураваў як прадстаўнік Польшчы. Вось і ўсё наша прадстаўніцтва. У той час, як ёсць выдатны музыкант, аўтарытэтны педагог Уладзімір Паўлавіч Перлін, які далёка за межамі Беларусі зарэкамендаваў сябе буйным майстрам, дасягнуў дзівосных вынікаў са сваімі выхаванцамі, бо працуе бліскуча, цікава, творча і таленавіта. Чаму ж яго не было сярод членаў журы?

— Гэткае пытанне і ў мяне ўзнікала... А часам, здавалася б, прыватныя пытанні падсвечваюць глыбокую праблему.

— Дарэчы, «падсвечвае» праблему і такі штрых. Юрый Фёдаравіч Корсак, вядомы піяніст, заслужаны артыст Беларусі, бліскучы канцэртмайстар, акампанаваў адной з колішніх нашых выхаванак Але Кудзялевіч. Іграў выдатна. Дый ён даўно зарэкамендаваў сябе і як саліст, і як ансамбліст. Мае дыплом лепшага канцэртмайстра на конкурсе ў Чэха-Славакіі, аб'ехаў увесь былы Саюз, выступаў, і за мяжой, з такой выдатнай скрыпачкай, як Вольга Пархоменка. А на гэтым конкурсе ягоная праца зусім не была заўважана, прытым што канцэртмайстры ўсіх краін-удзельніц былі найлепшым чынам захвочаны. Прадстаўніку рэспублікі-гаспадыні дыплома не дасталося. Крыўдна...

— Як той казаў, і тут беларусаў у лапці абулі? У сябе ж дома... А дарэчы, Ала Кудзялевіч, якой дапамагаў Ю. Корсак, — як складваўся яе конкурсны лёс?

— Гэта вельмі таленавітая, вельмі перспектыўная віяланчэлістка. Шмат чаго дасягнула вялікай ініцыятывай і ўласнымі намаганнямі. Напрыклад, без усялякіх афіцыйных рэкамендацый, пасля выдатнага заканчэння нашага Музычнага ліцэя, паехала ў Маскоўскую кансерваторыю, бліскуча паступіла і закончыла з адзнакай. Пазней, па рэкамендацыі ўжо Міністэрства культуры Беларусі, выехала на стажыроўку ў Германію, пару гадоў кансультавалася ў лепшых прафесараў Захада і цяпер заканчвае там аспірантуру. Яна паспела за гэты час і паступіць, вытрымаўшы конкурс, на працу ў Берлінскі аркестр, дзе кіруе У. Ашкеназі,— гэта адзін з двух вядомых нямецкіх аркестраў. На наш конкурс прыехала дастаткова падрыхтаванай, але, я лічу, — незаслужана была адсунута неяк на другі план. Работа журы — справа святая, а ўсё ж дазволю сабе заўважыць, што А. Кудзялевіч выступіла ярка і заслугоўвала больш высокага, чым чацвёртае, дадзенае ёй журы, месца. Прычым, яна фактычна самастойна рыхтавалася да конкурсу — нават у выбары адвольнага рэпертуару не мела дапамогі, адзінае, што знайшла ў Германіі з беларускіх п'ес (а хацела толькі беларускую), — «Зімовую акварэль» К. Цесакова.

— Нездарма ў конкурсных дакументах побач з яе прозвішчам значылася: «Германія, Беларусь»?

— Яна не толькі ўсведамляе сябе часцінкай беларускай зямлі, а і ў думках не мае, каб уявіць сябе грамадзянкаю іншай краіны, хаця магчымасці ў яе такія ёсць. Беларусь — сэнс яе творчасці: як дазналася, што ў Мінску будзе міжнародны конкурс, аддала ўсе сілы, каб прыехаць і ўдзельнічаць.

— А што ж прадстаўнікі ўласна Беларусі?

— З пяці ўдзельнікаў — студэнтаў Акадэміі музыкі вылучыўся толькі Аляксей Афанасьеў, і то — на 5-е месца. Канечне, крыўдна за нашу школу, за ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў. Але маем што маем, і гэта ёсць нагода прааналізаваць творчыя пралікі. І пагаварыць, зноў жа, аб самапавазе, бо прайшло ўзнагароджанне выканаўцаў — і чамусьці ўсе віды заахвочвальных прэмій дасталіся гасцям, апроч, бадай, толькі прыза за лепшае выкананне твора беларускага кампазітара. Ёсць у гэтым не зусім паважлівае стаўленне да нашай моладзі. Хіба нельга было праявіць зычлівасць да гаспадароў і неяк заахвоціць, скажам, Антона Мінянкова — хлопчык вельмі добра паказаў сябе. Або даравітую дзяўчыну Юлю Гудзімаву? Напэўна, арганізатарам варта было прадумаць сістэму заахвочванняў па розных аспектах выканальніцтва.

І яшчэ адно. Звычайна да ўсіх конкурсаў такога ўзроўню кампазітарам спецыяльна заказваецца твор, які ўключаецца ў праграму як абавязковы. У нас гэтага зроблена не было. А ў выкананні абавязковай п'есы пераканальна выявілася б адрозненне ў выканальніцкіх стылях і проста майстэрства музыкантаў. Відаць, у будучым трэба ўлічыць і гэта.

Між іншым, не пашкодзіла б стварыць спрыяльныя ўмовы для канцэртных выступленняў нашых будучых канкурсантаў, а то цяпер яны пачуваліся пачаткоўцамі перад публікай і фактычна ўпершыню гралі з аркестрам. Думаю, гэту практыку мог бы наладзіць сімфанічны аркестр Акадэміі музыкі.

Пауль Сусь, масквіч эстонскага паходжання, выхаванец Н. Шахаўской, быў зусім слушна адзначаны І прэміяй. Наконт іншых прызёраў маю сумненні. І лічу, што ў будучым конкурсе Беларусь прынцыпова можа вывесці на дастойныя пазіцыі сваіх па-сапраўднаму таленавітых віяланчэлістаў, якія і сёння ёсць сярод нашых выхаванцаў.

— Трэба толькі зрабіць высновы ды прыкласці намаганні, каб у цэлым паспяхова, па-свойму адметна зладжаны сёлета міжнародны конкурс наступным разам і для гаспадароў ягоных стаўся святам... Дзякуй, Мікалай Сымонавіч, за шчыры каментарый.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

Лаўрэат 3-й прэміі Іварс БЕСПРАЗВАНАЎС (Латвія). Фота У. ПАНАДЫ.

З БЛІЗКАГА ЗАМЕЖЖА

«З НАРОДАМ ВЕЧНА БУДЗЕ ЖЫЦЬ»

Па ініцыятыве Таварыства беларускай культуры Рэспублікі Крым і рэспубліканскай бібліятэкі «Дружба народаў» (Сімферопаль) пад такой назвай адбыўся літаратурна-мастацкі вечар, прысвечаны Янку Купалу.

Адкрыла вечар загадчыца сектара абанемента дружбы народаў рэспубліканскай бібліятэкі Л. Няфедзева.

Усхваляваным словам прывітала ўдзельнікаў вечара намеснік старшыні Таварыства беларускай культуры Рэспублікі Крым Р. Сахарава. З цікавасцю прынялі яе аповяд аб адзіным у Крыме беларускім ансамблі з сяла Мар'янаўка, аб увазе грамадскасці да праблем папулярызацыі лепшых дасягненняў беларускай культуры, мастацкай літаратуры і творчасці Я. Купалы, у прыватнасці.

Цёпла быў прыняты выступ на роднай мове прадстаўніка беларускай грамадскасці Крыма В. Савельева — педагога-арганізатара Пятроўскай школы.

Багаццем гісторыка-літаратурнага матэрыялу, яркай эмацыянальнай афарбоўкай і навізной падыходаў да асэнсоўвання творчасці Я. Купалы вызначаўся даклад «Сябра Украіны» дацэнта Сімферопальскага дзяржаўнага універсітэта, члена Саюза пісьменнікаў Украіны, намесніка старшыні Таварыства ўкраінскай культуры Рэспублікі Крым А. Губара.

Сувязям Янкі Купалы з рускай літаратурай прысвяціў даклад дацэнт Сімферопальскага універсітэта М. Кобзеў.

Вялікую цікавасць выклікаў выступ украінскага паэта, адказнага сакратара Крымскай арганізацыі СПУ Д. Кананенкі. Паэт натхнёна прачытаў верш Янкі Купалы «А хто там ідзе?» у перакладзе класіка ўкраінскай літаратуры М. Кацюбінскага. Гэты пераклад стаў вядомы зусім нядаўна. Д. Кананенка праінфармаваў прысутных аб сваіх творчых сувязях з паэтамі Беларусі, аб працы над анталогіяй сучаснай беларускай беларускай паэзіі.

Дацэнт Сімферопальскага універсітэта Е. Салівон падаравала бібліятэцы «Гісторыю беларускай літаратуры».

Вечар закончыўся канцэртам жаночага вакальнага ансамбля Крымскага сельскагаспадарчага інстытута «Расінка», выступленнем навучэнцаў сімферопальскіх музвучылішча і вучылішча культуры. Прагучалі песні на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах.

Міхась КАЗАКОЎ,
член праўленняў Таварыства беларускай культуры Рэспублікі Крым, Садружнасці рускіх, украінскіх і беларускіх пісьменнікаў.

Уладзімір БЕРБЕРАЎ,

кіраўнік гурта «Ліцвіны»:

— На 1992 год астролагі прадказвалі мне вялікую занятасць, якая апраўдае сябе. Я і сапраўды не памятаю больш напружанага года. Былі пэўныя поспехі, але яшчэ большыя канфлікты. Таму, мабыць, што за справамі не знаходзіў часу, каб высвятляць адносіны з людзьмі. А «матэрыялізацыя» ўсяго папярэдняга адбылася не толькі ў «Ліцвіноў», але і ў Заслаўскім гісторыка-культурным запаведніку, дзе мая трохгадовая праца «матэрыялізавалася» ў экспазіцыю — выставу народных інструментаў. Дарэчы, пад зорамі хаджу, маім назіраннем, не толькі я: вышэйпамянёны Запаведнік, месца маёй штатнай працы, адкрыў у 1992 годзе яшчэ дзве экспазіцыі.

Мой варыянт «хваробы неіснавання», як слушна здолеў акрэсліць стан творчай заангажаванасці нехта з літаратараў, — задума стварэння фальклорнага гурта — з'явілася ў мяне ў 1987 годзе. Да таго ж часу адносяцца і першыя крокі ў гэтым накірунку.

Гурт у сённяшнім яго выглядзе камплектаваўся ў 1991-м годзе, да якога адносяцца і самыя значныя нашы творчыя напрацоўкі, хоць у канцы 1991 года мы не трапілі нават у самы поўны каталог фальклорных гуртоў Беларусі.

Рост цікавасці да нас у 1992 годзе — самы відавочны, хоць і не галоўны вынік адыходзячага года. Выйшла касета з нашымі запісамі. Мы прынялі ўдзел у фальклорных фестывалях — трох за паўгода. Нядаўна з'ездзілі з выступамі ў Польшчу. Самы значны вынік на ...ых кароткіх гастроляў у Лодзі — творчы, як не дзіўна: большая непасрэднасць польскай публікі адносна больш стрыманай беларускай істотна дапамагла нам у пошуках уласнага сцэнічнага вобраза.

Аднак галоўнай мы лічым нашу дзейнасць на Радзіме, бо як ні важна ствараць праўдзівы імідж беларуса за мяжой, — лёс нашай культуры, а значыць і нацыі, вырашаецца ўсё ж дома, дзе поспех даецца цяжэй за ўсё. Магчыма, і таму, што патрабуе глыбейшага падыходу да працы. Айчынны слухач у той ці іншай ступені заўсёды чалавек беларускай культуры, а значыць, валодае напрацаванымі стагоддзямі крытэрыямі яе ацэнкі.

Знешне спакойны і ўнутрана напружаны 1992 год раскрыў сутнасць шмат якіх працэсаў нашага жыцця. Агульна гледзячы, і «Ліцвінаў» не абмінулі дамінуючыя астральныя працэсы.

Што ж да спадзявання на надыходзячы год, дык у гэтым я — містык. Адыходзячы год па заходняй астралагічнай сістэме год Месяца. Мой, значыць. Надыходзячы — па ўсходняй — год Пеўня. Таксама мой. Дык давайце ж самаддана працаваць і ў Новым годзе, і хай паможа нам Бог!

Аляксандр ТУЗЛУКОЎ,

саліст ДАВТа Беларусі:

— Трэці сезон пяю ў оперы. Як пачаткоўцу мне, лічу, шанцуе: многа цікавых, адказных работ. Сярод іх і тэнаровыя партыі ў апошніх прэм'ерах: «Тоска», «Майстар і Маргарыта», наступнаю рыхтуецца «Іяланта»... І калі зусім нядаўна жыццё нашага тэатра, як і ўсё культурна-грамадскае жыццё Беларусі, ускалыхнула сапраўдная падзея — прэм'ера оперы А. Бандарэнкі «Князь Наваградскі», — дык можна сабе ўявіць, чым сталася яна для мяне. Навошта хітраваць: студэнтаў-вакалістаў як мае быць не прывучаюць да ўскладнёнай сучаснай музычнай драматургіі і музычнай мовы, і кожная такога плана праца ўспрымаецца нават ужо сталымі артыстамі, выхаванымі на класічных стандартах, бывае што і насцярожліва. «Князь Наваградскі» — твор асабліва незвычайны, складаны. І я, шчыра кажучы, не ўяўляў, што ў маім творчым жыцці будзе такі спектакль. Вобраз галоўнага героя Войшалка-Васіля, сына Міндоўга, — гістарычны персанаж, і ён увасоблены неадназначна, гэты глыбока філасофскі вобраз змяшчае для мяне як для выканаўцы шмат нераскрытага. Праз асабістую драму герой перажывае духоўную эвалюцыю: ад паганскага княжыча да праваслаўнага манаха і князя. І многа яшчэ трэба перажыць, каб адчуць самога Войшалка: які ён мог быць?.. Мне зараз яшчэ не ўсё удалося зразумець у складаным унутраным змесце гэтай асобы. Але ёсць усведамленне, што мы ўсе — чыннікі вельмі значнай падзеі, і асабліва адчувалася гэта на спектаклі (мне даверылі спяваць другі прэм'ерны), атмасфера якога вымушала забыцца на ўсё жыццёвае, тое, што цябе кожны дзень абступае, і пранікнуцца тым станам, які нараджае цікавая і самабытная музыка А. Бандарэнкі, уся атмасфера пастаноўкі.

Людміла ПАДГАЙСКАЯ,

хатняя гаспадыня, маці двух малых хлопчыкаў,
г. Мінск:

— Новы год святкуем заўсёды сваёй сям'ёй. Вельмі любім гэтае свята. Прыдумваем для дзяцей розныя гульні. У нас ёсць касцюмы Дзеда Мароза і Снягуркі. Пячом свой «фірменны» торт. Каляды для нас таксама свята, хаця яшчэ не такое звычайнае, як Новы год. Мы не з'яўляемся вернікамі ў поўным сэнсе гэтага слова. Хаця верым у нейкую вышэйшую духоўнасць, і ў тое, што як за дабро, так і за зло, раней ці пазней, чалавеку давядзецца адказваць.

Каляды яшчэ тым асаблівыя для нашай сям'і, што я сама нарадзілася ў ноч з 6 на 7 студзеня. Так што ў нас заўсёды свята ў гэты дзень.

Наша сям'я, як бачыце, мала чым адрозніваецца ад тысяч іншых. Жывём мы ў згодзе, прывучаючы дзяцей да працы і да гонару за ўсё наша, беларускае.

Вядома ж, мой лёс неаддзельны ад лёсу краіны. І «ЛіМ» для мяне — часцінка маёй краіны. Кожны раз, прачытаўшы штотыднёвік, душа напаўняецца аптымізмам, што жыве наша мілая Бацькаўшчына, нягледзячы ні на што. Колькі ў нас сапраўды таленавітых паэтаў, пісьменнікаў, кампазітараў! Прыемна, што ёсць столькі людзей, якія шмат робяць для адраджэння беларускай культуры. Хаця, на вялікі жаль, у паўсядзённым жыцці мы сустракаем вельмі многа людзей, якія рэзка адмоўна ставяцца да ўсяго беларускага, у першую чаргу да нашай роднай мовы.

Таццяна БЕЙ,

36 год, бібліятэкар,
пас. Калодзішчы Мінскага р-на:

— Я больш даражу Калядамі, бо Новы год зусім звычнае, нічым не адметнае свята. Я, не пабаюся сказаць, калядаваць умею і вучу гэтаму іншых. Мы ходзім па хатах з казою, са звяздой і бачым, як нас людзі добра сустракаюць. Гаспадар, да якога мы завітваем, лічыць гэта гонарам, нібы мы прынеслі шчаслівую вестку. Заўсёды радасць, смех у адказ на нашы шчадроўкі, хоць бы на такія, як гэта:

Шчодрык, шчодрык, шчадраўніца,
Смачна з макам паляніца.
А без маку не така,
Дайце, дзядзька, пятака,
А вы, цётка, грошы,
Бо дзядзька ў вас харошы.

Цяпер мой лёс ўжо знітаваны з лёсам маёй рэспублікі. Мой муж, афіцэр, прыняў прысягу на вернасць Рэспубліцы Беларусь. У нас ваенны гарадок, і сем'і, вядома, розныя. Неяк склалася так, што сем'і прапаршчыкаў у асноўным беларусы. А афіцэры, вядома, розных нацыянальнасцяў. Але тыя, хто хацеў паехаць, ужо з'ехалі, а іншыя ў большасці сваёй не перашкаджаюць праводзіць беларускую ідэю ў жыццё.

І яшчэ. У мяне любімая работа, і ўсё, што я па меры магчымасці магу рабіць па прапагандзе беларускай кнігі і парыёдыкі, я раблю. Можаце не сумнявацца, маю любімую газету «ЛіМ» у Калодзішчах ведаюць і чытаюць. Дзякуй вам за вашу і нашу газету.

Прыняты ў Саюз пісьменнікаў

АЙЗЕНШТАДТ Веніямін Міхайлавіч. Паэт. Піша па-руску. Нарадзіўся ў 1921 годзе ў Копысі Аршанскага раёна.

Літаратурную працу пачаў у 1940 годзе.

Аўтар кніг «Слух сердца» (1990), «Возвращение к душе» (выйшла пад псеўданімам В. Блажэнных у выдавецтве «Советский писатель» у 1990 годзе), публікацый у часопісах «Новый мир», «Знамя», «Даугава», калектыўных зборніках, іншых выданнях.

АФАНАСЬЕЎ Іван Мікалаевіч. Крытык, літаратуразнавец. Піша па-беларуску і па-руску. Нарадзіўся ў 1963 годзе ў Гомелі. Скончыў Гомельскі дзяржаўны універсітэт (1985), аспірантуру пры ім (1988). Асістэнт кафедры рускай літаратуры ГДУ.

Літаратурную працу пачаў у 1985 годзе.

Аўтар кнігі «Будзем садзіць сад» (1991), шэрагу публікацый у перыёдыцы.

БАРАВІК (НОВІКАВА) Марыя Якаўлеўна. Паэтэса. Нарадзілася ў 1946 годзе ў вёсцы Прэабражэнка Глыбоцкага раёна. Скончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт (1978). Працуе старшым бібліятэкарам у Падсвільскай дзіцячай бібліятэцы Глыбоцкага раёна.

Літаратурную працу пачала ў 1967 годзе.

Аўтар кнігі «Поле долі» (1985), шэрагу публікацый у перыёдыцы.

ГРЫШКАВЕЦ Валерый Фёдаравіч. Паэт. Піша па-руску. Нарадзіўся ў 1953 годзе ў Пінску Загадчык аддзела пінскай газеты.

Літаратурную працу пачаў у 1968 годзе.

Аўтар кніг паэзіі «Время отправления» (1981), «Круг истиный» (1991), аднаактовай п'есы «Проморгали» (1985).

КАНАНОВІЧ Іван Іванавіч. Празаік, нарысіст. Нарадзіўся ў 1938 годзе ў вёсцы Кукавічы Капыльскага раёна. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1968). Рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Літаратурную працу пачаў у 1975 годзе.

Аўтар кніг «Заводскія світаніі» (1978), «Белы чыгун» (1981), «Асобая зона» (1991), шэрагу публікацый у перыёдыцы.

ПАЗНЯКОЎ Міхась Паўлавіч. Паэт. Нарадзіўся ў 1951 годзе ў вёсцы Заброддзе Быхаўскага раёна. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1977). Галоўны рэдактар выдавецтва «Юнацтва».

Выдаў кнігі «Дзіўныя «блізняты» (1987), «Побач з татам» (1988), «Тры чарадзеі» (1991), «Час надзеі» (1991). Аўтар «Слоўніка эпітэтаў беларускай літаратурнай мовы» (1988).

«Хачу, каб былі заможнымі і свабоднымі мае дзеці»

(Пачатак на стар. 5).

тыйных органах, не трэба займацца накапленнем першапачатковага капіталу: яны паспяхова адмылі дзяржаўны ці партыйны капітал і перавялі ў свой уласны. А прадпрымальнікі, што пачынаюць з нуля, змушаны зарабляць грошы, абыходзячы перашкоды, створаныя гэтымі самымі структурамі ў форме законаў і падзаконных актаў. (Сказанае не тычыцца акцыянернага таварыства «Кросны» — перад ім як перад акцыянерным таварыствам задача назапашання першапачатковага капіталу не стаіць: яе вырашылі акцыянеры-заснавальнікі. — **Ю. З.**).

Але я спадзяюся, што цяперашняя посткамуністычная каманда — а людзі ў ёй усё ранейшыя — усё-такі будзе заменена людзьмі сумленнымі, накіраванымі ў будучае, хварэючымі за адраджэнне.

— Каб здзейсніліся такія перамены, відаць, асаблівае значэнне набывае роля інтэлігенцыі як асветніка народа?

— Да беларускай інтэлігенцыі асабіста ў мяне вялікія прэтэнзіі. Па большасці інтэлігенцыя пасіўна-абыякавая да тых праблем, ад вырашэння якіх залежыць лёс культуры. Інтэлігенцыі, перш чым прамаўляць да народа, трэба пераламаць сваю ўнутраную псіхалогію.

Са свайго боку, ідучы праз эканоміку да культуры, «Кросны» падтрымліваюць і будуць падтрымліваць усімі магчымымі сродкамі беларускую культуру, беларускі друк, выданні, тэатр, рэлігійныя суполкі, элітарную адукацыю і выхаванне нашых дзяцей. Мы марым дапамагчы свайму народу вырасціць нацыянальны інтэлект.

— А дзе, спадар Грыб, вучацца вашы дзеці? І — трошкі пра сябе.

— Адна дачка вучыцца ў політэхнічнай акадэміі, другая — у эканамічным універсітэце, былым інстытуце народнай гаспадаркі.

Сам я пасля вайны дзіцём патрапіў на Урал, мову забыўся... Добра зведаў, што такое настальгія; пасля дванаццаці год жыцця ў Расіі вярнуўся дадому. Скончыў універсітэт, і паступова ўспамінаў, хто я. Калі пачаліся часы перамен, я канчаткова пераканаўся, што нам трэба станавіцца гаспадарамі на свае зямлі.

Працаваў на заводзе, прайшоў ступені ад майстра да кіраўніка групы ў канструктарскім бюро, затым працаваў выкладчыкам у вучылішчы электронікі пры «Інтэграле», неўзабаве пайшоў у новую эканоміку, бо абрыдзела ўсё жыццё быць інжынерам-жабраком.

Я прыйшоў у новую эканоміку, каб стаць багатым самому, зрабіць багатымі сваіх дзяцей, каб быў багатым, вартым сваёй працавітасці мой народ.

— Цікава, ці падзяляюць погляды кіраўніцтва падначаленыя супрацоўнікі?

— Што тычыцца Адраджэння ўвогуле, дык так. Але ў кожнага з іх свае погляды на жыццё. Нейкай нацыянальнай селекцыі пры прыёме на працу ў нас няма, бяром выключна па дзелавых якасцях, хоць пажадана валоданне моваю. Мы просім, каб супрацоўнікі хутка засвойвалі беларускую мову, бо ўсё справаводства ў «Кроснах» вядзецца па-беларуску. Дарэчы, работнікі ў нас маладыя — сярэдні ўзрост каля 30-ці гадоў, я ў параўнанні з імі «патрыярх» (сп. Я. Грыб 1936-га года нараджэння. — **Ю. З.**).

Мы запрашаем да супрацоўніцтва ўсе беларускія і небеларускія дзелавыя ўтварэнні, хто хацеў бы працаваць на карысць нашага народа. Наша ўстанова знаходзіцца ў Менску, па Свярдлова, 4. Тэлефоны 20-09-70; 26-56-54.

— Дзякуй за гутарку, спадар Ян, і хай вышэйшым наканаваннем прыбыткі вашага таварыства ўвачавідкі ўзрастаюць!

Гутарку вёў
Юрась ЗАЛОСКА.

P.S. Пакуль тэкст інтэрв'ю рыхтаваўся да друку, сп. Я. Грыб пабываў з місіянерскім, так бы мовіць, візітам у Польшчы: супрацоўнікі «Кроснаў» разам з прадстаўнікамі Беларускага праваслаўнага брацтва трох Віленскіх пакутнікаў (Менскі Свята-Петрапаўлаўскі сабор) завезлі праваслаўным беларусам Беласточчыны «Дзіцячыя Біблії» ў перакладзе на беларускую мову, іншую малітоўную літаратуру. Сп. Грыб падзяліўся ўражаннямі ад паездкі, між іншым асвятляючы яшчэ адну праблему беларускага прадпрымальніцтва — яго распаўсюджанне за межы рэспублікі:

«Я пазнаёміўся там з цудоўнымі людзьмі, таксама «свядомымі беларусамі», праваслаўнымі — сп. Яўгенам Чыквіным, дэпутатам Сейма ад Беластоцкага ваяводства, і сп. Сяргеем Мартынюком, кіраўніком тамтэйшай фірмы «Пранар» (якая працуе вельмі сур'ёзна і заўважна не толькі ў ваяводстве, але і шмат дзе па Польшчы). Мы вялі перамовы аб удзеле беларускіх прадпрымальнікаў у забеспячэнні культурных патрэб беластоцкіх беларусаў, абмяркоўвалі шляхі ўзаемакарыснага супрацоўніцтва прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь і Польшчы.

З фірмай «Пранар» мы дамовіліся супрацоўнічаць на ўзаемавыгадных асновах і частку прыбытку — з абодвух бакоў — адлічваць на культурныя патрэбы нашага народа, як на Беласточчыне, так і ў рэспубліцы. Гэта не толькі дапамога праваслаўнай царкве; гэта яшчэ і таварны ўзаемаабмен рэгіёнаў, які б дазволіў ўзняць дабрабыт беларусаў суседніх краін, і інш.

Цяпер мая задача — неяк схіліць нашыя ўрадавыя колы, каб яны падтрымалі наш пачын. Таму што без падтрымкі ўрадавых структур нам вельмі цяжка працаваць. Каб пераехаць мяжу, даводзіцца ледзь не тыдзень вычэкваць чаргу на мытні. Але кантакты трэба ладзіць і падтрымліваць аператыўна... Нам патрэбна больш празрыстая мяжа з Польшчай, і не толькі дзеля пераездаў людзей, але і правозу тавараў, тэхнікі. Перашкоды для кантактаў, што засталіся ў спадчыну ад СССР, незалежнай Беларусі трэба касаваць, бо гэта вельмі набалелае пытанне для суседніх народаў. Думаю, сп. П. Краўчанка, як чалавек прыхільны і сур'ёзны, мяне зразумее і падтрымае... Сустракаўся я і са сп. Радкевічам, старшынёй камітэта па знешнеэканамічных сувязях, і ўбачыў, што ён таксама разумее сітуацыю з мяжой і тое, што без адраджэння эканамічнага немагчыма і адраджэнне культурнае.

Беластоцкія беларусы моляць Бога, каб наша Беларусь як мага хутчэй стала сапраўды незалежнай і заможнай краінай, моцнай дзяржавай, з якой будуць лічыцца суседзі».

ПРЭМ'ЕРЫ

Талстой у Віцебску

Сцэна са спектакля. Уролі Іллі — Генадзь Шкуратаў, У ролі Пашы («Касатка») — Тамара Кабяк.

Фота Аляксандра ХІТРОВА. БЕЛІНФАРМ.

У Беларускім акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа — прэм'ера. Віцяблянам паказана камедыя Аляксея Талстога «Касатка».

Паставіў спектакль рэжысёр - пастаноўшчык Юрый Лізенгевіч, сцэнаграфія — Андрэя Пронына, музычнае афармленне — Аляксандра Суворава.

ТЭАТР

Самастойны «Варыянт»

24 снежня малая сцэна Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы святкавала прэм'еру паводле Фёдара Дастаеўскага «З нагоды мокрага снегу» («Запіскі з падполля»), — п'еса належыць В. Нікіфаровічу і В. Раеўскаму, пастаноўка В. Раеўскага, мастак — Б. Герлаван, кампазітар — А. Янчанка, пераклад зроблены У. Няклаевым. Нагадаем, што падчас «Фестывалю сяброў» (гастроляў беластоцкага тэатра імя Вянгерні на купалаўскіх пляцоўках) менчукі знаёміліся ўжо з польскім варыянтам Дастаеўскага, — пастаноўку ажыццяўляла тая самая творчая група, а уразіў публіку і крытыку ў ролі Парадаксаліста беластоцкі акцёр Ежы Лушч. Менавіта «ЛіМам» была выказана прапанова асталяваць спектакль на купалаўскай малой сцэне і ў беларускім варыянце; аднак выкананне ролі Парадаксаліста Сяргеем Краўчанкам сведчыць пра абсалютную самастойнасць так званага «беларускага варыянту».

«Каханне...» у садзейнічанні

Драма Сэма Шэпарда «Каханне злое» сталася пераднавагодняю прэм'ерай (26 снежня) Тэатра-студыі кінаакцёра ў Менску. Пераклад з ангельскай на рускую Таццяны Путровай, рэжысёр - пастаноўшчык — Валянціна Цагойка, нядаўняя выпускніца Беларускай акадэміі мастацтваў. Гэта яе дыпломны спектакль, падтрыманы выканаўчым досведам акцёраў тэатра - студыі Пятра Юрчанкова, Анатоля Гур'ева, Анатоля Цярпіцкага і Лідзіі Мардачован. Мастаком - пастаноўшчыкам і мастаком па касцюмах выступіў Дзмітрый Мохаў, музычнае афармленне належыць Аляксандру Рэнанцкаму.

Нялішняя падрабязнасць з праграмкі: спектакль створаны ў садзейнічанні з РПТУ «Арт - фільматэхніка» (генеральны дырэктар М. Мінасаў). Няхай жыве садзейнічанне!

Распачаты дваццаць пяты...

6 снежня «Доктар Айболіт» В. Карастылёва ў перакладзе І. Сідарука і пастаноўцы Ю. Сарычава прэм'ерна распачаў 25 сезон на сцэне Брэсцкага тэатра лялек. Мастак спектакля і аўтар лялек — С. Крывецкі, музыка — У. Прохарава. Паралельна з «Доктарам...» акцёры заняты ў калядным прадстаўленні І. Сідарука «Святы вечар добрым людзям» паводле нацыянальнага фальклору, — прадстаўленне каля навагодняй ялінкі мусіць суправодзіць дзетак у залу на спектакль «Рыгорка — ясная зорка» А. Вярцінскага.

МУЗЫКА

Праект — на разгляд урада

Нам паведамілі, што ў Саўміне рэспублікі сумесна з Міністэрствам культуры, Міністэрствам фінансаў, Дзяржэканомпланам і Акадэміяй навук Беларусі разгледжана прапанова Камісіі Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны — аб стварэнні нацыянальнага тэатральна - канцэртнага аб'яднання «Беларуская Капэла». Ідэю стварэння такога творчага аб'яднання Савет Міністраў падтрымаў. А Міністэрству культуры даручана падрыхтаваць праект рашэння Саўміна па пытанні арганізацыі «Беларускай Капэлы» і, узгадніўшы яго з адпаведнымі міністэрствамі й ведамствамі, унесці на разгляд урада.

КІНО

Яшчэ адзін фільм пра Купалу

«Гэта мой ужо трэці фільм пра народнага песняра Купалу», — сказаў на творчай сустрэчы са стваральнікамі дакументальнай стужкі «Ніколі я не паміраў...» Г. Колас. Прэм'ера адбылася ў Доме літаратара. Аб фільме гаварылі таксама рэжысёр У. Бокун, Т. Процька і В. Скалабан. Прысутныя пазнаёміліся з выставай пра раннюю творчасць песняра, падрыхтаваную супрацоўнікамі Літаратурнага музея Я. Купалы.

Г. ПЯТРОУСКІ.

ДРУК

«Беларускія пісьменнікі», том першы...

Для тых, хто любіць беларускую літаратуру, цікавіцца яе ўчарашнім і сённяшнім днём, выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі падрыхтавала цудоўны пераднавагодні падарунак. Выйшаў першы том біябібліяграфічнага слоўніка «Беларускія пісьменнікі». Разам з выдавецтвам трэба згадаць (найперш, бадай) і Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. Хацелася б і Мінскую фабрыку каляровага друку згадаць, хоць набор, падпісаны да друку ажно 12 мая 1991 года, толькі цяпер стаў кнігай.

Ды Бог з імі, з гэтымі шпількамі. Галоўнае — нарэшце з'явілася такое унікальнае выданне, усяго ў слоўнік уключана каля 1100 артыкулаў пра пісьменнікаў, якія пісалі на беларускай мове ці ў старажытны перыяд на агульных для некалькіх народаў мовах (старославянскай, лацінскай, польскай). Праўда, для літаратараў мінулага стагоддзя крытэрый іншы — абавязковая наяўнасць беларускамоўных твораў. Таму ў слоўнік і не ўвайшлі артыкулы пра Э. Ажэшку і А. Міцкевіча. З сучасных жа літаратараў на першым плане стаіць не мова, а пражыванне на тэрыторыі Беларусі, ці ўваходжанне ў даваенны час у розныя творчыя секцыі. Прадстаўлены беластоцкія літаратары і тыя, хто апынуўся ў эміграцыі.

Артыкулы складаюцца з дзвюх частак — біяграфічнай і бібліяграфічнай. У апошняй — вычарпальныя звесткі пра творы самога пісьменніка, пераклады іх, і пра тое, як рэагавала на яго крытыка.

У першым томе прадстаўлены артыкулы ў межах прозвішчаў Абуховіч — Ватацы. Поруч з вядомымі пісьменнікамі прадстаўлены і тыя, пра каго шырокі чытач калі і ведае, дык мала. — Бэр Аршанскі, Рыгор Бахта, Мануіл Базілевіч, Сцяпан Баркоўскі, Віктар Вольтар і іншыя.

Прадбачачы, што да слоўніка могуць узнікнуць пэўныя прэтэнзіі, рэдкалегія агаворваецца, што ён быў падрыхтаваны да выдання ў 1983—1987 гадах, «у зусім іншых, чым цяпер, грамадска-палітычных умовах».

Новае — забытае старое?

Народны дэпутат Рэспублікі Беларусь Валянцін Голубеў, які належыць да апазіцыі БНФ у цяперашнім Вярхоўным Савеце, займаецца даследаваннем праблем землеўладання на Беларусі. Днямі ў выдавецтве «Навука і тэхніка» выйшла яго кніга «Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI—XVIII стст.» Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі вядзецца комплекснае даследаванне гэтага важнага пытання.

Кніга, трэба думаць, выйшла вельмі дарэчы. Каб праводзіць зямельную рэформу сёння, неабходна і назад азірнуцца. Бо часта новае — гэта ўсяго толькі забытае старое.

Лідэрства?

«Упершыню» — гэтым словам мы любілі карыстацца, даказваючы «перавагі сацыялістычнага ладу жыцця». Сёння ж я згадваю гэтае слова зусім з іншай — можна сказаць, зоркай — нагоды. Упершыню ў сусветнай практыцы выдавецтва «Народная асвета» выпусціла падручнік па радыяцыйнай гігіене для... першакласнікаў! Вось так! Аўтары — радыёфізікі А. Люцко і А. Зайцава і мастакі В. і С. Бартловы — імкнуцца і такім чынам уберагчы дзетак ад таго, што прынёс з сабой Чарнобыль.

«Маленькія злачынцы» — так называецца гэты незвычайны падручнік, які адначасова выйшаў на беларускай, рускай і англійскай мовах, накладам адпаведна 120, 100 і 15 тысяч асобнікаў. Маюцца на ўвазе тыя радыяцыйныя часцінкі, што падсцерагаюць чалавека.

Такое яно, наша сённяшняе лідэрства.

Расказвае «Беларуская думка»

Чарговы нумар часопіса здвоены — адзінаццаты і дванаццаты, аднак памер ягоны не павялічаны. Цяжкасці, як бачым, не абышлі і гэтае выданне. Тым не менш, пачытаць тут ёсць што. У раздзеле «Суверэнітэт» прыцягваюць увагу разважанні У. Конана «Беларуская ідэя і місія Беларусі» і У. Содаля «Сам-насам з незалежнасцю».

Прадстаўнічы сшытак «Духоўны свет»: меркаванні У. Глушакова «Трын-трава, або Дакуль вёска будзе парабкам у горада», роздум паміж спектаклямі В. Нікіфаровіча «Куды ісці тэатру», спроба аналізу А. Рогалевым моўнай сітуацыі «Не лямантаваць, а даследаваць!», думкі А. Марціновіча, падказаныя кнігай А. Русецкага «Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць» («Былі. Ёсць. Будзем»), карэспандэнцыя М. Маліноўскага «Вяртанне слуцкіх паясоў», артыкулы Л. Макаранкі «Бойцеся данайцаў...» і П. Кошаля «Хоць і нячыстая сіла, ды свая».

«Экскурс у XVI век, ці Аповяд аб тым, дзе, кім і калі была створана «Хроніка Быхаўца» В. Церахавай, «Юзаф Пілсудскі: міфы і рэальнасць» А. Макарэвіча, «Часу не падуладна» І. Басюка — раздзел «Спадчына».

Рубрыка «Вузлы айчыннай гісторыі. Альтэрнатыўны погляд» прадстаўлена артыкулам А. Філатавай «Рэч Паспалітая абодвух народаў».

Адбітак лёсу

Кніжка гэтая унікальная ва ўсіх адносінах. На-першае, аўтар яе Сяргей Давідовіч — не прафесіянальны літаратар, а падпалкоўнік міліцыі. Да ўсяго — народны дэпутат Рэспублікі Беларусь. Захапляецца жывапісам (выстаўка яго лепшых твораў летась працавала ў Палацы мастацтваў у Мінску). Паэзіяй займаецца даўно, аднак дагэтуль пісаў паруску. «А ён жа, — цытую невялікую прадмову Уладзіміра Содаля, — з тых паэтычных мясцінаў, ад тых літаратурных гнёздаў, дзе жыў Янка Купала (Акопы), Ядвігін Ш. (Карпілаўка), дзе нарадзілася «Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Тутэйшыя», дзе напісаны жывыя апавяданні Антона Лявіцкага, дзе сакавітая народная мова, дзе багатыя народныя традыцыі».

Не мог, канечне, С. Давідовіч і ў сваіх паэтычных творах не вярнуцца да вытокаў, да матчынай гаворкі. І вярнуўся, і

адразу размахнуўся на паэму, прысвечаную бацькам, роднаму краю.

А яшчэ адметнасць кніжкі «Люстэрка лёсу» ў тым, што пабачыла яна свет за сродкі аўтара ў друкарні Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і выйшла з малюнкамі самога С. Давідовіча, рэпрадукцыі з якіх зрабіў А. Драздоў.

Гэта наша Беларусь

Сёння, калі мацнее нацыянальнае Адраджэнне, папулярнасць новай серыі выдавецтва «Народная асвета» «Гэта ты, мая Беларусь», бадай, забяспечана. Прынамсі, кніга В. Кісялёва «Неўміручая песня лясоў» (пераклад з рускай мовы Л. Дайнекі), якая выйшла ў серыі, прыйдзецца даспадобы не адным вучням і настаўнікам, на каго ў першую чаргу зарыентавана, а так званаму шырокаму чытачу: яна — аб прыродзе нашай Бацькаўшчыны, яе раслінным свеце.

Упершыню пра жывапіс фрэсак

Кніга А. Сяліцкага «Жывапіс Полацкай зямлі XI—XII стст.», выпушчаная выдавецтвам «Навука і тэхніка», — яшчэ адзін позірк у даўніну, у часы, калі існаваў ужо правобраз беларускай дзяржавы. Аўтар упершыню ў нацыянальнай практыцы даследуе фрэскавы жывапіс. Дапытлівага чытача чакае знаёмства з фрэскамі знакамітага Сафійскага сабора, храмаў Бельчыцкага Барыса-Глебскага манастыра, Спаса - Праабражэнскай царквы. Адпаведным чынам падабраны і ілюстрацыйны матэрыял. Важна і тое, што праведзена графічная рэканструкцыя роспісаў, якія не захаваліся.

ЛІТКУР'ЕР

Слова, ты мая Айчына...

«Беларускае слова, ты мая Айчына! Ты, як дзяцінства, ідзеш за мною. Слова матчынае, ты мая сляза!» — з гэтых радкоў, прамоўленых артысткай тэатра паэзіі «Балаган» з Беласточчыны ліцэісткай М. Аліфер, пачалася ў Доме літаратара прэм'ера кнігі Сакрата Яновіча «Самасей», выпушчанай выдавецтвам «Мастацкая літаратура».

Вёў вечар намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі А. Пісьмянкоў, гучалі творы беластоцкіх літаратараў.

Віноўнік урачыстасці С. Яновіч пазнаёміў прысутных са сваімі творамі, адказаў на шматлікія пытанні.

П. ГАРДЗЕЕУ.

Час праз гарады

«Архітэктура гарадоў Верхняга Прыдняпроўя XVII — сярэдзіны XIX ст.» І. Слюньковай, выдадзеная «Навукай і тэхнікай», узнаўляе гісторыю развіцця гарадоў усходняй часткі Беларусі, калі яны ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай, арганізацыі Магілёўскага намесніцтва пасля далучэння да Расіі. Ёсць мажлівасць зрабіць падарожжа ў тагачасныя Магілёў, Гомель, Шклоў, Чачэрск, а праз жыццё гарадоў бліжэй спазнаць і саму эпоху.

ФЕСТЫВАЛІ

І новая, і розная...

Калядным вечарам 25 снежня ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі адгучала апошняя канцэртная праграма Фестывалю новай беларускай музыкі. Багатае было калядаванне: містэрыя для баса і сімфанічнага аркестра «Францыск» А. Літвіноўскага; эскізы для аркестра з таямнічаю назваю «Поразава» — новы твор Я. Паплаўскага, навеяны мроямі пра роднае мястэчка; ужо знаёмая слухачам сімфонія У. Кандрусевіча «Плач перапёлкі» па матывах прозы І. Чыгрынава, — такі эмацыянальна - эстэтычны набытак дапоўніў уражанні заўзятых наведнікаў фестывалю. Акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі іграў у той вечар пад кіраўніцтвам свайго мастацкага кіраўніка В. Дуброўскага, саліраваў артыст ДАВТа А. Гардынец. Прыгадаем, што адкрываўся Фестываль новай беларускай музыкі дэбютам камернага аркестра Гродзенскай гарадской капэлы пад кіраўніцтвам дырыжора У. Борматава. «Перадкалядную эстафету» пераняў Сімфанічны аркестр Дзяржтэлерадыё рэспублікі пад кіраўніцтвам В.

Галоўны дырыжор Сімфанічнага аркестра Дзяржтэлерадыё Валерый ЛЯВОНАЎ.

Фота У. ПАНАДЫ.

Лявонава, у праграме якога асабліва вылучылася новая Восьмая сімфонія Д. Смольскага. Камерныя вечары поўніліся самай рознай музыкай, якая то ўзнімала настрой, то выклікала засмучэнне, то пакідала душу абыякавай, то абуджала радасныя думкі... Канцэрты фестывалю далі спажыву для разваг, і плён тых разваг чытачы з часам убачаць у нашых публікацыях.

З'ЕЗДЫ

Таварыства ёсць... Філосафы? Будуць!

На першым з'ездзе Беларускага філасофскага таварыства, які прайшоў нядаўна, прыняты яго статут. Гэта добраахвотнае навуковае згуртаванне, у якое могуць уваходзіць як грамадзяне Рэспублікі Беларусь, так і замежных краін. Прэзідэнтам Філасофскага таварыства выбраны акадэмік АН Беларусі, дырэктар Інстытута філасофіі і права Д. Шыраканаў.

БЕЛАРУСКАЕ ЗАМЕЖЖА

«Голас часу» з Лондана

У шостым нумары (лістапад — снежань) царкоўна-грамадскага часопіса «Голас часу» ёсць шэраг матэрыялаў, якія, думаецца, зацікавяць самага шырокага чытача. Прыцягвае ўвагу артыкул А. Мірановіча «Культы святых на Беларусі». «Тайныя свіслацкія гурткі «навуковы» і маральны». 1819—1820 гады» — тэма публікацыі С. Таляронка. Н. Сцяжко запрашае на экскурсію «Па залах музея Алеся Белакоза». «З гонарам кажу, што я беларус...» — гутарка С. Чыгрына з А. Іверсам. Змешчаны заканчэнне артыкула Ю. Весялкоўскага «Першая беларуская арганізацыя ў Вялікабрытаніі і яе духоўныя і палітычныя апекуны», вершы С. Валодзькі і С. Чыгрына, згадкі аб перажытым В. К. «Мае горкія ўспаміны» — аднаго з вязняў, каго абвінавацілі ў пасляваенны час у нацыяналізме, і шэраг іншых матэрыялаў.

Алесь ДРАНЕЦ,

скульптар:

— Не толькі мінулы, але 1991 і 1990 гады прайшлі для мяне пад знакам Скарыны. Я браў удзел у конкурсе на помнік першадрукару для Менска. Мне пашчасціла перамагчы, і вось ужо болей года я працую над помнікам, маючы афіцыйны заказ. Можа, каму-небудзь гэта дзіўна, але перамога ў конкурсе не надала мне ўпэўненасці, што я здолею зрабіць помнік Скарыну. Дакладней, помнік, варты Скарыны. Гэта ўпэўненасць прыйшла да мяне толькі зараз. Творчая фантазія павінна адштурхоўвацца ад рэалій жыцця. Таму, беручыся за партрэт гістарычнай асобы, мастак павінен, наколькі патрабуе тэма і дазваляе час, вывучыць эпоху, да якой належыць ягоны герой. Увогуле манументальныя аб'екты не робяцца знянацку. Архітэктурна-пластычныя ансамблі фарміруюцца дзесяцігоддзямі.

Сёння я бліжэй да разумення Скарыны ў кантэксце еўрапейскага Рэнесансу і беларускага Адраджэння, чым тры гады ці нават год назад. Цяпер я ведаю, што зраблю помнік. Але толькі ў тым выпадку, калі ён патрэбен гораду і дзяржаве. Уражанне такое, што, адсвяткаваўшы 500-годдзе Першадрукара, пра Скарыну проста забылі да наступнага юбілею.

Спадзяюся, што ў новым годзе нарэшце высветліцца, якая ўстанова — гарвыканком, Міністэрства культуры або адпаведная камісія Вярхоўнага Савета — павінны паклапаціцца аб ушанаванні памяці беларускага генія. А я як мастак сваю справу фактычна ўжо зрабіў.

Яўген ПАПЛАЎСКІ,

дырэктар нацыянальнага творчага аб'яднання «Беларуская Капэла»:

— Год 92-гі стаўся для нас знамянальным: 29 мая быў падпісаны міністрам культуры загад аб стварэнні «Беларускай Капэлы». Ідэі нашага маладога супольніцтва, падтрыманыя не проста ў асвечаных колах мастацкай інтэлігенцыі, музычнай грамадскасці, а і ў афіцыйных структурах (адзначу асабліва зацікаўленае стаўленне Камісіі Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны, спадароў Н. Гілевіча, Я. Цумарава), — гэтыя ідэі пачалі ажыццяўляцца. Нагадаю, што ў лістападзе адбыўся II Міжнародны фестываль «Адраджэнне капэлы», канцэрты якога адлюстравалі тыповую для беларускіх земляў у XVIII ст. панараму: былі прадстаўлены опера, балет, кантатна-аратарыяльная, камерна-вакальная ды інструментальная музыка. Пачалося стварэнне архіва «Беларускай Капэлы». бібліятэку папоўнілі вернутыя з нябыту ноты твораў, неадлучаных ад гісторыі культуры нашага краю: опера Д. Паізіелы «Уяўная каханка», балетная музыка Э. Ванжуры, М. Радзівіла, па-майстэрску аранжыраваная капельмайстрам У. Байдавым для выканання на фестывалі, партытуры В. Казлоўскага, песняспевы уніяцкай царквы з Полаччыны, творы для гітары. фартэпіянныя п'есы М. К. Агінскага і інш. Распачалося і выданне першага зборніка — «Беларуская гітарная музыка», куды ўключаны ўрыўкі з «Полацкага сшытка», «Віленскага сшытка» ды «Ліцвінскія фантазіі» В. Жывалеўскага, дарэчы, укладальніка зборніка. Гэты навадрук адлюструе фірменны выдавецкі стыль Капэлы (гравюры зроблены мастаком М. Бараздыкам). Наладзілі мы і кантакт з маскоўскай фірмай грамзапісу «Мелодия»: ужо ёсць дамоўленасць, каб на аснове фондавых запісаў Беларускага радыё выпусціць першы таксама фірменны «капэлаўскі» дыск старадаўняй музыкі Беларусі. Увесну плануем правесці Дні польска-беларускай музыкі (4 канцэрты ў Мінску, затым — у Варшаве), з удзелам нашага «Класік-Авангарда» ды камернага калектыву з Польшчы. А на восень рыхтуем III Міжнародны фестываль «Адраджэнне...» Згодна з канцэпцыяй, пра якую неаднойчы распавядаў у «ЛіМе» мастацкі кіраўнік нашага аб'яднання В. Скорабагатаў. адбудзецца паказ музыкі, якая сёння пішацца і сёння ж выконваецца, а значыць і паказ асноўных напрамкаў новай музыкі, што існуюць у розных кампазітарскіх школах свету. Дыпламатычныя службы дапамагаюць нам у падрыхтоўцы гэтага фестывалю, на якім мы спадзяёмся сустрэцца з музыкантамі Польшчы, ФРГ, Фінляндыі, Літвы, Масквы, Ерусаліма. З нашага боку ўдзельнічае «Класік-Авангард». які выканае кантату В. Капыцько «Страсці паводле Іяана», камерны балет на маю музыку (пішу таксама музыку для новага сцэнічнага відовішча «Ружа і крыж»), шэраг сучасных п'ес для розных інструментальных складаў. Плануецца тады ж і правядзенне майстар-класаў для маладых кампазітараў, пад кіраўніцтвам З. Краўзэ з Варшавы, Э. Дзянісава з Масквы, вядучых беларускіх майстроў кампазіцыі. Гэта планы на лістапад, але мы спадзяёмся, што яшчэ адзін цікавы фестываль адбудзецца ў маі: Гродзенская гарадская капэла, створаная, дарэчы, таксама ў маі 92-га, мяркуе наладзіць фестываль імя Агінскіх з удзелам «Беларускай Капэлы» ды польскіх музыкантаў.

Ангеліна МАСЮТА,

інструктар лячэбнай хірургіі 1-й клінікі, дзіцячае аддзяленне:

— Новы год для мяне асабіста лепшае свята. Ён нясе новыя надзеі, новыя спадзяванні. Я люблю Новы год. Але святкаванне яго зводзіцца (калі не ўлічваць падарункаў родным і блізкім і ад іх таксама) да багатага застолля — і толькі.

На жаль, як святкаваць Каляды — я не ведаю. Не ўмею ні калядаваць, ні шчадраваць. Не навучылі нас гэтаму. Смутныя ўспаміны дзяцінства, як калядавалі ў бабкі ў вёсцы, вельмі таямнічыя і захапляючыя. Трэба нам вяртацца на кругі свая, спазнаваць, вывучаць народныя традыцыі, каб адзначаць народнае свята было цікава.

Мой уласны лёс неаддзельны ад лёсу Бацькаўшчыны. Спадзяюся, што рэспубліка наша адродзіцца, стане па-сапраўднаму незалежнай, моцнай дзяржавай, са сваёй мовай, адукацыяй, гісторыяй, культурай. Я прынцыпова не чытаю газет, якія ў нас выдаюцца на рускай мове, а тым больш друкуюць артыкулы супраць усяго беларускага. Я не адна ў нас у клініцы размаўляю на роднай мове (на жаль, мова мая яшчэ падобная на «трасянку»), мяне падтрымліваюць і доктар-стаматолаг, і лабарант. І ніхто ўжо не крывіцца, не адварочваецца, не смяецца. У адным я цвёрда пераканана: адраджэнне духоўнае прывядзе да адраджэння эканамічнага.

«Уперад ад камунізма»

На пачатку 1950 года, калі я працаваў у рэдакцыі пінскай абласной газеты «Палеская праўда», мяне нечакана выклікалі ў аддзел прапаганды ЦК КПБ. Размова была кароткай:

— Рэкамендуем вас рэдактарам газеты палітаддзела Лагішынскай МТС.

Ніякія пярэчанні з майго боку не прымаліся. Праз два тыднаменклатурных кадраў. Падбіралі новую пасаду і гэтаму чалавеку (назавём яго Міхайлаў). Вычыталі ў анкеце, што перад вайной ён некалькі месяцаў працаваў наборшчыкам у друкарні. Ну чым не загадчык сектара друку?

Так ён і сеў у адведзенае яму крэсла. А трымацца начальнікам ён мог. Заўсёды строгі погляд, добра пастаўлены камандзірскі голас, ваенная выпраўка. Адпаведнай была і яго апратка: гімнасцёрка колеру хакі, афіцэрскі рэмень, сінія галіфэ, хромавыя боты.

З'яўляючыся ў рэдакцыі, ён садзіўся за стол у кабінеце рэдактара, клаў перад сабой падшыўку газеты і доўга гартаў яе, робячы нейкія паметкі ў сваім блакноце. Пасля гэтага выказваў заўвагі, даваў указанні.

Так было і гэтым разам, калі ён прыехаў у Пінск, у рэдакцыю аб'яднанай газеты. Рэдактарам там быў даволі вопытны журналіст і ўмелы кіраўнік Міхаіл Раманавіч Гец. Больш за паўдня «вывучаў» Міхайлаў падшыўку газеты. Нарэшце падвёў вынікі:

— Ну што ж, Міхаіл Раманавіч, курс вы трымаеце правільны. Але ёсць адзін сур'ёзны недахоп.

— Сур'ёзны? — насцярожыўся рэдактар.

— Так-так... Чамусьці большасць артыкулаў у вашай газеце пачынаецца на літару «В». Трэба, дарагі таварыш, арыентавацца на «Правду». Там артыкулы пачынаюцца і на «О», і на «К», і на «Д»...

Рэдактар не ўстрымаўся:

— Я думаю, што галоўнае — змест артыкула, незалежна ад таго, на якую літару ён пачынаецца.

— Я не намераны ўступаць з вамі ў дыскусію. Заўтра ж на рэдакцыйнай лятучцы, а яшчэ лепш на адкрытым партыйным сходзе сур'ёзна абмяркуйце мае заўвагі і выпрацуйце адпаведныя мерапрыемствы. Лічыце гэта партыйным указаннем!

Кіраваў Міхайлаў газетамі да выхаду на пенсію.

Ах, якіч яго почырк!..

Без ведама райкома партыі рэдактар не меў права прымаць на работу новых супрацоўнікаў. Калі ўзнікла патрэба ў кадрах — кожная кандыдатура абмяркоўвалася ў бюро РК КПБ.

Запомнілася пасяджэнне бюро Лунінецкага райкома партыі, дзе рашалі, каго даць мне ў намеснікі. Я прапанаваў на гэтую пасаду маладога здольнага журналіста. Аднак яго кандыдатура была адмецена з парога — «вельмі малы партыйны стаж».

Сакратар райкома, якая займалася пытаннямі ідэалогіі, — мажная жанчына з двума падбародкамі — прапанавала кандыдатуру свайго знаёмца.

Чалавека гэтага я ведаў, нічога дрэннага пра яго сказаць не мог, але для газеты ён быў не прыдатны, не было ў яго той божай іскры, без якой не можа быць журналіста. Усё гэта я выказаў і членам бюро.

Сакратар райкома незадаволена нахмурыла бровы і рашыла аглушыць мяне важкім, на яе думку, аргументам:

— А ты бачыў яго почырк? Раней так прыгожа толькі на грошах распісваліся... Кожная літара, як вылітая...

БЫЛО

1944 год. Яшчэ не скончылася вайна з гітлераўцамі. Праўда, вялася яна ўжо там, на захадзе, дзе пяць гадоў таму брала свой пачатак. А на нашай вызваленай ад ворага зямлі пачалася аднаўленчая праца.

У тым далёкім сорак чацвёртым ступіў я па волі лёсу на журналісцкую сцежку. І доўжылася гэтая сцежка аж 40 гадоў. Быў рэдактарам раённай газеты ў Жабчыцах, Лунінцы, Іванаве, рэдактарам газеты палітаддзела МТС у Лагішыне, карэспандэнтам абласных газет «Палеская праўда» (г. Пінск) і «Заря» (г. Брэст). Працаваў і пры Сталіне, і пры Хрушчове, і пры Брэжневе.

Пра многае, што хвалявала, з-за чаго балела сэрца, пісаць забаранялася. Цэнзары бязлітасна выкрэслівалі ўсё, што выклікала ў іх падазрэнне. Даходзіла да абсурду. Напрыклад, на паласе, дзе змяшчаўся партрэт Сталіна, не магло быць крытычнай нататкі. Не дазвалялася нават упамінанне аб стыхійных бедствах, аб цэнах на рынку і г. д.

Вось некалькі згадак пра той час. Можа, яны паслужаць перасцярогай для тых, хто не супраць вярнуцца ў мінулае.

З этычных меркаванняў прозвішчы некаторых «герояў» не называюцца.

ні чытач павінен атрымаць першы нумар газеты. Назва яе — «Уперад да камунізма».

Задача па тым часе вельмі складаная. Пачынаць трэба з нуля. У раённай друкарні абмежаваны запас шрыфтоў. Трэба папоўніць яго. А як? Неабходна было падумаць і пра загаловак газеты.

У Пінску тады жыў знакаміты разбяр па дрэву Шахновіч. Па маёй просьбе ён і нарэзаў на цвёрдай грушавай дошчачцы патрэбнае мне клішэ.

Да вызначанага тэрміну я падрыхтаваў неабходныя матэрыялы. У раённай друкарні зрабілі набор і вёрстку першага нумара. І вось познім вечарам, калі была закончана апошняя праўка газеты, у друкарні з'явіўся цэнзар (загадчык аддзела райкома партыі). Чытаў ён марудна, пыхаў папяроскай, глыбакадумна моршчыў лоб. У тэксце, відаць, нічога падазронага не заўважыў, але і з дазволам друкаваць не спяшаўся, усё круціў у руках двухпалоску, то падносіў яе бліжэй да святла, то набліжаў да вачэй. Нарэшце вынес прысуд:

— Трэба мяняць загаловак.

— Які загаловак? — не зразумеў я.

— Загаловак газеты... Што гэта за шрыфт?!

— Яго нарэзаў умелы майстар, — даводзіў я.

— Трэба яшчэ разабрацца з гэтым майстрам. Паглядзі ўважліва на літару «Д». Яе ж цяжка адрозніць ад літары «А»... Чалавек з аслабленым зрокам можа прачытаць і так: «Уперад ад камунізма»... Ты разумееш, чым гэта пахне?

Даказаць цэнзару, што літара «Д» зусім прыстойная, было дарэмнай тратай часу. Давялося прасіць наборшчыкаў, каб падабралі больш-менш падыходзячы для гэтай мэты шрыфт і з такім прымітыўным загалоўкам газета выйшла ў свет.

Чаму на літару «В»?

На пасаду загадчыка сектара друку абкома партыі гэты чалавек, можна сказаць, трапіў выпадкова. Здарылася гэта тады, калі тры вобласці аб'ядналі ў адну — Брэсцкую. З трох абкомаў давялося рабіць адзін. Узнікла праблема занятасці

Яна была ўпэўнена, што почырк — гэта галоўнае для журналіста.

«Ён у нас значыцца...»

Начальнік раённага аддзела КДБ выбіраўся, як правіла, членам бюро райкома партыі. Пры вырашэнні кадравых пытанняў яго голас быў рашаючым.

Прыгадваецца такі выпадак. На пасяджэнні бюро Лагішынскага райкома абмяркоўвалася кандыдатура на пасаду памочніка начальніка палітаддзела МТС па камсамоле. Была толькі адна прапанова.

— Я супраць, — заявіў начальнік райаддзела КДБ. — Прапануемы вамі чалавек значыцца ў нас.

— А што там у яго? — пацікавіўся першы сакратар райкома Шарыпа.

— Гэтага я сказаць не магу...

Шарыпа пакрыўдзіўся і рашыў не здавацца. Справа дайшла да абкома партыі.

Як было далей, мне расказваў потым сакратар Лагішынскага РК КПБ па кадрах Раманюк. Першы сакратар Пінскага абкома партыі Цецюшаў запрасіў да сябе намесніка начальніка абласнога ўпраўлення КДБ. Той і праясніў таямнічасць гэтага «значыцца»:

— Выказваў незадаволенасць картачнай сістэмай на хлеб.

— А ты задаволены картачнай сістэмай? — абурыўся Цецюшаў. — Не ведаеш, што гэта часовая бяда? Забірай свой талмуд і ідзі з вачэй!..

Цецюшаў у хуткім часе пакінуў Пінск. Можа, прычынай паслужыў і гэты інцыдэнт? Хто ведае. У Беларусі ж тады лютаваў нядобрай памяці Цанава.

Падарунак Сталіну

Пазванілі з абкома партыі: набліжаецца 70-годдзе Сталіна. Трэба разгарнуць усенародную падрыхтоўку да гэтай знамянальнай даты, арганізаваць збор падарункаў вялікаму правадыру.

У Жабчыцкім райкоме партыі пасля гэтага званка быў неадкладна сабраны актыў. Сакратар райкома засяродзіў увагу прысутных на палітычнай важнасці маючай адбыцца па-

дзеі, даў рэкамендацыі па зборы падарункаў, падкрэсліўшы, што перавага будзе аддавацца вырабам народных умельцаў.

Атрымаўшы такое заданне, стараста вёскі Малоткавічы разам з упаўнаважаным райкома неадкладна прыступілі да справы.

— Ёсць у вашых людзей рэчы, што згадзіліся б для падарунка? — пацікавіўся ўпаўнаважаны.

— Знойдзем! — упэўнена адказаў стараста. — Адна наша жанчына тчэ вельмі прыгожыя настольнікі. Залюбуешся!

— А яна згодзіцца аддаць такую рэч?

— Абыдземся без згоды. А пачне вякаць, дык я прымушу яе прыкусіць язык... Яе родзіч у час акупацыі паліцэйскім быў...

Аперацыя цягнулася нядоўга. Ужо праз якую гадзіну стараста з выглядам пераможцы крочыў па вуліцы з прыгожым саматканым настольнікам пад пахай. А ў сваім двары нібы па нябожчыку галасіла абрабаваная жанчына.

Не ведаю, ці трапіў «падарунак» да Сталіна. Можа, і цяпер дзе ляжыць у запасніках музея той прыгожы настольнік, выткані сялянкай з вёскі Малоткавічы?

.

Дабавіў солі

У Жабчыцах рашылі правесці раённы з'езд жанчын. Прадугледзелі, здавалася, усё. У аддзеле прапаганды райкома напісалі даклад, з якім павінен выступіць першы сакратар. Каб людзі ахвотней збіраліся, кожнаму дэлегату паабяцалі прадаць па кілаграму солі (у той першы пасляваенны год гэты тавар быў, як кажуць, на вагу золата). Загадзя збілі з пагабляваных дошак лаўкі і паставілі іх у зале сталоўкі, бо клуба ў райцэнтры яшчэ не было.

І вось, калі ўжо трэба было пачынаць з'езд, хтосьці ўспомніў, што не падрыхтавалі выступаючых. Хіба ж можна абмежавацца толькі дакладам? Трэба, каб і ад імя дэлегатак хто-небудзь выступіў.

Выправіць справу ўзяўся сакратар райкома па кадрах Рыгор Пятровіч. Яму была знаёма адна дэлегатка з вёскі Хойна — жанчына даволі прывабная і бойкая.

Размову з ёй сакратар павёў здалёк:

— Хочаш, Ганна, атрымаць яшчэ адзін талон на соль?

— А хто адмовіцца? — загарэліся вочы ў жанчыны.

— Тады табе трэба выступіць на з'ездзе...

— Што ж я магу сказаць?

— Ну, скажаш слоў колькі пра сябе, пра жыццё... А закончыш, як і належыць, падзякай Сталіну...

І Ганна выступіла. Расказала, з якой цяжкасцю яна прывучала вясной карову цягаць плуг, бо каня ж няма, як летам жала сярпом траву ў кустах, каб назапасіць сена карове на зіму. А закончыла, як і раіў сакратар:

— Дзякуй бацьку роднаму Сталіну за шчаслівае жыццё!— Паглядзела на Рыгора Пятровіча, які сядзеў у прэзідыуме, і дадала: — І вам дзякуй, таварыш сакратар, за соль!

У зале грымнулі апладысменты. Мацней за ўсіх пляскаў шырокімі далонямі Рыгор Пятровіч.

І ён кіраваў дзяржавай...

Як раней выбіралі дэпутатаў у Саветы, добра памятаюць не толькі людзі майго пакалення. На першым этапе партыйныя органы на месцах падбіралі некалькі кандыдатур. З дапамогай супрацоўнікаў КДБ правяралася кожная дэталь іх жыццёвага шляху, палітычная надзейнасць іх блізкіх і нават далёкіх родзічаў. Затым спіс гэтых кандыдатаў прасейваўся ў абкоме партыі, потым у ЦК. Калі справа ішла пра кандыдата ў Вярхоўны Савет СССР, то канчатковае рашэнне прымалася ў Маскве. І ўжо адтуль давалася «дабро» на вылучэнне «надзейнага» кандыдата— аднаго на выбарчую акругу. Потым на прадпрыемстве або ў калгасе праводзіўся сход, дзе пад арганізаваныя апладысменты вылучаўся праверaны кандыдат. Ніякай самадзейнасці тут не дапускалася, усё было распісана ў вярхах.

Дык вось, праз такое сіта прайшоў стары непісьменны селянін з вёскі Бастынь Лунінецкага раёна Барыс Нікановіч Цяльпук. Галоўным чынам быў улічаны той факт, што ў свае 58 гадоў Б. Цяльпук у час гітлераўскай акупацыі ўзяў паляўнічую стрэльбу і разам з усей сваёй мнагадзетнай сям'ёй падаўся ў лес — быў камендантам сямейнага партызанскага лагера.

Два скліканні запар Б. Цяльпук быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР. І ў раёне яму падабралі адпаведную пасаду: навучылі так-сяк распісвацца і прызначылі старшынёй Дзятлавіцкага сельсавета. Неабходную дакументацыю вёў сакратар, ён жа зачытваў непісьменнаму старшыні паперы, што прыходзілі з райвыканкома, а сам старшыня «ажыццяўляў кіраўніцтва».

Журналісцкая цікаўнасць прывяла мяне аднойчы на кватэру да Цельпука. Было гэта ў 1953 годзе, неўзабаве пасля смерці Сталіна, Барыс Нікановіч толькі што вярнуўся з Масквы, з сесіі. Ездзіў туды не адзін, а з жонкай, каб і яна «пабачыла Маскву».

— Як там было на сесіі без Сталіна? — пацікавіўся я.

— Ну як было? Сабраліся, значыцца, усе... Малянкоў сядзіць засмучаны... І мы засмучаныя... А вечарам пайшлі са старой у цырк. Выходзіць якаясь дзяўчына... бы голая — тут крышку адзета, тут (ён паказвае рукамі на грудзі і ніжэй пояса), і раздзіраецца, раздзіраецца... А тады вышаў кловун у вялікіх бацінках і давай усіх смяшыць...

Вось і ўвесь расказ Барыса Нікановіча пра паездку ў Маскву, пра сесію...

Даяркі для нарады

У хрушчоўскі час вельмі часта праводзіліся розныя нарады. Найбольш гаварылі пра сельскую гаспадарку. Знаходзілі, як тады казалі, маякоў — перадавых кукурузаводаў, даярак, свінарак — і заклікалі браць з іх прыклад. Беспартыйную даярку Загладу Мікіта Сяргеевіч нават на пленум ЦК запрашаў, і слова даваў ёй для выступлення.

Не адставалі ад гэтай моды і ў раёнах. У Лунінцы амаль што кожны месяц збіралі то перадавых даярак, то свінарак, то механізатараў. Кожны старшыня калгаса стараўся, каб прадстаўнікі яго гаспадаркі паказалі сябе перад раённым начальствам як найлепш.

Памятаю, усе вельмі захапляліся даяркамі калгаса «Сацыялізм» — прыгожыя дзяўчаты ўмелі і на трыбуне трымацца, і песню праспяваць, калі пасля нарады разам са сваім старшынёй вячэралі ў рэстаране.

— Як гэта вам, Іван Пятровіч, удалося падабраць такіх даярак? — спытаўся я аднойчы ў старшыні калгаса І. П. Жука.

— Маладыя, вясёлыя, перадавыя.

Будучы ў падагрэтым настроі, ён прызнаўся:

— Перадавыя, браце, працуюць на ферме. Каб я вазіў іх на кожную нараду, то каровы даўно б запусціліся. А вось гэтых дзяўчатак я важу з сабой без асаблівага ўрону для гаспадаркі. І начальства задаволена, і самому, як бачыш, весялей...

А. КАЎКО.

З ПАЭТЫЧНАЙ ПОШТЫ

Яўген ГУЧОК

ЗАПІСЫ

●

Запісная мая кніжка
Не змяшчае адрасоў
Самых верных, самых блізкіх,
Самых выбраных сяброў,

Бо яны ў яе не лезуць
Ані гэтак, ані так...
Як размесціш там гарэзу
Ветра,
Сонца там размесціш як!!

●

У польскі бок глядзіць
«заходнік»,
«Усходнік» — у маскоўскі бок;
Сапраўдны ж беларус —
зямлі сваёй не шкоднік,
Шукае дома,
дзе ёсць Бог.

●

Скарына ведаў, што нашчадкі
Да кніг яго не дакрануцца;
Але тварыў іх без аглядкі, —
Каб ў сэрцы Бога адгукнуцца.

●

Яшчэ і той на Беларусі
Найплённа мову вынішчаў,
Хто ў кар'ерысцкае спакусе
На ёй пра Леніна пісаў.

●

Мяне ён вучыць Беларусь
любіць,
Якая без яго, маўляў, не можа
жыць.

●

Сядзіць над чыстым аркушам
паперы,
Дзеля якой няведама халеры...

●

Ты мне сцвярджаеш,
што няўдачнікаў
Звычайна мітынгі збіраюць;
А лепш прыгледзься,
як удачнікі
У святле маралі выглядаюць.

●

Дакіраваліся кухаркі,
Што ўсе скрабуць навокал
каркі.

●

Не трэба, каб хтосьці
Мне неба шукаў
І тут на Зямлі
Каб ён мной папіхаў.

●

Калі за саборам
Схавана нахлебнасць,
Тады там саборнасць —
Сарайнасць і хлеўнасць.

●

Папы і ксяндзы і ў сягоннішнім
выглядзе —
Агенты цароў, каралёў, сатаны;
Не Праўдзе, не Ісціне,
шкурнасці й выгадзе
На беларускіх абшарах
служаць яны.
Мне трэба,
Хрыстос каб на нашай
на глебе
Пакутаваў з намі і з намі
ўскрасаў...
Так, мне Беларусь незалежная
трэба,
Якою Пан Бог яе колісь
стварaў.

●

Касцёл — харашун, прыгажуня
— царква,
Глянеш — аж кругам ідзе
галава...
А ў серадзіне
Пасерадзіне —
Паланізатары,
Русіфікатары —
Ліха іх матары —
Каланізатары.

●

А у гэтай галоўцы
Розуму, нібы ў маркоўцы
Ці ў бульбіне, што куры
Паклявалі здуру.

●

Мітрапаліту Мікалаю
Я крыж і руку цалаваў,
Бо ён для роднага для краю
У чужыне мову захаваў.

●

Даваць весялосць здаровым —
Ці паэзіі гэта задача!!
Павінна яна ўздымаць галовы
Тым,
здароўя ў каго нястача, —
Здароўя цела, душы здароўя,
Ператварылі каго ў пагалоўе,
Хто нават забыўся, што ён
чалавек,
Сабой хто ўяўляе маральных
калек.
(Я ўжо не кажу пра адсутнасць
Бога:
Да Бога страшэнна цяжкая
дарога).
. . . . . .
Як ува ўсіх,
у паэта свае задачы;
І помніцьма цвёрда,
хто да чаго прызначан.

РЭЗАНАНС

ФАЛЬВАРАК БЕЛАЯ

Маю ўвагу прыцягнуў артыкул Германа Брэгера «Вялікая гісторыя малых паселішчаў» («ЛіМ» за 4 снежня 1992 г.). Далучаюся да яго думкі, выказанай у гэтым загалоўку, а таксама прапановы, што трэба выявіць усе белыя і існуючыя малыя паселішчы, вывучыць іх гісторыю і адзначыць іхняе знаходжанне спецыяльнымі шыльдамі з указаннем назвы, даты ўзнікнення ці першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах. Вядома, цяжэй за ўсё пісаць гісторыі былых пасяленняў, адшукаць іх селішчы.

На нашу думку, тут без мясцовых краязнаўцаў не абысціся. І добра было б, каб іх пошукі часцей траплялі ў друк. Прапаную ўвазе чытачоў гісторыю фальварка Белая.

Каля сарака гадоў мінула, як не стала гэтага пасялення. Але памяць аб ім не згубілася ў часе. Незабыўнасць яго звязана з імем Адама Міцкевіча. Тут бываў паэт. Тут жыла ягоная цётка Барбара, родная бацькава сястра.

Знаходзіўся фальварак Белая недалёка ад міцкевічаўскага Завосся, па другі бок Жарновай гары. Мясціна гэта, можна сказаць, роўнааддаленая ад вёсак Войкавічы, Круглікі, Мелехавічы. Ад кожнай з іх вядзе сюды сцежка. Адзінай прыкметай, што было тут абжытае месца, з'яўляюцца філяры (калоны) ад калгаснага цялятніка, які быў пабудаваны на дзядзінцы фальварка. Калісьці фальварак быў добра забудаваны, меў прасторны двор і вялікі сад. Хата апошняга гаспадара яго (пана Мадэста Мялеўскага) была прададзена калгасам на пачатку пяцідзесятых гадоў, і жыццё тут спынілася.

Барбара Міцкевіч была замужам за Вінцэнтам Стыпулкоўскім, уладаром Белай. Было ў іх два сыны і чатыры дачкі. Самай малодшай дачкою была Сэрафіна, якая выйшла замуж за Ігната Скуратовіча. Мелі яны пяцёра дзяцей. У спіску землеўласнікаў Мінскай губерні на 1889 год гаспадаром Белай значыцца Скуратовіч Люцыян Ігнатавіч, сын Сэрафіны, стрыечнай сястры Адама Міцкевіча. Фальварак меў на гэты час 70 дзесяцін зямлі.

У 1897 годзе Люцыян Скуратовіч у пісьме да пісьменніка Аляксандра Ельскага пісаў, што ў яго захоўваецца пенал, які падарыў Адам Міцкевіч сваёй стрыечнай сястры Карнэлі Стыпулкоўскай, а яго цётцы. Пенал быў упрыгожаны золатам, і ў ім знаходзілася ручка, якою пісаў паэт. На гэты час у Белай было і «люстэрка Адама», якім заўсёды карыстаўся Міцкевіч, калі гасцяваў у цёткі Барбары.

Што сталася з гэтымі рэчамі пазней, невядома.

Сэрафіна Скуратовіч з дому Стыпулкоўскіх памерла 14 лістапада 1897 года, пахавана на цвінтары ў Крашыне. Магіла знаходзіцца ў цэнтры могілак. Захаваўся на ёй чыгунны помнік, надпіс чытаецца добра.

Стрыечны пляменнік Адама Міцкевіча Люцыян Скуратовіч не меў сваёй сям'і, пасля яго смерці фальварак перайшоў да ўжо згаданага намі Мадэста Мялеўскага, сына ягонай сястры. Праўда, пан Люцыян меў двух пазашлюбных сыноў, якім, як кажуць мясцовыя людзі, падарыў па добрым кавалку зямлі. Спачывае ён на вясковых могілках блізка ад Белай.

Старэйшыя жыхары Войкавіч памятаюць, што недалёка ад панскай сядзібы, на ўзвышшы, быў бярозавы гай. І грыбы раслі ў ім. І ад белізны бяроз было тут светла і чыста. Ці не таму і назвалі гэтую мясціну Белая?

Цяпер гаю няма. Але светласць адчуваецца. Ідзе яна, вядома, ад твораў вялікага Міцкевіча, ад яго асобы.

Аляксандр ШОЦКІ,
настаўнік.

г. Баранавічы.

Літаратура ў краіне Сакрэту

(Пачатак на стар. 4).

Незалежна ад усведамлення задачы, на яе карысць пачалі працаваць (непасрэдна ці ўскосна) літаратары самых розных пакаленняў, эстэтычных і духоўных арыентацый (Васіль Быкаў, Іван Ласкоў, Алег Бембель, Сяргей Дубавец, Юрась Залоска, іншыя...).

Наколькі шлях інтэлектуалізацыі нацыяналізму будзе прыдатным і надалей — акрэсліцца потым, але ў любым выпадку ён не станецца марным, бо адным зместам супадае з экзістэнцыяльнай патрэбай у нацыянальнай завершанасці, а другім — з форматворнай дамінантай еўрапейскасці — інтэлектуальным мысленнем.

Побач з гэтай тэндэнцыяй выявілася наступная, у нейкім сэнсе паралельная ёй і адначасна супрацьлеглая, якую я паспрабую пазначыць, як нацыяналізацыя эстэтыкі. Схільнасць да яе выказалі тыя з літаратараў, якім нацыяналізм абрыдзеў, як толькі прыдбаў статус дазволенай ідэалогіі. Побач з «апазіцыянерамі» тут аказаліся і «нацыяналісты», скінутыя ў эстэтызм прыродай свайго таленту.

Першыя і другія супольна праз мову, беларускую ментальнасць спрабуюць адаптаваць да кантэксту нацыянальнай культуры (наколькі гэта магчыма ў прынцыпе) эстэтычныя ідэі блізкіх і далёкіх эпох, блізкага і далёкага замежжа.

Пералік прыхільнікаў эстэтычнага рамантызму, натуральна, не абмяжоўваецца прозвішчамі Леаніда Дранько-Майсюка, Уладзіміра Арлова, Алеся Асташонка, Алега Мінкіна, але творчасць гэтых літаратараў у нейкай ступені адлюстроўвае тэндэнцыю да нацыяналізацыі эстэтыкі.

У звязку з вылучаным накірункам размовы, пэўна, не абысціся яшчэ без аднаго азначэння, якое падшукаем, каб пазбегнуць трасянкі, у той жа стылёвай плыні — інтэлектуалізацыя эстэтыкі. Гэтая тэрміналагічная фігура, бадай што, не патрабуе вытлумачэння. Адно паспрабуем персаналізаваць і яе: Алесь Разанаў, Галіна Булыка, Ігар Бабкоў...

І апошняе: камерцыялізацыя нацыяналізму. Падкрэслім, тэрмін «камерцыялізацыя» гэтым разам ужываецца як эстэтычная катэгорыя, за якой стаіць свядомая спроба рабіць літаратурную прадукцыю для масавага ўжытку, але на грунце сапраўдных эстэтычных каштоўнасцей. Дарэчы, камерцыйную групоўку «на ўзбочыне» (Максім Клімковіч, Міраслаў Шайбак, Уладзіслаў Ахроменка...) зусім марна спалучаюць з Адамам Глобусам і Уладзімірам Сцяпанам, эстэтычна яны знаходзяцца ў розных вымярэннях...

Здаецца, досыць, і так занадта. Гульня ў сістэматызацыю — бясконцая і блытаная, як лабірынты цара Мідаса. Таму адразу заўважым, што гэты падзел па прыналежнасцях да пануючых сёння (на маю выдумку) тэндэнцый і адвольны, і ўмоўны, і, урэшце, не надта сур'ёзны, нягледзячы на ўсю навукападобнасць лексікі і стылёвую фанабэрыстасць.

А напрыканцы пра тое, што ў нечым падмацоўвае, а ў нечым адмаўляе папярэдняе (куды падзецца — амбівалентнасць!).

Нацыяналізм — парэнча над безданню. Дазваляецца ненавідзець нацыяналізм усёй нянавісцю сэрца за тое, што ён трымае цябе, як вяроўка вісельніка, але паспрабуй адштурхнуць парэнчу — і адразу ляціш у нікуды.

Праўда, пры жаданні можна рабіць выгляд, быццам ты адважна крочыш над прадоннем, ні на што не абапіраючыся, аднак гэта ўсяго толькі фіглярства. Сапраўды мужныя (Купала ці Уітмен, Дастаеўскі ці Хайдэгер) не фіглярнічалі. Яны ведалі, што іх трымае, і не памыляліся ў глыбіні прадоння.

КАЗКІ ПЕРАБУДОВЫ

СЯМЕЙНЫ ПАДРАД

Сабраліся неяк у Маскве лідэры камуністаў і пачалі падлічваць вынікі сваёй дзейнасці. Хутка будзе 70 год, а што зроблена? Асабліва слаба ў галіне навукі. Усяго два ці тры Нобелеўскія лаўрэаты. Рашылі выявіць патэнцыяльных Ламаносавых і тэрмінова прасоўваць у сусветную навуку. Разаслалі ўстаноўку па рэспубліках.

У нашай акадэміі яе таксама атрымалі. Партком сабраў сакратароў, паставіў задачу. Сакратары з намеснікамі і кадравікамі зашамацелі паперамі. Кожны хацеў паказаць плён свайго ідэйнага кіраўніцтва. Але вось дзіва: няма ў нас на Беларусі вучоных сярэдняга веку, абавязкова камуністаў, якіх ведалі б за граніцай. Знайшлі ўсяго аднаго, але ўзняўся ён неяк без партыйнай апекі і хто ведае, што там у яго ў галаве. Як у ваду, дарэчы, глядзелі. Сёння там яму штомесячна плацяць 20000 долараў і, пэўна, задаволены. Іншыя акадэмікі і члены-карэспандэнты паўсвету аб'ездзілі, а ніхто іх не бярэ.

Далажылі вынікі пошукаў наверх, адтуль у Маскву. Праз нейкі час прыходзіць новае заданне. Знайсці мужа і жонку, сярэдняга веку, з вучонымі ступенямі, абавязкова камуністаў і беларусаў і каб было ў іх двое дзяцей — вучняў з добрымі адзнакамі. Нехта там наверсе ў ідэалагічным аддзеле надумаў прадэманстраваць сямейны падрад у навуцы. Па-іхняму што сахор, што лазер— адно і тое, бяры і варочай. Ніяк не маглі ўцяміць, што выбітны вучоны — гэта прадукт штучнай вытворчасці і патрабуе больш далікатных адносін.

І зноў парткам акадэміі сабраў сакратароў, ізноў зашамацелі паперамі кадравікі.

Але зноў асечка—зусім мала ў беларускай акадэміі беларусаў. Мяркуйце самі: прэзідэнт і намеснікі беларусы, а далей— пайшло-паехала. Можна сказаць, поўны інтэрнацыянал. Дырэктары інстытутаў, загадчыкі лабараторый, вучоныя сакратары — пераважна рускія, яўрэі, украінцы, толькі не беларусы. Ім, бедалагам, засталіся пасады старэйшых, звычайных і малодшых супрацоўнікаў ды яшчэ інжынераў і лабарантаў. Адным словам, так званая цяглавая сіла навукі.

Зноў сабраліся ў парткаме, выслухалі ўсіх, далажылі па інстанцыі аж у Маскву. Там сказалі: «Это хорошо, что интернационализм. А раз вы слабые в науке, то пашите, сейте, побыстрее наращивайте производство мяса, масла, яиц и прочих продуктов, за которыми в Москву ездит вся Россия. Наукой мы вас обеспечим». Так і зрабілі. Нават склалі праграму і назвалі харчовай. Раілі выканаць датэрмінова. Быў у нас тады на самым версе адзін вучоны аграном. За вочы яго ўсе звалі Шафёр. Ён са скуры вылузваўся, каб хутчэй выканаць гэты наказ. У абласцях і раёнах адна за другой праходзілі навукова-практычныя канферэнцыі па мясе, малацэ, яйках, угнаеннях і фуражы. Па ўсёй рэспубліцы раней набудавалі атрутных хімічных прадпрыемстваў, цяпер дабавілі быдла- і свінагадоўчыя комплексы і птушкафабрыкі. Усюды развесілі лозунгі: «Давай, давай, давай и побольше!». Трэба сказаць, давалі-такі добра. Стаіш другі раз на станцыі і дзіву даешся: дзе набылі столькі вагонаў-рэфрыжэратараў, што адзін за другім ідуць на ўсход. Адно цяжка было сказаць, колькі таго мяса атрымана на комплексах, а колькі на сельскіх выганах і ў хлеўчуках, без біялагічных дабавак і хіміі. Бо нашы працавітыя людзі і тут не ведалі ўпынку. Але ўсё ўключалася ў рахунак дасягненняў умелага кіраўніцтва. Устанавіўся нават нейкі баланс інтарэсаў. Туды — прадукты, адтуль — узнагароды. Дайшло да таго, што сярэдні партыйны кіраўнік меў больш узнагарод за бывалага франтавіка. Насіць іх толькі не адважваліся—брыдка ад людзей. Але ў анкеце яны мелі вагу. Можна было красці колькі ўлезе і не баяцца суда. З ордэнамі маглі хутчэй перавесці на вышэйшую пасаду ці нават забраць у Маскву. Але служылі яны часцей за ўсё як індульгенцыі на адпушчэнне грахоў, якіх заўсёды ў ардэнаносцаў было хоць адбаўляй. Дзеля гэтага і стараліся. У рэспубліцы ад гэтых узнагарод заставаўся гной каля кожнага комплексу, а вакол хімічных камбінатаў — атрута. Нашы эколагі падлічылі, што амаль тры тысячы ферм і комплексаў стаяць каля рэчак і атручваюць іх. Ва ўсіх вялікіх гарадах рэспублікі чадзяць хімкамбінаты. Атручваюцца грунтовыя воды, бо без меры сыплюць хімічныя ўгнаенні, дарэчы, дрэнна ачышчаныя.

Сёння той Шафёр на пенсіі. Урад узначальваюць людзі з навуковымі ступенямі і званнямі, але аўнотворчасць, прабачце, працягваецца, як і некалі. Далучыўся яшчэ Чарнобыль.

Акадэмія навук, скарочаная амаль напалову, працягвае змяншацца і цяпер, але ніхто гэтага не бярэ да галавы.

Калі трэба было карміць жывёлу, дык урад выдаў спецыяльную адозву: касіце, маўляў, сена, бо жывёла схуднее ці зусім здохне.

А калі б усур'ёз узяцца за навуку? Ад яе не пахне, ад яе не ўчадзееш, а прыбытак у многа разоў большы, чым ад жывёлагадоўлі. Ды і вывозіць навуку можна ў многія краіны, а не толькі ў Маскву.

Нашы продкі 400 гадоў назад адкрылі ў Вільні універсітэт. Дарэчы, першы ва ўсходняй Еўропе. Першыя надрукавалі кнігу. Былі ў нас вядомыя на ўвесь свет вучоныя, творы якіх тлумачылі на еўрапейскія мовы. На Літве (цяперашняй Беларусі) упершыню надрукавалі ў 1618 годзе буквар (адзін знаходзіцца ў Капенгагене, другі—у Лондане), а праз год і Граматыку Сматрыцкага, якую М. Ламаносаў назваў «вратами учености». 200 год, як нас далучылі да Расіі. Ніхто гэтага не хацеў. Што ні пакаленне — паўстанні. Пасля чарговага паўстання 1831 года цар зачыніў Віленскі універсітэт і забараніў беларускую мову. Лічыў—было за што. Калі паўстанцы падышлі да Вільні, да іх далучыліся амаль усе студэнты. З 47 прафесараў 36 былі свае, літоўскія.

Семдзесят год таму стала яшчэ горш. Хто не хацеў рабіць тое, што загадвалі, павінен быў валіць лес, капаць каналы, мыць золата на Калыме ці парыць зямлю ў Курапатах. Канешне, ніхто нам мяса не дасць, але трэба разам з прыбыткам лічыць і заганы. Ад навукі ж шкоды не будзе з гарантыяй. Не будзем жа мы, нейтральная ў будучым рэспубліка, працаваць над атамнай, вадароднай бомбай ці бактэрыялагічнай зброяй.

Нам трэба, як цяпер кажуць, перадавая тэхналогія. Якая? Па хімічных угнаеннях, лесу, торфу, ільну, машынах, прыборах. Дайце толькі магчымасць—людзі разбяруцца. Вунь японцы як разбагацелі, а што ў іх сваё? Вугаль, жалезная руда, галава і рукі. А хіба ў нас гэтага няма? Праўда, вугаль і руда яшчэ не чапаныя і ляжаць троіх глыбакавата. Але ж мы—людзі працавітыя. Нашы старыя працуюць да апошняга. Гэта цяпер пазней пачынаюць і раней канчаюць. Бо адвыклі. Калі даць гэтым людзям зямлю, яны накормяць сябе і другіх. Гэтак і з навукай. Калі на дыстанцыі школа—інстытут — прадпрыемства не па блату, а па здатнасці адбіраць лепшых і даваць ім магчымасць працаваць без велізарных падаткаў — на вынікі не доўга трэба будзе чакаць.

Дасць Бог, выкараскаемся з той багны, у якую залезлі па дарозе ў светлую будучыню. А Акадэмію навук скарачаць утрая не мае сэнсу. Трэба пазбавіцца ад баластных кадраў—згодзен. Але ж робіцца пакуль што наадварот.

Вячаслаў ПІЛІПЧЫК.

Без слоў.





Мал. А. ГУРСКАГА.

АНОНС

Добры вечар, Святы вечар!

Гэтымі словамі са старадаўняй беларускай песні 8 студзеня а 18 гадзі. не ў Доме літаратара ў Менску пачнецца дабрачынная хрысціянская калядная вечарына, якую ладзіць Саюз пісьменнікаў разам са згуртаваннем беларусаў свету «Бацькаўшчына».

Да ўдзельнікаў вечарыны з віншаваннем і боскімі словамі звернуцца святары, прагучаць калядныя канты, а каля навагодняй ёлкі будуць валтузіцца з казою шчэдрыкі. Потым на сцэне вялікай глядзельнай залы мастацкі калектыў «Рунь» пакажа навагодняе прадстаўленне. Старажытныя песні ды скокі, слава Богу, яшчэ не адышлі ў нябыт. І ўсе гледачы стануць удзельнікамі свята.

Калі ласка, запрашаем не калядную вечарыну!

Запрашае Дом літаратара

5 студзеня а 15 гадзіне пачнецца дзіцячая хрысціянска-калядная вечарына «Нараджэнне Гасподне — карагод навагодні».

У нечым падобная вечарына чакае 8 студзеня і дарослых. Яна, як і ўсе асноўныя мерапрыемствы, пачнецца а 18 гадзіне.

На відэавечары 12 студзеня можна будзе паглядзець дакументальны фільм «Першыя заняткі» (вытворчасць РВТА «Белвідэацэнтр», аўтар сцэнарыя А. Ліс, рэжысёр Ю. Лысятаў) і мастацкі фільм «Асноўны інстынкт» (вытворчасць ЗША, 1992 г.).

«Недзе гараць агні...» — так называецца вечарына (пройдзе яна 14 студзеня), прысвечаная 60-годдзю пісьменніцы А. Кобец - Філімонавай.

15 студзеня ўрачыста адзначаецца 100-годдзе з дня нараджэння К. Буйло.

20 студзеня секцыя прозы праводзіць «Вечар кароткага апавядання». 21 студзеня — адзін вечар з Данчыкам «Песню родную люблю я». 22 студзеня — творчы вечар Н. Гальпяровіча.

Пісьменнік М. Чарняўскі ў 15 гадзін 27 студзеня сустракаецца ў ДЛ са школьнікамі.

На схіле месяца яшчэ два вечары: «Выбранецкая вечарына з танцамі» адбудзецца 28 студзеня, а радаводная літаратурна-музычная гасцёўня Згуртавання беларускай шляхты правядзе 29 студзеня вечарыну «Вінцэнт Дунін - Марцінкевіч, гербу «Лебедзь».

Секцыя перакладу збіраецца 21 студзеня, прозы — 22-га, ваенна-шэфская камісія — 25-га, а сумеснае пасяджэнне секцыі літаратуры для дзяцей і юнацтва і педагагічнай камісіі адбудзецца 28 студзеня. Усе гэтыя мерапрыемствы пачынаюцца а 15 гадзіне.

ЛіМ

Заснавальнікі:
САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
І МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах
Друкарня «Беларускі Дом друку».

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі:Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел літаратурнага жыцця Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры; Юрась СВІРКА — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жана ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел навін: Віталь ТАРАС — 33-19-65; Юрась ЗАЛОСКА — 33-22-04; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт Уладзімір ПАНАДА — 33-24-62; бухгалтэрыя — 26-86-40.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Нумар падпісаны ў друк 30.12.92 у 18.10.

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:

Святлана БЕРАСЦЕНЬ, Андрэй ГАНЧАРОЎ (нам. галоўнага рэдактара), Юрась ЗАЛОСКА, Міхась ЗАМСКІ, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Барыс ПЯТРОВІЧ (адказны сакратар), Юрась СВІРКА.

Індэкс 63856
Тыраж 15.000.

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12